

АСЦЯРОЖНА: КАМП'ЮТАРНЫЯ ЗЛАДЗЕІ 4

СПЕЦЫЯЛІСТ: ГІПЕРТАНІЯ «МАЛАДЗЕЕ» 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

26 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 118 (28985)

ЗВЯЗДА

БУДУЧЫНЯ — ЗА ВАМІ

Учора адбыўся Рэспубліканскі баль выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі

Фота БелТА.

Прэзідэнт уручае Падзяку выкладчыцы Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Алесі Корсак.

В А ўрачыстым мерапрыемстве прыняў удзел і Прэзідэнт нашай краіны. Пад дахам выставачнага цэнтра «БелЭкспа» ён звярнуўся з прамовай да 226 выпускнікоў, якія дабіліся прыкметных поспехаў у вучобе і грамадскім жыцці.

Мары трэба ўвасабляць у рэальнасць

«Сёння асаблівы, урачысты дзень — дзень, які для вас стане сапраўдным святам і пачаткам новага жыцця, дарослага жыцця», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар расказаў прысутным, што падчас штогадовых сустрэч з найлепшымі выпускнікамі ВНУ — сапраўды залатым фондам нашай моладзі — ён адчувае асаблівую радасць і гонар. «Таму што вы — наша будучыня. Я вельмі спадзяюся — лепшая наша будучыня», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што разам з імі вучыліся студэнты з іншых краін. Вышэйшую адукацыю ў нас атрымліваюць прадстаўнікі больш чым ста дзяржаў. Дарэчы, попыт каласальны: Беларусь нават не можа прыняць усіх ахвотных, бо іх няма дзе пасяліць, не хапае і вучэбна-лабараторных карпусоў. І на цяперашні святочны баль упершыню запрошаны самыя паспяховыя з гэтых хлопцаў і дзяўчат. Кіраўнік дзяржавы пажадаў, каб гэта стала новай добрай традыцыяй.

Беларускай моладзі Прэзідэнт пажадаў, каб, мадэлюючы сваю будучыню, яе прадстаўнікі разумелі: усё, што робіцца ў краіне, робіцца не для прыгожай карцінкі ў сацыяльных сетках. Хоць гэта і модна цяпер — жыць анлайн у інтэрнэце, — але мары трэба ўвасабляць у рэальным жыцці.

«Працаваць на канкрэтны, карысны людзям вынік. Тады з вашых асабістых поспехаў складзецца шчаслівая будучыня краіны — усёй нашай Беларусі. Зрабіце так, каб і праз шмат гадоў і вашым бацькам, і вашым будучым дзецям на зямлі было камфортна. Нам трэба ператварыць гэты кавалак зямлі, імя якому Беларусь, у самае зручнае і камфортнае месца для жыцця не толькі вас, але і вашых дзяцей, вашых унукаў», — прамовіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама заклікаў захаваць нашу ўтульную і камфартабельную для жыцця краіну, нашу цудоўную прыроду, бо яе немагчыма аднавіць або купіць.

Акрамя таго, беларускі лідар назваў гэты баль асаблівым, бо яго ўдзельнікі сустрэліся напярэдадні святой для нашага народа даты — 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Менавіта сёння, звяртаючыся да вас, моладзі, хочацца сказаць: не забывайце тых, хто сваім подзвігам заваяваў для нас права жыць на сваёй зямлі. І самае галоўнае — пад мірным небам. Гэта ім — якія пайшлі ад нас — мы павінны быць удзячныя за сучаснае», — падкрэсліў ён.

Ніколі нельга спыняцца

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў гэты дзень выпускнікі выйшлі на самастойную дарогу. І сімвалічна, што гэты старт прыйшоўся на час галоўнай спартыўнай падзеі гэтага лета — II Еўрапейскіх гульняў у Мінску. На думку кіраўніка дзяржавы, гэта добры знак.

«Бярыце прыклад, але толькі з нашых найлепшых спартсменаў, а іх нямала, яркія перамогі якіх, заваяваныя медалі не толькі дораць нам, заўзятарам, моцныя эмоцыі, але і ўмацоўваюць імідж нашай роднай краіны, — адзначыў ён. — Будзьце і вы пакаленнем заваёўнікаў самых складаных вяршынь».

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што далейшыя дасягненні выпускнікоў стануць найлепшым выказваннем падзякі бацькам і настаўнікам, чые дапамога і падтрымка за гады вучобы былі бясцэнныя. Яшчэ кіраўнік дзяржавы па-сяброўску параіў прысутным выпускнікам не задзіраць нос, бо цяпер усё, што ў іх ёсць — гэта заслуга бацькоў і настаўнікаў.

Ён выказаў шчырую ўдзячнасць за майстэрства і прафесіяналізм педагогам, якія дапамаглі дамагчыся сур'ёзных вынікаў, а таксама заклікаў не спыняцца на дасягнутым.

«Энергія і талент маладосці маюць дзіўную сілу, і Беларусь — краіна вялікіх магчымасцяў. Усё атрымаецца, і мы яшчэ не раз з гонарам пачуем вашы імёны. Я жадаю вам удачы. У добры, паспяховы шлях!» — сказаў Прэзідэнт.

Пасля гэтага беларускі кіраўнік традыцыйна ўручыў узнагароды найлепшым выпускнікам і выкладчыкам.

Дарэчы, на ўзроўні вышэйшай адукацыі ў 2019 годзе будзе выпушчана 56 тысяч спецыялістаў (у 2018 годзе было 64,9 тысячы).

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.

Пераможны старт

Веласіпедныя спаборніцтвы Еўрапейскіх гульняў праходзяць літаральна ў цэнтры беларускай сталіцы, і назіраць за імі могуць фактычна ўсе ахвотныя. Вось і наш фотакарэспандэнт Анатоль КЛЯШЧУК, апынуўшыся каля месца старту ўдзельнікаў велагонкі, зрабіў цікавы кадр, на якім беларускі спартсмен пачынае сваю дыстанцыю. Фатограф тады і не здагадваўся, што здымае без 33 хвілін і 3,34 секунды чэмпіёна Еўрапейскіх гульняў — менавіта столькі Васілю Кірыенку спатрэбілася, каб прамчаць па дыстанцыі даўжынёй амаль 29 кіламетраў і выйграць індывідуальную шасэйную гонку з асобным стартам.

(Не)тыповыя беларусы

Матэматык — пра тое, у якіх выпадках трэба адкінуць логіку

Гісторыя поспеху і крыху разважанняў пра дапамогу і жыццёвыя ўрокі

Ігар ЖАБАРОЎСКІ працаваў настаўнікам матэматыкі ў адной са сталічных школ. Аднойчы мама шасцікласніка паскардзілася, што яе дзіця не зразумела тэму і што яна сама адкрыла падручнік і таксама нічога не зразумела. Выхад з сітуацыі, знойдзены Ігарам, спадабаўся не толькі гэтай маме, але і іншым бацькам, яго вучням і калегам з іншых школ. Прычым спадабаўся настолькі, што яго ідэя дала старт адукацыйнаму праекту, які пасля распаўсюдзіўся на ўсю рускамоўную прастору і стаў прыносіць добры прыбытак яго стваральніку.

Цяпер Ігар не толькі паспяховы бізнесмен, але і адзін з самых яркіх і публічных беларускіх мецэнатаў. Ён ужо ахвяраваў больш за 60 тысяч долараў на падтрымку дзяцей-сірот, а сёлета на 13-м сезоне Social Weekend падтрымаў на 10 тысяч рублёў праект, прысвечаны рэабілітацыі дзяцей з ДЦП. І гэта далёка не ўсе яго дабрачынныя ініцыятывы.

— Давайце не будзем інтрыгаваць чытачоў — раскажыце, як вы дапамаглі той маме?

— Я зрабіў відэаўрок з тлумачэннем тэмы, выклаў у сацсетках і сказаў ёй і іншым бацькам, што яны могуць скарыстацца ім. Усім спадабалася, і я стаў перыядычна ствараць такія відэаўрокі і выкладваць іх для агульнага карыстання. Але больш за ўсё маёй работай зацікавіліся іншыя настаўнікі. Відэаўрокі дапамагалі ім працаваць: дзякуючы ім дзеці лепш разумелі тэму, і тлумачэнне новага матэрыялу стала займаць менш часу.

Калі пайшлі водгукі ад бацькоў і калег, у мяне ўзнікла ідэя паспрабаваць распаўсюдзіць гэта на вялікую аўдыторыю.

СТАР. 2

КАЛІ ВАДА — БЯДА

Як без рызыкі адпачыць у спёку?

Вадасховішча Дразды даўно стала ўлюбёным месцам адпачынку тысяч людзей. Блізкасць да гарадскіх магістраляў, вялікія жылыя раёны на адлегласці пары-тройкі кіламетраў і звілістая берагавая лінія — што яшчэ трэба для масавага паломніцтва ў спякоту, якая вось ужо амаль месяц не адпускае Мінск? Але, на жаль, дзе адпачывальнікі — там і парушэнні.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Пад нашым кантролем знаходзіцца шэсць пляжаў, — кажа **начальнік выратавальнай станцыі «Дразды» Андрэй МАРОЗ.** — На кожным з іх у спякотныя дні адпачывае па тысячы чалавек адначасова, а то і болей. Лічыце, агулам атрымліваецца насельніцтва невялікага райцэнтра. На выхадных тут чаго толькі няма — масавае распіццё напояў з градусамі, заплыў за пераадольныя буйкі, карыстанне надзіманымі матрацамі... З апошнімі часамі даходзіць да анекдота. Мы не аднойчы «здымалі» з сярэдзіны акваторыі аднаго і таго ж парушальніка. Ён клаўся на матрац і проста аддаваўся на волю цячэння. Колькі мы ні гаварылі, што матрац не плавальны сродак, што ён можа лёгка перакуліцца, а чалавек пойдзе пад ваду, — да яго не даходзіла.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША ўвялі новыя жорсткія санкцыі супраць Ірана



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў аб увядзенні новых жорсткіх санкцый у дачыненні да Ірана, у тым ліку супраць асабістай канцылярыі духоўнага лідара краіны аяталы Алі Хаменеі. Як адзначыў прэзідэнт, дадатковыя санкцыі, у выніку якіх будуць замарожаны замежныя іранскія актывы на мільярды долараў, стануць амерыканскім адказам на знішчэнне Іранам амерыканскага беспілотніка і іншыя варожыя акцыі. Аднак, па словах Трампа, санкцыі былі б уведзены ў любым выпадку, нават калі б інцыдэнту з беспілотнікам не здарылася. Як заўважыў амерыканскі лідар, ціск на Іран будзе ўзрастаць з мэтай перашкодзіць яму здабыць ядзерную зброю. Тым часам Францыя, Вялікабрытанія і Германія накіравалі афіцыйнае дыпламатычнае папярэджанне пра цяжкія наступствы для Тэгерана невыканання ім пагаднення 2015 года аб іранскай ядзернай праграме. Тыдзень таму Іран абвясціў, што 27 чэрвеня перавысіць ліміты на колькасць узбагачанага ўрану, якую яму дазволена захоўваць.

За пасаду прэзідэнта Аргенціны пазмагаюцца дзевяць кандыдатаў

На пасаду прэзідэнта Аргенціны ў кастрычніку 2019 года будуць прэтэндаваць дзевяць кандыдатаў, аднак жыхары краіны мяркуюць, што галоўнае саперніцтва разгорнецца паміж дзеючым кіраўніком дзяржавы Маурысіа Макра і экс-кіраўніком кабінета міністраў Альберта Фернандэсам, які ідзе на выбары ў звязцы з былым прэзідэнтам краіны Крысцінай Кіршнер. Днямі завяршыўся тэрмін вылучэння кандыдатур на пасаду прэзідэнта краіны. Паводле звестак выдання Clarin, акрамя Макра і Фернандэса, якія ўжо даўно заявілі пра свае намеры, у выбарах прымуць удзел экс-міністр эканомікі Раберта Лавану, які часта крытыкуе дзеючую ўладу ў краіне, і Нікалас Дэль Каньа, малады аргентынскі палітык, які вылучаў сваю кандыдатуру на мінулых выбарах. За пасаду пазмагаюцца таксама Мануэла Кастаньера, адзіная жанчына-кандыдат, вядомы ў краіне эканаміст Хасэ Луіс Эсперт, былы віцэ-прэзідэнт найбуйнейшага дзяржбанка Banco Nacion Гомес Сентурыён, палітык Алехандра Б'яндзіні, экс-губернатар і сенатар Хасэ Рамэра Ферыс. 11 жніўня ў Аргенціне пройдуць праймерыз (унутрыпартыйныя выбары).

У Германіі сутыкнуліся два знішчальнікі бундэсвера

У Германіі пацярпелі крушэнне два знішчальнікі Eurofighter, якія сутыкнуліся ў паветры падчас вучэнняў. Абодва пілоты катапультаваліся, але, па звестках мясцовых СМІ, толькі адзін з іх застаўся жывы. Выратавальная каманда знайшла яго на дрэве і дапамагла спусціцца на зямлю. На месцы падзення самалётаў пачаўся пажар, які ўдалося патушыць толькі праз дзве гадзіны. Абломкі самалётаў былі раскіданы на шырокай тэрыторыі, але жылыя дамы ад іх падзення не пацярпелі.

КАРАТКА

- Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Прэзідэнты коратка абмеркавалі двухбаковы парадак дня. Аляксандр Лукашэнка запрасіў свайго калегу прыняць удзел у цырымоніі закрыцця II Еўрапейскіх гульняў. Уладзімір Пуцін запрашэнне прыняў.

- **Шэсць чалавек выдалілі з ЦТ па фізіцы. Пяцярых — за выкарыстанне мабільных тэлефонаў, яшчэ аднаго — за шпаргалку.**

- Жыхары вёскі Пелішча Камянецкага раёна перадалі ў Белавежскую пушчу нованароджанае дзіцяня казулі. Знясіленую малечу знайшлі ў высокай траве.



Я зноў выбіраю «Звязду»

ГАЗЕТА НАТХНІЛА АДКРЫЦЬ АГРАСЯДЗІБУ

Галіна ЕРМАКОВА, педагог Ржаўскага ВПК «Дзіцячы сад — базавая школа», падпісчыца «Звязды» з 30-гадовым стажам:

— Мне падабаецца, што газета на беларускай мове, што ў ёй вельмі цікавае і змястоўнае напаўненне. Калі не было інтэрнэту, нават рабіла выразкі. Дагэтуль захоўваю сшытак з парадамі той жа «Крынічкі». Яны мне дапамагаюць змагацца з агароднымі шкоднікамі. У свой час рабіла даследчую работу «Абрады, звычаі і адзенне жыхароў вёскі Ржаўка», абапіраючыся на матэрыялы з газеты. Параўноўвала побыт беларусаў, пра якіх расказвалі Янка Крук і Аксана Катовіч, і жыхароў асобна ўзятай вёскі Ржаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Былі, дарэчы, прынцыповыя адрозненні.

З задавальненнем чытаю рубрыкі «Надзённае», «Алё, народ на провадзе» і іншыя. Адна з любімых укладак — «Мясцовае самакіраванне», дзе прыводзяцца прыклады актыўнай дзейнасці жыхароў глыбінкі. Сама ўдзельнічаю ў міжнародных праектах. Аднойчы мы з мужам рызыкнулі падзяліцца планамі аб сваёй мары, адправілі заяўку на конкурс ініцыятыў праекта «Ад вытокаў да развіцця» і атрымалі грант. Гэта быў стартавы капітал, які дапамог адкрыць аграэкасядзібу «Пчалінае царства». Пакуль яна экскурсійнага тыпу, але цікавасць да нас прымушае развівацца і рабіць нешта новае. Летась мы зрабілі беларускую хатку з печчу і іншымі атрыбутамі сялянскага жыцця. А зараз працуем над так званым спальным корпусам, каб госці мелі магчымасць у нас пажыць. Будзем частаваць іх беларускімі стравамі з печы і бліжэй знаёміць з побытам нашых дзядоў і прадзедаў. Каб любіць сваю радзіму, трэба ведаць свае карані. Мы гатовы расказаць і паказаць, як жылі, аб чым марылі, як бавілі час нашы продкі. А заадно пакажам, якія ў нас прыгожыя, багатыя мясціны. Магчыма, хтосьці возьме прыклад з нас і звяжа свой лёс з вёскай. Менавіта тут сапраўднае жыццё.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 19118 >

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У Савеце Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудуцца:

27 чэрвеня 2019 г. у 14.00 — пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання;

28 чэрвеня ў 15.00 — заключнае пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь шостага склікання.

БУДУЧЫНЯ — ЗА ВАМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі дзяржаўнай формы ўласнасці ў 2019 годзе будзе падрыхтавана 51,7 тысячы спецыялістаў (у 2018 годзе — 60,1). З іх навучаліся на дзённай форме атрымання адукацыі 30,1 тысячы чалавек (у 2018 годзе — 31,1), на вячэрняй і завочнай — 21,6 тысячы чалавек (у 2018 годзе — 29).

Выпуск спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, якія навучаліся за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, складзе ў 2019 годзе 24,2 тысячы чалавек (у 2018 годзе — 26,2). З іх навучаліся на дзённай форме 19,5 тысячы чалавек (у 2018 годзе — 19,5), на вячэрняй і завочнай — 4,7 тысячы чалавек (у 2018 годзе — 6,7).

А што кажуць выпускнікі?

Выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гражына Жолік стала акушэрам-гінеколагам, працаваць будзе ў сталічнай 6-й бальніцы. Чаму ж яна вырашыла стаць урачом? «Сэрца палюбіла гэтую спецыяльнасць, у іншай справе я сябе не бачу. Хачу дапамагаць адчуваць радасць мацярынства. Невымоўныя адчуванні былі пасля прысутнасці на родах. Так што сэрцу не загадаеш, як кажуць», — сказала дзяўчына.

Узровень беларускай адукацыі і выкладчыкаў яна ацаніла высока і адзначыла, што ён адпавядае міжнароднаму.

Гражына расказала, што атрымала запрашэнне на баль, таму што актыўна займаецца навуковай дзейнасцю, выступае на канферэнцыях, удзельнічае ў конкурсах і займае прызавыя месцы. Вядома, адыграў ролю фактар высокай паспяховасці.

«Вельмі хвалююся, — так выпускніца адказала на пытанне, як яна перажывае ўступленне ў новы этап свайго жыцця. — Нават месцамі страшна, але ўсе праз гэта праходзяць. Думаю, у мяне ўсё атрымаецца. З падтрымкай бацькоў, блізкіх і сяброў усё магчыма пераадолець».

Выпускнік Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Яўген Барысюк расказаў журналістам, што яму вучыцца было цікава (хоць спецыяльнасць няпростая — аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі).

Хлопец мэтанакіравана пайшоў у гэтую сферу, бо ведаў, што ў будучыні хоча працаваць па спецыяльнасці. Ва ўніверсітэце Яўгену прапанавалі вучыцца ў складзе групы для замежных студэнтаў, таму навучанне было на англійскай мове.

Зараз хлопец працуе ў прыватнай ІТ-кампаніі, офіс якой размешчаны ў Брэсце. Фірма займаецца распрацоўкай сістэмы для продажу авіязапчастак — па словах выпускніка, аналагаў ёй няма.

Яўген адзначыў дастойны ўзровень нашай адукацыі, аднак звярнуў увагу, што ўсё ў першую чаргу залежыць ад самога чалавека. «Калі чалавек не будзе вучыцца — адпаведна, ён нічога не дасягне», — мяркуе выпускнік.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Праблемы і рашэнні

Каб развівацца, трэба паскарацца

Прэзідэнт Беларусі даў даручэнне на працягу двух гадоў забяспечыць паскоранае комплекснае сацыяльна-эканамічнае развіццё адзінаццаці буйных гарадоў Беларусі, дзе пражывае больш за восемдзесят тысяч чалавек. У Мінскай вобласці такіх тры: Салігорск, Барысаў і Маладзечна. Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася, якія перамены чакаюць гэтыя райцэнтры, што будзе зроблена для больш камфортнага пражывання і працы людзей, росту іх дабрабыту.

— Салігорск — асаблівы рэгіён, гэта монагарад, дзе валаўтваральным прадпрыемствам з'яўляецца «Беларуськалій». Менавіта на яго прыходзіцца 86 працэнтаў прамысловай вытворчасці ў рэгіёне і 30 працэнтаў у Мінскай вобласці, — расказала **начальнік Камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Таццяна БРАНЦЭВІЧ.** — «Беларуськалій» — гэта адзін бок развіцця рэгіёна, але ж ёсць і іншы: прыватны бізнес і спадарожныя прадпрыемствы, якія ажыццяўляюць распрацоўку і выпуск тэхналагічнага абсталявання для калійнага гіганта. Гэта вельмі высокаэфектыўныя і высокаарганізаваныя прадпрыемствы, якія з'яўляюцца сусветнымі брэндамі. Заклапочаны мы на сённяшні дзень развіццём прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці — «Купалінкі», «Калінкі».

Па папярэдніх падліках, намінальна налічаная сяроднямесячная зарплата ў 2020 годзе ў Салігорскім раёне складзе 1,6 тысячы рублёў і павялічыцца ад узроўню 2018-га на 10,8 працэнта. У той жа час чакаецца скарачэнне колькасці занятых у эканоміцы. Салігорскі раён належыць да раёнаў з напружанай сітуацыяй на рынку працы. Чакаецца таксама спад вытворчасці ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Беларуськалій». Прычына — неспрыяльная сітуацыя на знешніх рынках.

Менавіта комплексны план паскоранага развіцця рэгіёна значна палепшыць сітуацыю. Ён ахоплівае ўсе сферы дзейнасці і жыццезабеспячэння людзей, добраўпарадкаванне, медыцыну, культуру і ўтрымлівае 190 мерапрыемстваў па 16 кірунках. На іх рэалізацыю плануецца выдаткаваць больш за 500 мільёнаў рублёў. Для павышэння канкурэнтаздольнасці рэальнага сектара эканомікі, выхаду на больш высокі інвестыцыйны ўзровень вытворчасці арганізацыямі прамысловага комплексу запланавана 26 мерапрыемстваў. Яны накіраваны на тэхнічнае пераазнашчэнне вытворчасці, удасканаленне тэхналагічных працэсаў. Акрамя таго, плануецца надаць асаблівую ўвагу геаграфічнай і таварнай дыверсіфікацыі экспарту. Эканоміка раёна будзе будавацца на аснове росту буйных прадпрыемстваў і вытворчасцяў, малога і сяродняга бізнесу, пашырэнні паслуг для насельніцтва. Важным застаецца і фарміраванне новых пунктаў росту, стварэнне суб'ектамі прадпрымальніцтва і індывідуальнымі прадпрымальнікамі малых імпартазамяшчальных вытворчасцяў. У раёне для гэтага ёсць усе магчымасці: налічваецца каля 58 інвестыцыйных аб'ектаў, 30 запланавана для рэалізацыі ў 2019 годзе, 12 ужо дзейнічаюць.

Сёлета ў Салігорску адбыўся форум дзелавога супрацоўніцтва з удзелам кіраўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у Беларусі, гандлёвых прадстаўнікоў 12 краін свету. Патэнцыйныя інвестары могуць азнаёміцца з эканамічнымі, сацыяльнымі магчымасцямі Салігоршчыны на сайце райвыканкама, дзе працуе інвестыцыйны атлас. На партале «Дарожная карта інвестара» Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі прадстаўлены 16 інвестыцыйных прапаноў і 12 ідэй. Раён заявіў пра сябе, сваю ўнікальнасць і прыцягальнасць, гатоўнасць супрацоўнічаць з кожным партнёрам.

— Адрозненне Барысаўскага раёна ад Салігорскага ў тым, што ён самы буйны і складаны ў вобласці. І тут, натуральна, больш праблем, чым у горадзе гарнякоў. Неабходна больш фінансавых укладанняў, каб давесці горад і раён да таго ўзроўню, якога патрабуе кіраўнік дзяржавы, — падкрэсліў **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Ігар МАКАР.** — І тыя праблемы, што трэба вырашаць, сёння на кантролі ў Мінаблвыканкаме, і ўсё ідзе ў планавым парадку.

Сёння горад уяўляе сабой адну суцэльную будаўнічую пляцоўку.

Як адзначыў **старшыня Барысаўскага райвыканкама Генадзь ДЗЕНГАЛЁЎ,** даручэнні, якія даў кіраўніцтву горада Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выконваюцца. А менавіта, работы па будаўніцтве маставога пераходу цераз раку Беразіну з рэканструкцыяй часткі вуліцы Гагарына ідуць з апераджэннем графіка. Аб'ём будаўніча-мантажных работ склаў каля 24 мільёнаў рублёў пры плане 18 мільёнаў. Аб'ект гатовы амаль на 65 працэнтаў. Актыўна вядзецца праектаванне пуцепровада цераз чыгунку. У 6-м мікрараёне будуецца школа. На 2019 год выдаткавана з абласнога бюджэту 12,5 мільёна рублёў, для таго каб завяршыць будаўніцтва, патрабуецца дадаткова яшчэ 5,6 мільёна рублёў. На сённяшні дзень будынак гатовы больш чым на 40 працэнтаў. З'явіцца ў Барысаве і «Лядовая арэна»: у кастрычніку плануецца атрымаць экспертызу і правесці тэндар па выбары падрадных арганізацый для будаўніцтва спартыўнага аб'екта. Акрамя асноўных работ, у горадзе ідзе маштабнае добраўпарадкаванне, у тым ліку асфальтаванне дваровых тэрыторый, афарбоўка фасадаў дамоў, азеляненне. Чакаецца, што выкананне намечанага сфарміруе больш камфортнае асяроддзе для жыхароў, паспрыяе росту іх даходаў і дабрабыту. Вядома ж, усё залежыць ад таго, як пойдуць справы ў эканоміцы. Асабістыя даходы раённага бюджэту ў 2020 годзе павялічацца ў параўнанні з 2018-м на 7,4 працэнта.

— Эканоміка Барысаўскага раёна фарміруе 7 % выручкі ад рэалізацыі прадуктаў Мінскай вобласці, каля 12 % ад прамысловай прадукцыі, каля 6 % мантажна-будаўнічых работ, больш за 6 % інвестыцый, 11 % рознічнага тавараабароту, — падкрэсліў Ігар Макар. — Таму ад таго, як будзе развівацца раён, залежыць і развіццё эканомікі Мінскай вобласці ў цэлым.

Што датычыцца Маладзечанскага раёна, то першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама лічыць, што тут створана база для таго, каб рухацца наперад: кваліфікаваныя кадры, належная інфраструктура, лагістыка. Але не абыходзіцца без праблем, асабліва ў жывёлагадоўлі. Для таго каб раён дынамічна развіваўся, рухаўся наперад, неабходна ўзводзіць новыя будынкі, комплексы, нарыхтоўваць якасныя кармы, думаць наконт размяшчэння маладняку. У найбліжэйшай перспектыве неабходна вырашыць і пытанне па будаўніцтве жылля для шматдзетных сем'яў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Справы правасуддзя

«Злачыннасць стала нецвярозай і рэцыдыўнай»

Напярэдадні прафесійнага свята (яго адзначаюць сёння) намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК даў прэс-канферэнцыю.

За пяць месяцаў сёлета зарэгістравана на 8,8 % больш злачынстваў, чым за аналагічны перыяд 2018-га. Гэта адбылося з прычыны выяўлення менш цяжкіх правапарушэнняў і тых, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі. Знізілася колькасць злачынстваў, звязаных з гвалтам, а таксама ўчыненых групай асоб. Расце лічба правапарушэнняў, здзейсненых нецвярозымі асобамі і грамадзянамі, якія маюць судзімасць.

Падчас прэс-канферэнцыі журналісты пацікавіліся справай Канстанціна Бурыкіна, якога празвалі «бацюшка са свастыкай». Аляксей Стук пацвердзіў інфармацыю, што ў адносінах да Бурыкіна заведзена справа аб гвалтоўных дзеяннях сексуальнага характару ў дачыненні да заведама малалетняй. Пацярпелай з'яўляецца яго дачка.

«6 чэрвеня ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле 167, частцы 3. Яна была малалетняй. Падзеі адбываліся з 2012 па 2016 год, а дачка 1999 года нараджэння», — сказаў намеснік генпракурора.

Дзяўчына дае паказанні. Па словах супрацоўніка пракуратуры, «яна баялася, ён [Канстанцін Бурыкін — **«Зв.»**] дастаткова дэспатычны чалавек».

Пракуратура правяла разбор дзеянняў міліцыі падчас майскіх затрыманняў цыган у Магілёве.

«Пракуратура зрабіла высновы. Канешне, рабочая група, можна сказаць, па гарачых слядах разбіралася. Павінен адразу сказаць, што ў супрацоўнікаў міліцыі былі поўныя падставы такім чынам масава правяраць і, як у аператыўнай рабоце кажуць, «адпрацоўваць» цыганскія дыяспары, — паведаміў Аляксей Стук. — Утвораная распараджэннем генеральнага пракурора брыгада, у якую ўваходзілі адказныя супрацоўнікі генеральнай пракуратуры і пракуратуры вобласці, правяла адпаведную праверку ў адносінах да якіх-небудзь незаконных дзеянняў і перавышэння межаў улады і іншага. У адносінах да супрацоўнікаў міліцыі гэтага не ўстаноўлена. Устаноўлены пэўныя парушэнні працэсуальна-выканаўчага заканадаўства пры складанні адміністрацыйных пратаколаў».

Пры гэтым ніводнай заявы ад асоб цыганскай нацыянальнасці не паступіла.

Генеральная пракуратура выступіла адным з аўтараў законапраекта па змяненнях і дапаўненнях Закона «Аб барацьбе з карупцыяй». Цяпер ён прадстаўлены кіраўніку дзяржавы. Па словах Аляксея Стука, дакумент, магчыма, будзе разгледжаны дэпутатамі ў асеннюю сесію.

Пракаментаваў Аляксей Стук і чарговую «справу медыкаў». «Цяпер накіравана справа ў суд, самая буйная па колькасці разгляду. Там усяго 21 чалавек, з іх толькі 8 — прадстаўнікі сістэмы аховы здароўя, — канстатаваў ён. — 13 чалавек праходзяць па 243 {артыкуле КК. — **«Зв.»**} і 431 {артыкуле КК. — **«Зв.»**}».

Па прапанове генпракуратуры ў Крымінальны кодэкс унесены дапаўненні: сталі больш жорсткімі ўмовы, пры якіх могуць быць пазбаўлены крымінальнай адказнасці хабарадаўцы і пасрэднікі, пашыраны спектр суб'ектаў карупцыйных правапарушэнняў. Ужо 19 ліпеня яны ўступяць у сілу.

«У 2018 годзе выяўлены маштабныя крымінальныя схемы ў сістэме транспарту, ахове здароўя, гандлі, прадастаўленні паслуг, прамысловасці, будаўніцтве. У асноўным кіраўнікі рознага ўзроўню атрымлівалі так званыя «адкаты» і здзяйснялі дзеянні ў інтарэсах прадстаўнікоў камерцыйных структур»,— расказаў намеснік генпракурора.

А ўжо за пяць месяцаў 2019-га колькасць карупцыйных злачынстваў скарацілася на 23 працэнты (у параўнанні з лічбамі на май 2018 года). Менш сталі атрымліваць хабараў (колькасць іх знізілася з 516 да 373 выпадкаў) і даваць іх (з 180 да 83).

Марыя ДАДАЛКА.

Матэматык — пра тое, у якіх выпадках трэба адкінуць логіку

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так нарадзіўся адукацыйны праект «Інфаўрок». Я сам зрабіў сайт, што называецца, «на каленцы», і пачаў выкладваць свае відэаўрокі там. Праз паўгода наведвальнасць сайта пачала даходзіць да васьмі тысяч чалавек у суткі, і я вырашыў запісаць гэтыя ўрокі на дыск і паспрабаваць прадаваць іх. Так з гэтага стаў атрымлівацца бізнес.



Першыя крокі я зрабіў у студзені 2011 года. А ўжо летам сышоў са школы і пачаў займацца толькі гэтым праектам. За наступныя тры гады выраслa вялікая кампанія. Мы наладзілі вытворчасць відэаўрокаў па ўсіх тэмах школьнай праграмы, па ўсіх прадметах і класах — і рэалізавалі больш за 100 тысяч дыскаў па ўсім СНД.

— Хто іх купляў?

— У асноўным настаўнікі, каб выкарыстоўваць на ўроках. Дыскі дапамагалі ім рыхтавацца да заняткаў, здымалі частку нагрузкі.

Сёння праект «Інфаўрок» — гэта больш за 1,5 мільёна ўнікальных наведванняў на суткі. І гэта ўжо не толькі і не столькі відэаўрокі, якія, дарэчы, усе — а гэта больш за тры з паловай тысячы — цяпер выкладзены ў бясплатны доступ на сайце і на «Ютубе». У нас з'явіліся і іншыя бясплатныя прадукты і паслугі, у першую чаргу ў дапамогу настаўніку. А сярод платных — дадатковая прафесійная адукацыя для дарослых. Асноўныя нашы карыстальнікі — зноў жа, настаўнікі. Дапусцім, хтосьці выкладае матэматыку і вырашыў, што добра было б яшчэ выкладаць і фізіку. Але ён не мае права гэтага рабіць, калі ў дыпломе запісаны толькі як настаўнік матэматыкі. Яму трэба прайсці перападрыхтоўку. Гэта мы і забяспечваем.

— А з боку сістэмы адукацыі цікавасць да вас была? Ці ўсё гэта настаўнікі купляюць за свае грошы?

— Мне неяк спакайней, калі мы працуем наўпрост са сваімі канчатковымі спажыўцамі і штодня атрымліваем зваротную сувязь — гэта дазваляе дынамічна змяняцца, своечасова перабудоўвацца. І зусім іншая гісторыя, калі пачынаеш залежаць ад мноства дадатковых фактараў і не заўсёды маеш магчымасць развівацца менавіта так, як хочаш.

Я бачу адзіны крытэрый сваёй паспяховасці — патрэбна тое, што я раблю, канчатковаму карыстальніку ці не. Як толькі не патрэбна, я згортваю гэты кірунак. Я не магу сабе дазволіць рабіць тое, што нікому не трэба, таму што я трачу на гэта свае рэсурсы без якіх-небудзь знешніх крыніц.

— А калі вы ўпершыню зразумелі, што робіце нешта патрэбнае людзям? І што адчулі тады?

— Памятаю, як я запусціў у продаж самы першы дыск і паступіла каля 40 заказаў на працягу пары тыдняў. Гэта выклікала столькі эмоцый! Не, нават яшчэ раней, калі я толькі зрабіў свой сайт. Спачатку там быў толькі адзін наведвальнік — я сам. І я памятаю, як аднойчы яго наведалі чатыры чалавекі — гэта было класнае адчуванне: «Ух ты! Хтосьці яшчэ гэтым зацікавіўся!» Увечары я патэлефанаваў маме і падзяліўся сваёй радасцю: «Мама, у мяне чатыры наведвальнікі!» Потым было сто наведвальнікаў, тысяча, дайшло да мільёнаў, але такіх пачуццяў ужо не было, я проста канстатаваў факты.

І самыя першыя кліенты таксама дарылі самыя яркія эмоцыі. Я з задавальненнем з імі размаўляў, вёў доўгія перапіскі. Сёння да нас кожны дзень прыходзяць сотні лістоў. Людзі нешта пытаюцца, дзеляцца сваімі ідэямі. Ім цяпер адказвае служба падтрымкі. Я ўжо восем гадоў гэтым займаюся, і, вядома, такіх яркіх эмоцый ужо няма.

— Раскажыце пра сваё рашэнне ўдзельнічаць у дабрачынных праектах.

— На самай справе многія бізнесмены і наогул людзі, у якіх шмат грошай, займаюцца дабрачыннасцю. Проста не ўсе пра гэта ведаюць. Што датычыцца мяне, то не было такога моманту, што вось я зразумеў, што зарабіў шмат грошай і цяпер трэба падзяліцца. Проста калі я зарабляў, умоўна кажучы, сто долараў, то меў магчымасць камусьці дапамагчы на дваццаць долараў. А калі зарабляў, дапусцім, тысячу, то мог дапамагчы на сто або дзвесце, па-рознаму...

Я рэдка калі сам шукаю: а каму б мне сёння дапамагчы? У мяне такая філасофія: калі жыццё звяло мяне з нейкім выпадкам, дзе, тэарэтычна кажучы, я магу дапамагчы, то я лічу, што гэта невыпадкова. Магчыма, ёсць шмат сітуацый, у якіх мая дапамога была б больш эфектыўная, але чамусьці Бог мяне прывёў вось да гэтай канкрэтнай сітуацыі. Напэўна, таму, што не ўсё тое, што мы лічым эфектыўным, такім з'яўляецца...

— Вы верыце ў Бога?

— Так. Але я не вяду простакі ўзорнае, правільнае жыццё. Мы з сям'ёй перыядычна ездзім у царкву, возім дзяцей на прычасць, часцей за ўсё з ініцыятывы жонкі, але тым не менш... І разам з тым — ні з кім цяпер не хачу спрачацца, але асабіста для сябе я падзяляю законы царквы і законы Божыя. Для мяне больш важнымі з'яўляюцца не нейкія фармальныя прыкметы, а што ў чалавека ўнутры. І маё асабістае меркаванне: калі б кожны чалавек трымаў Бога ў сябе ўнутры, наша жыццё было б іншае. Таму што можна ўсміхацца, але калі ўсмешкі няма ўнутры...

Але я нічога і нікога зараз не крытыкую. Я думаю, што, можа, каб кагосьці прывесці да Бога, нічога і рабіць не трэба, ён сам прыйдзе і здолее адрозніць, дзе дабро, а дзе зло. А хтосьці павінен для гэтага кожную нядзелю хадзіць у царкву і выконваць усе фармальнасці, і толькі пасля вялікай колькасці такіх дзеянняў яму штосьці адкрыецца...

А самае галоўнае, на мой погляд: усё роўна, якой веры прытрымліваецца чалавек, важна, каб вынікам яго веры была большая колькасць дабра. Гэта адзіны крытэрый: калі ад чалавека зыходзіць больш дабра, чым зла, і вера гэтаму спрыяе, значыць, усё правільна.

— Жонка падтрымлівае вас у вашых пачынаннях, у тым жа мецэнацтве?

— Самае галоўнае, што яна не перашкаджае развівацца мне як асобе. На ёй ляжыць каласальны клопат пра сям'ю. Я таксама стараюся ўдзельнічаць у выхаванні дзяцей (старэйшаму сыну Ігара цяпер пяць гадоў, дзвюм дзяўчаткам-двайняткам па тры, малодшаму — годзік. — **Аўт.**), але вельмі важна, што, знаходзячыся на працы, я магу быць спакойны за сям'ю і ведаць, што там усё добра. Жонка ў мяне малайчына.

Я не магу сказаць, што на ўсе мае справы яна глядзіць так жа, як я, але важна, што ні я, ні яна не вырашаем нічога аднаасобна. Калі я лічу, што вось так — правільна, то па максімуме спрабую пераканаць яе, а калі гэтага не атрымаецца, тады шукаем нейкі кампраміс-ны варыянт. Гэта адзіны, як мне здаецца, правільны шлях.

— Можаце падзяліцца нейкім сваім жыццёвым урокам?

— Вось адна, можа, не з самых важных, але апошніх высноў, да якіх я прыйшоў: не трэба марнаваць час на тое, што табе не падабаецца. На людзей, з якімі некамфортна, на занятак, які не па душы... Мне здаецца, нам зверху ва ўсіх справах і сферах жыцця прыходзяць падказкі. І калі вось неяк некамфортна, значыць, гэта няправільны шлях.

Трэба прыслухоўвацца да сябе, і не толькі ў адносінах з людзьмі, але і наогул, у прынцыпе. Напрыклад, запланаваў нейкую справу і адчуваеш, што нешта не тое, ці пастаянна сутыкаешся з нейкімі перашкодамі... Трэба ўмець своечасова «счытваць» гэтыя падказкі і не баяцца нешта змяніць.

Я маю ў сваім вопыце велізарную колькасць выпадкаў, калі, насуперак унутранаму адчуванню, працаваў з нейкім чалавекам ці супрацоўнічаў з кампаніяй, і ўсё гэта заканчвалася адным і тым жа — няўдачай. Таму ўсё больш прыходжу да высновы, што калі наканавана быць добраму выніку, то шлях да яго павінен быць у радасць. Ён можа быць цяжкім, можна з ног валіцца ад стомы, але павінна быць цікава і пры гэтым добра тваёй душы. Ні ў якім разе не трэба рабіць штосьці праз сілу! І лепш своечасова павярнуцца і пайсці ў іншы бок, калі што, нават калі лагічна гэта здаецца няправільным. Хоць я матэматык і логіка для мяне — гэта святое, але ўсё ж яна можа нас часам адвесці не туды. І калі яна ўступае ў супярэчнасць з адчуваннямі, лепш прыслухацца да сваіх унутраных адчуванняў, да сэрца.

Гутарыла Святлана БУСЬКО.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению КЖРЭУП «Сельмашевское» (продавец) извещает о проведении 29 июля 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС, бел. руб.
ПРИМЕЧАНИЕ: **стоимость имущества реализуется без учета НДС (в соответствии с п.п. 2.3 ст. 93 НК РБ).** Местонахождение имущества: **г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15**			
1	**Автопогрузчик ДВ1788,** 1983 г. в., инв. № 101876, состояние – требует ремонта	**1 647,16**	164,72
2	**Автомобиль GAZ-SAZ-3507, 1992 г. в., рег. № АІ 6527-3**, инв. № 7007, цвет – голубой, тип ТС – грузовой самосвал, состояние – требует ремонта	**1 696,65**	169,67
3	**Компрессор ПК-3,5А**, 1998 г. в., инв. № 7045	**1 951,06**	195,11

Продавец: КЖРЭУП «Сельмашевское», г. Гомель, пр-т Космонавтов, 15. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 22-47-07 – Селиванов Николай Адамович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (КЖРЭУП «Сельмашевское»):** р/с BY21 PJCB 3012 4045 4310 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ № 400, УНН 400052171, БИК PJCBBY2X, ОКПО 00642495, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 июня 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 25 июля 2019 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

Продавец: индивидуальный предприниматель Биширов Андрей Геннадьевич, Витебская область, Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Медведка, ул Станционная 4-2, тел.: (29) 718-60-64, (33) 621-14-73.

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 200/С-84287, общая площадь 321,6 кв. м, наименование – здание бывших дежурных смен ПДС № 226, назначение – здание специализированное иного назначения, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 3-я Журжевская, 5, на зем. участке с кадастровым № 240100000001000541 площадью 0,3717 га, назначение – зем. участок для обслуживания здания бывших дежурных смен ПДС № 226.

Начальная цена: 15 708,00 бел. руб. без НДС. Задаток 1570,80 бел. руб.

Торги состоятся 29.07.2019 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в КУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в КУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах**: с 26.06.2019 с 8.30 по 26.07.2019 до 17.30. **Задаток перечисляется на р/с BY07BPSB30131159750169330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП – 300158258. Получатель платежа – индивидуальный предприниматель Биширов Андрей Геннадьевич.**

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. **Победитель торгов (претендент на покупку) обязан:** в течение 5 (пяти) дней со дня проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY**.

Продавец: унитарное предприятие «Строительно-монтажное управление «ПОДЪЕМ» (УНП 192522108) в лице ликвидатора Регица Алексея Альбертовича, тел. +37529 378-83-88.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **11 июля 2019 г**. 09.00–17.00 на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.** Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2019 г.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. с НДС
1	Автогидроподъемник АГП-30 (на базе КАМАЗ 53215), 2005 г. в.	27 324,00
2	Полуприцеп бортовой МАЗ 975800, 2010 г. в.	9 158,40
3	Автокран 45717-КС дв. 740,31-240-2295530 ш. 52244067, 2005 г. в.	31 968,00
4	Грузовой специальный самосвал МАЗ 555102-223, 2005 г. в.	6 847,20

Местонахождение – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-04. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов.

Для участия в торгах необходимо в срок по 10.07.2019 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП

Дзённік Гульняў

Спаборніцтвы і ўзнагароджанне ў новым фармаце

У пяты дзень спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў разыграна 8 камплектаў медалёў у такіх відах, як спартыўная аэробіка, веласпорт-шаша, дзюдо, настольны тэніс, скачкі на батуце і стральба кулявая. Таксама ў аўторак прайшлі папярэднія спаборніцтвы па бадмінтоне, боксе, барацьбе, веславанні на байдарках і каноэ, пляжным футболе і стральбе з лука.

Упершыню ў ходзе II Еўрапейскіх гульняў медаліста таў спаборніцтваў узнагароджвалі не пасля іх заканчэння, а на наступны дзень. Яркая, маляўнічая цырымонія ўручэння ўзнагарод адбылася на галоўнай фан-зоне каля Палаца спорту. Яе галоўнымі героямі сталі трыумфатары спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы. Нагадаем, упершыню на буйных мультыспартыўных форумах яны адбыліся ў новым фармаце — DNA. Адзначым, што беларускія лёгкаатлеты напярэдадні заваявалі тры залатыя і тры сярэбраныя медалі: узнагароды найвышэйшай вартасці атрымалі скакун у вышыню Максім Недасекаў, Таццяна Халадовіч (кіданне дзіды) і Эльвіра Герман (бег з бар'ерамі). Іх калегі па камандзе Анастасія Мірончык-Іванова (скачкі ў даўжыню), а таксама Віталь Парахонька і Крысціна Ціманоўская атрымалі «серабро».

— Гэта былі незабыўныя эмоцыі. Вядома, пэўная нявызначанасць з вынікам да канца спаборніцкага дня трымала ў напружанні. Я не быў да канца ўпэўнены ў тым, што залаты медаль дастанецца мне, эмоцыі зашкальвалі. Але рады, што ўсё атрымалася, — расказаў Максім Недасекаў. *— Так, фармат правядзення спаборніцтваў у лёгкай атлетыцы трохі нязвыклы, але ўсё новае спачатку цяжкае для ўспрымання. З улікам таго, колькі гледачоў прыйшло нас падтрымаць, якая атмасфера была на трыбунах, думаю, фармат прыжывецца.*

Таццяна Халадовіч адзначыла, што перамагаць у спаборніцтвах прыемна, але ўдвая прыемна, калі гэта атрымліваецца на роднай зямлі.

— На II Еўрапейскіх гульнях мы сталі ўдзельнікамі новых цікавых спаборніцтваў. Пра тое, што яны сапраўды аказаліся такімі, казалі гледачы, з якімі ўдалося пагутарыць. Гэта рэальна дынамічная лёгкая атлетыка. Спартыўны форум, які праходзіць у Мінску, арганізаваны на самым высокім узроўні, і, прызнаюся, мне тут больш падабаецца, тым больш, ёсць з чым параўноўваць. Цырымонія ўзнагароджання аказалася вельмі хвалюючай, але ў той жа час вельмі прыемнай, таму што людзі нас прыйшлі падтрымаць, — адзначыла Таццяна.

У цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў II Еўрапейскіх гульняў па лёгкай атлетыцы прынялі ўдзел прэзідэнт Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янез Качыянчыч, прэзідэнт Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Свен Арнэ Хансэн, прадстаўнікі кіраўніцтва нацыянальных алімпійскіх камітэтаў шэрагу краін Еўропы, а таксама старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім Дзевятоўскі і генеральны сакратар БФЛА Надзея Бут-Гусаім.

— Мае еўрапейскія калегі выказваюць словы віншавання, настолькі яны засталіся задаволеныя правядзеннем на II Еўрапейскіх гульнях спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы ў фармаце DNA. І віншаванні сапраўды шчырыя, таму што барацьба была сумленная, інтрыга захоўвалася да апошняга. Наогул фармат DNA — гэта эксперымент і адначасова экзамен для арганізатараў. Калі паглядзець на барацьбу, якая разгарнулася ў чатырох матчах кваліфікацыйнага раўнда, — усе знаходзіліся ў роўных умовах, на мой погляд. Пацвердзіць сваё меркаванне магу прыкладам Эльвіры Герман, якая заваявала «золата»: так, калі ты сапраўдны лідар, ты не звяртаеш увагу на іншыя абставіны, — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

Заключны медальны камплект у камандным заліку па лёгкай атлетыцы будзе разыграны 28 чэрвеня. Спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы ўваходзяць у кваліфікацыйную сістэму Алімпійскіх гульняў 2020 года.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Прадстаўнік Японіі пераймае вопыт работы беларускіх прэс-цэнтраў

Канаму Міяке з арганізацыйнага камітэта Алімпійскіх гульняў Токіа-2020 прыехаў у Мінск напярэдадні старту II Еўрапейскіх гульняў. Яго мэта — пераняць вопыт работы прэс-цэнтра на турніры па баскетболе 3х3. Раней малады чалавек працаваў журналістам у адной з газет Токіа, а цяпер рыхтуецца прымаць прадстаўнікоў СМІ з усяго свету ў Японіі. Як прызнаўся Канаму Міяке, Мінск з'яўляецца выдатным узорам такой дзейнасці.

— На Алімпіядзе-2020 я буду кіраваць прэс-цэнтрам на турніры па стрытболе, таму ў Беларусі назіраю за тым, як працуюць журналісты на спаборніцтвах менавіта па гэтым відзе спорту. Гляджу, як арганізаваны прэс-цэнтр і ўсе зоны для работы журналістаў, — расказвае Канаму Міяке. — Баскетбол у цэлым не вельмі папулярны ў мяне ў краіне, але гэты від спорту моцна развіваецца цяпер, калі ён упершыню ўвайшоў у праграму Алімпійскіх гульняў. Ён робіцца больш папулярным штодня. Але пакуль у нас праводзіцца не так шмат спаборніцтваў, таму мне цікава атрымаць вопыт работы на міжнародных гульнях.

У прадстаўніка аргкамітэта ўжо атрымалася паглядзець, як функцыянуюць зона для работы СМІ і мікст-зона.

— Гэта такое незвычайнае месца — сэрца прэс-цэнтра. Таксама я надаю увагу рабоце на фотапазіцыях, паглядзеў, як расстаўлены фатографы. Яшчэ мяне цікавіла работа з валанцёрамі. У Беларусі ўсё арганізавана на найвышэйшым узроўні. Турнір па баскетболе заканчваецца, таму я пераязджаю ў галоўны прэс-цэнтр Еўрапейскіх гульняў на стадыён «Дынама», дзе буду назіраць за работай журналістаў па лёгкай атлетыцы.

На маю думку, Алімпіяду і Еўрапейскія гульні яднае тое, што гэта мультыспартыўныя турніры, але, думаю, на Алімпійскіх гульнях будзе яшчэ больш людзей. У тым ліку будзе больш і спартсменаў, і журналістаў, тэлевяшчальнікаў. Сёння Токіа гатовы да Алімпіяды на 60—70 працэнтаў, многае з інфраструктуры ўжо гатова, а работа з журналістамі, іх размяшчэннем яшчэ вядзецца.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Канаму Міяке вельмі шмат часу праводзіць у прэс-цэнтры, таму ў яго яшчэ не атрымалася добра разгледзець Беларусь, але самае галоўнае тут ён ужо прыкмеціў.

— Мінск — гэта вельмі прыгожы і зялёны горад, тут вельмі ветлівыя людзі. Я наведаў некалькі кавярняў, пакаштаваў вашы знакамітыя бліны, а таксама стравы рускай і ўкраінскай кухні. Шчыра кажучы, я не вельмі шмат ведаю пра гэтыя краіны, тым больш прыемна пазнаёміцца непасрэдна.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

МЫ ГУЛЯЛІ ДЛЯ ВАС!

Жаночая і мужчынская зборныя Беларусі сталі бронзавымі прызёрамі ў баскетболе 3х3

Беларускія дзяўчаты былі неверагодна блізкія да выхаду ў фінал, але на апошніх секундах саступілі гэта права эстонкам — 14:15. А вось у матчы за трэцяе месца ўпэўнена перайгралі каманду Германіі — 21:16. «У першую чаргу мяне перапаўняюць пачуцці радасці і гонару за дзяўчат. Пасля прыкрага паражэння ў паўфінале яны вельмі знерваваліся і былі ва ўпадніцкім настроі. І ўсё ж знайшлі ў сабе сілы, сабраліся і праявілі сябе як сапраўдныя байцы. Дзякуй камандзе за гэты турнір. І дзякуй балельшчыкам за падтрымку — мы гулялі для вас», — адзначыў трэнер жаночай зборнай Беларусі Юрый ВОЎК.

Мужчынская зборная таксама была за адзін крок ад пападання ў фінал, але нашы хлопцы ўсё ж мінімальна саступілі латышам. У матчы за 3-е месца зборная Беларусі давяла справу да пераможнага канца, адабраўшы «бронзу» ў магутных палякаў, — 21:15. *«Я задаволены гульнёй каманды ў цэлым і кожным баскетбалістам у прыватнасці. Мы прайшлі выдатны турнірны шлях, абыграўшы такіх майстравых сапернікаў, як Славенія, Сербія і Польшча. Асаблівую значнасць і каштоўнасць гэтай «бронзе» надае той факт, што мы заваявалі яе дома, у Беларусі. Дзякуй усім балельшчыкам і нашым блізкім, якія падтрымлівалі нас на працягу ўсёй падрыхтоўкі і самім спаборніцтвам»*, — падкрэсліў **трэнер мужчынскай каманды Дзмітрый КАЛТУНОЎ.**

Старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола Максім РЫЖАНКОЎ адзначыў, што ганарыцца нашымі гульцамі. *«Яны паказалі цудоўны вынік тут, на Palova Arena. Парадавалі балельшчыкаў, малайцы. Мы загадзя рыхтаваліся да дамашняга турніру па баскетболе 3х3 на II Еўрапейскіх гульнях, за некалькі гадоў пачалі трэніравацца, падбіраць каманды, склады. У выніку такі падыход даў вынік. Турнір у Мінску паказаў, што няма нічога немагчымага, мы абыгралі шмат моцных камандаў, таму беларускі здольныя паказаць высокі вынік і на кантынентальным форуме, які вось-вось стартуе»*, — адзначыў Максім Уладзіміравіч.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
Фота Беларускай федэрацыі баскетбола.

Тэхналогіі

ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ БЕЛАРУСЬ

Падчас II Еўрапейскіх гульняў назіраецца добрая якасць сувязі, паведамляе міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін ШУЛЬГАН.

Непасрэдна да Гульняў дадатковая інфраструктура сувязі з'явілася на 22 спартыўных аб'ектах, гэта ў першую чаргу валаконна-аптычныя лініі сувязі. Для падрыхтоўкі аб'ектаў да спаборніцтваў было пракладзена каля 250 кіламетраў оптавалакна, на аб'ектах устаноўлена больш за 400 камутатараў. Што датычыцца падрыхтоўкі сеткі Wi-Fi, то, паводле ацэнкі міністэрства, вялікі аб'ём работы прарабілі «Белтэлекам» і «Дзелавая сетка».

«Белтэлекам» у дадатак да больш чым шасці тысяч пунктаў Wi-Fi усталяваў яшчэ больш за 400 пунктаў. Аператары забяспечылі доступ да Wi-Fi не толькі на спартыўных аб'ектах, але і на аб'ектах уздоўж асноўных аўтамагістраляў, у пунктах пропуску, на аўтобусным маршруце Нацыянальны аэрапорт — Мінск, а таксама ў метро. За час падрыхтоўкі да II Еўрапейскіх гульняў па ўсёй краіне дадаткова пабудавана 470 базавых станцый.

Міністр сувязі звярнуў увагу, што максімальная колькасць прадуктаў у гэтай галіне да спаборніцтваў была зроблена беларускімі распрацоўшчыкамі, у тым ліку інфармацыйна-тэхналагічная платформа Гульняў. Яна аб'ядноўвае некалькі блокаў — спартыўную тэлеметрыю, сістэму кіравання Гульнямі, праграмна-апаратны комплекс, тэхнічныя службы. «Самае важнае, што ўсе гэтыя рэчы застануцца ў далейшым для выкарыстання нашымі грамадзянамі. Я лічу, што гэта добра, таму што гэта новы крок, новая планка якасці і камфорту», — удакладніў Канстанцін Шульган.

Wi-Fi у Вёсцы спартсменаў дапамагла забяспечыць кампанія «Дзелавая сетка». Як растлумачыў яе **генеральны дырэктар Павел АЛЯКСЕЕНКА**, створаную інфраструктуру захаваюць і пасля Гульняў. Маладыя людзі, якія пражываюць у Студэнцкай вёсцы, змогуць падключыцца да інтэрнэту без наведвання офіса аператара — аддалена, з дапамогай спецыяльнага мабільнага дадатку. Гэта будзе першы такі праект у нашай краіне.

Сувязь 4G падчас гульняў найбольш запатрабаваная ў фан-зоне каля Палаца спорту і на Кастрычніцкай плошчы, паведаміў **генеральны дырэктар СТАА «Беларускія воблачныя тэхналогіі» Алег СЯДЗЕЛЬНІК**. «Самае вялікае спажыванне трафіка — гэта фан-зона каля Палаца спорту, дзе ў сярэднім спажываецца 3,3 тэрабайта за суткі, Кастрычніцкая плошча — больш за 2 тэрабайты за суткі», — адзначыў спецыяліст. У дзень адкрыцця спаборніцтваў на аб'ектах Гульняў і ў фан-зонах выкарыстоўвалі 6,5 тэрабайта трафіка. З моманту старту Еўрапейскіх гульняў сярэдняя хуткасць у сетцы чацвёртага пакалення складае ад 28 да 42 Мбіт/с.

Сяргей КУРКАЧ.

Дайджэст

Што пішуць пра Гульні замежныя СМІ

УКРИНФОРМ *(УКРАІНА)*

Сярэбраная прызёрка II Еўрапейскіх гульняў у бегу на 100 метраў з бар'ерамі ўкраінская лёгкаатлетка Ганна Плаціцына падзялілася ўражаннямі ад свайго выступлення ў Мінску. Яна, у прыватнасці, адзначыла, што ў сталіцы Беларусі, дзе праходзяць Еўрапейскія гульні, створаны ўсе ўмовы для таго, каб спартсмены маглі паказваць добрыя вынікі: «Перш за ўсё хацела б адзначыць вельмі высокі ўзровень арганізацыі спаборніцтваў. Сапраўды, неверагодна прыемна ўдзельнічаць у падобных стартах, на якіх ты маеш усе ўмовы для таго, каб паказаць добры вынік».

РИА НОВОСТИ *(РАСІЯ)*

Трэнер зборнай Расіі Ілля Лявонаў лічыць Еўрапейскія гульні адным з найважнейшых турніраў у пляжным футболе: «Хочацца, каб турнір хутчэй пачаўся. Для пляжнага футбола Еўрапейскія гульні разам з чэмпіянатам свету, напэўна, адзін з самых важных турніраў. Еўрапейскія гульні — цэлая вяха для нашага віду спорту. Гэта асаблівы турнір. Думаю, першым матчам супраць іспанцаў мы цалкам прасякнемся духам гэтых Гульняў».

RTBF.BE *(БЕЛЬГІЯ)*

Гэта трэба бачыць! 5 баёў, 5 перамог. Маціяс Касс выйграў золата на Еўрапейскіх гульнях у дзюдо. У 22 гады бельгіец стаў першым у Еўропе ў вазе да 81 кг. «Антверпенец» здзейсніў уражлівы рывок на татамі «Чыжоўка-Арэна» ў Мінску. У фінале ён сышоўся з балгарынам Івайлам Іванавым. Менавіта гэтаму дзюдаісту ён прайграў у Варшаве на еўрапейскім першынстве 2017 года. Але сёння ў Беларусі ён здолеў супрацьстаяць свайму грознаму саперніку, нядаўняму пераможцу Гран-пры Маракеша. У кар'еры бельгійца гэта першая перамога такога ўзроўню.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

КАЛІ ВАДА — БЯДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але асноўны наш біч — гэта нецвярозыя ў вадзе. Некалькі гадоў таму ў нас здарыўся проста дзікі выпадак. П'яная кампанія прымасцілася недзе на беражку і нешта адзначала. Як гэта водзіцца, адзін з удзельнікаў застолля на свежым паветры пайшоў ахаладзіцца ў ваду. Кампанія яго нават і не хапілася адразу. Толькі калі сыходзілі з вадасховішча, адзін успомніў: а дзе наш таварыш? Кінуліся яны назад на месца, дзе сядзелі. Але знайсці яго адразу не здолелі. Выклікалі вадалазаў. Тыя дасталі са дна цела патанулага. Кампанія не прыдумала нічога лепшага, як тут жа на месцы выпіць за спачын яго душы. Наогул, ісці на кантакт з нецвярозымі людзьмі вельмі складана. Дыялогі атрымліваюцца, мякка кажучы, займальныя, але вось што рабіць, калі чалавек ледзь трымаецца на вадзе, але ні за што не хоча садзіцца да нас у лодку?

Разам з тым ёсць і іншыя прыклады. Раз мы адправіліся на абход і заўважылі дзяўчыну, якая заплыла за буй. Мы падышлі бліжэй, пацікавіліся самаадчуваннем. Дзяўчына спярша сказала, што добра ўмее плаваць. Але праз нейкі час усё ж папрасілася ў лодку, бо моцна стамілася і не ацаніла свае сілы.

Шмат праблем нам дастаўлялі спартсмены-трыятланісты. Яны заплываюць па шэсць чалавек адразу на сярэдзіну акваторыі. Мы выязджаем, тлумачым, што купацца тут забаронена, і просім кіравацца да берага. Спартсмены, у сваю чаргу, пачыналі выстаўляць прэтэнзіі ў наш адрас. Маўляў, мы тут трэніруемся, а вы нам перашкаджаеце. І ўвогуле, маўляў, мы не простыя адпачывальнікі, і з намі нічога дрэннага не здарыцца. Але як бы там ні было, мы гэта расцэньваем як знаходжанне ў вадзе па-за дазволенай зонай, таму што на сярэдзіне акваторыі ходзяць катары. І заўважыць чалавека своечасова магчыма далёка не заўсёды, не кажучы аб тым, каб яго неяк аб'ехаць. Псіхалагічнае супрацьстаянне доўжылася даволі доўга. І нарэшце трыятланісты здаліся. Яны пачалі плаваць уздоўж буёў, але ў дазволеным месцы.

А вось у нас 11 чэрвеня загінуў чалавек. Такая недарэчная смерць адбылася... Адзін рэстаран на праспекце Пераможцаў пабудаваны блізка ад берагавой лініі. І вось яго наведвальнік вырашыў пакупацца, ды не разлічыў свае сілы і знік. Гэта толькі ў кіно чалавек, калі тоне, пачынае махаць рукамі і клікаць на дапамогу. А ў рэальнасці ўтапленне — справа ціхая. Перад тым мы праязджалі на катары і нікога не сустрэлі. Пасля аказалася, што нас раздзяліла літаральна 15 хвілін. Відавочца, які паведаміў аб трагедыі, сышоў. І вось дзе шукаць чалавека? Пачалі прачэсваць дно і прыкладна праз гадзіну мы дасталі патанулага.

...Першы пункт, куды мы кіруемся, — гэта дамба. Яе ў якасці трамплiна аблюбавалі падлеткі. Вось толькі знаходзіцца яна ў месцы, якое для купання не прызначана. Што ляжыць на дне з даволі складаным рэльефам — невядома. А глыбіня тут істотная — каля васьмі метраў. Купацца забаронена ў радыусе пяцідзесяці метраў. Спыняе гэта, аднак, далёка не ўсіх.

Андрэй Мароз бярэ мегафон і крычыць:

— Злазьце з дамбы. Тут месца, забароненае для купання. Навошта рызыкуеце здароўем?

Трое падлеткаў збянтэжана пераглядваюцца.

— А як нам адсюль вылезці? Тут жа на сушу дарогі няма.

— Паволі злазьце і плывіце туды, дзе знаходзяцца буі. А мы пастаім, пасочым, каб нічога не здарылася.

Хвіліны праз тры апошні падлетак перасек «мяжу». І праз некаторы час мы кіруемся ў напрамку за МКАД.

— Там у нас таксама абсталяваны пляжы. На жаль, што там адбываецца, мы з будынка выратавальнай станцыі не ўбачым. Па першае, тут будзе напрасткі кіламетры з тры. Па-другое, берагавая лінія вельмі звілістая. Ды і масты перашкаджаюць... Так-так-так, а што гэта ў нас тут? Парушальнікі!

Справа мы бачым дзвюх жанчын бальзакаўскага ўзросту. Яны плаваюць хіба не на самой сярэдзіне ракі. Глыбіня ўнізе — метраў восем. Прычым ніякага пляжа тут і блізка няма.

Матарыст-рулявы спыняе лодку.

— Адпачываеце? — пытаецца начальнік станцыі.

— Так. Спякотна, вось і асвяжаемся. А мы нешта парушылі?

— О, не тое слова. Па-першае, вы знаходзіцеся на сярэдзіне акваторыі. Вас можа пераехаць катар або лодка. Па-другое, я тут не бачу ні буйкоў, ні пляжа. Значыць, вы ў забароненым месцы.

— Ды мы тут купаемся не ўпершыню і ўсё добра, — спрабуе пераканаць адна з жанчын.

— А калі не будзе добра? Вы ад катара, які можа несціся на вялікай хуткасці, адплыць не паспееце — тут жа агляд мінімальны. Калі, крый божа, дрэнна стане, на дапамогу ніхто не прыйдзе.

— А дзе нам купацца?

— Пляж праз некалькі соцень метраў вунь там, — паказвае ў бок санаторыя «Крыніца» Андрэй Мароз.

— Добра, пойдзем туды... — са скрухай уздыхае жанчына і разам з сяброўкай пачынае павольна плыць да берага. Як і ў першым выпадку, чакаем, пакуль парушальнікі выйдуць на бераг. А матарыст-рулявы зноў заводзіць рухавік. Мы кіруемся да моста, дзе сходзяцца два вадасховішчы — Дразды і Крыніца.

...І проста з-за берага на нас выплывае лодка з маладымі людзьмі на борце. Ні на кім з іх няма выратавальных камізэлек.

— Ого... — шэпча начальнік станцыі. — І хто іх выпусціў толькі?

— Маладыя людзі! — разносіцца над вадасховішчам. — Вы чаму без камізэлек? Дзе лодку бралі?

— Там, — паказвае адзін з юнакоў у бок забаўляльнай установы. Кіруемся туды. На беразе нейкі мужчына крычыць:

— Гэта я ім лодку даў. І камізэлькі там ёсць.

— Дык а чаму ні на кім з іх яны не надзетыя? Гэта ж сур'ёзнае парушэнне. А калі лодка перакуліцца, тады што? Вадалазы будуць іх на дне шукаць?

Пад нашым пільным вокам лодка з юнакамі павольна рухаецца да берага.

* * *

Вось так мы літаральна за 40 хвілін сталі сведкамі трох парушэнняў правілаў бяспекі на вадзе. Не пабачылі мы хіба што п'яных купальшчыкаў. Але сустрэць апошніх увечары працоўнага дня не так і проста. Напярадзе ж яшчэ не адзін летні ўік-энд.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ

Тэма

ПАЛЯВАННЕ НА «ПЛАСТЫК»

Па стратэгіі банкаўскага развіцця, у найбліжэйшыя гады 75 % плацяжоў будзе здзяйсняцца менавіта безнаяўным спосабам. Адначасова з гэтым павялічыцца колькасць слаба дасведчаных у віртуальнай бяспецы людзей, якія маюць мала справы з інтэрнэт-сэрвісамі. У сваю чаргу, гэтая сітуацыя прыцягвае і камп'ютарных злодзеяў. Такая вось калізія.

Але гэта не азначае таго, што трэба адмаўляцца ад усіх тых выгод і эканоміі часу, якія дае пластыкавая картка і тым больш інтэрнэт-банкінг. Проста гэтымі інструментамі трэба карыстацца правільна. Як? Аб гэтым расказвае намеснік начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Уладзімір ЗАЙЦАЎ.

Сацыяльная інжынерыя

Супрацоўнікі банка заўжды папярэджваюць пра тое, што рэквізіты карткі нельга перадаваць камусьці якім бы там ні было чынам. Ні праз інтэрнэт, ні па тэлефоне. Але... Што вы зробіце, калі вам «стукаецца» ў асабістыя паведамленні ваш сябар і просіць даныя вашай карткі з якой-небудзь нагоды? Напрыклад, аўтару гэтых радкоў прыляцела неяк паведамленне з просьбай... сфатаграфаваць картку, паколькі, маўляў, у суразмоўніка нейкія праблемы з пераводам грошай. Я тут жа набраў сябру і паведаміў пра гэтую акалічнасць. А пакуль ён блакіраваў акаўнт, з'явілася ідэя жорстка пажартаваць з хакера. Яму было адпраўлена фота... старой магнітнай карткі на праезд у мінскім метро, якая перастала дзейнічаць яшчэ гадоў так пяць ці нават больш таму.

— Выкарыстанне метадаў сацыяльнай інжынерыі пастаўлена зламыснікамі, як той казаў, на паток, — гаворыць суразмоўнік. — Часцяком ім нават не трэба ствараць шкодныя праграмы. Навошта траціць рэсурсы на напісанне вірусаў, калі людзі самі гатовы аддаць усе патрэбныя коды і нават паведаміць змест СМС, якое прыходзіць пры здзяйсненні банкаўскіх аперацый? Сюды ж адносяцца і электронныя лісты, у якіх паведамляецца аб нечаканым выйгрышы ў сотню тысяч долараў, які вам неабходна перадаць на картку. І самае прыкрае, што людзі на гэта «вядуцца». Калі вам прыходзіць такое паведамленне, то абавязкова звяжыцеся з яго адпраўшчыкам па галасавой сувязі, каб у вас не засталося сумненняў, што гэта менавіта ён зрабіў.

Яшчэ адна хітрасць зламыснікаў — даслаць карыстальніку прыгожа аформленае інфармацыйнае паведамленне нібыта ад імя банка. У паведамленні, як правіла, указваецца якая-небудзь заманлівая прапанова. А самае «смачнае» тут хаваецца ў спасылцы, якая дазваляе перайсці на... падроблены сайт банка. Таму заўжды правярайце, што напісана ў адрасным радку браўзера. Адрасы сайтаў могуць адрознівацца ўсяго адной літарай, але адзін з іх абавязкова будзе несапраўдны.

— У нашай практыцы мы сутыкаліся і з вішынгам. Злодзеі тэлефануюць і прадстаўляюцца супрацоўнікамі банка, у якім нібыта праходзяць нейкія тэхнічныя работы. Пад гэтай маркай яны могуць папрасіць пароль да інтэрнэт-банкінгу, нумар карткі, тэрмін яе дзеяння, CVV-код... Ахвяра верыць у добрыя намеры і паведамляе ўсе звесткі. Але ўважліва зірніце на канверт, у якім вам перадаецца картка ў банку. Там чорным па белым напісана: нават супрацоўнікам банка нельга перадаваць рэквізіты карткі.

З планшэтам да банкамата

Ідэальная сітуацыя — гэта калі карыстальнік карткі задзейнічае ўсе дадзеныя

банкам магчымасці абароны сваіх сродкаў. Гэта ліміты на перавод грошай, плацяжы за мяжой. Абавязкова падключыце двухфактарную аўтэнтыфікацыю, калі трэба пацвярджаць двойчы, што вы — гэта вы. Звычайна гэта выглядае так: спярша вы ўводзіце лагін і пароль або код, а пасля вам на мабільны тэлефон ці e-mail прыходзіць спецыяльны код. Гэта не панацэя ад узлому, але досыць надзейны бар'ер, які сур'ёзна ўскладняе зламыснікам доступ да чужых даных.

— Мы расследавалі безліч спраў, калі чалавек выкарыстоўваў пару «лагін — пароль», уводзячы сваё прозвішча, нейкія словы ці прасцейшыя камбінацыі, — расказвае Уладзімір Зайцаў. — Але ў «цёмным» сегменце інтэрнэту існуе шэраг сэрвісаў, якія дазваляюць падбіраць такія паролі. Тут толькі справа часу, калі ж да вас «дойдуць» аматары лёгкіх грошай. Таму пароль мусіць быць не меншым за восем сімвалаў і ўключаць у сябе літары ў розных рэгістрах, лічбы і спецыяльныя сімвалы.

А ці сустракаецца заражэнне банкаматаў або інфакіёскаў вірусамі?

— Для Беларусі гэта нехарактэрна. У 2012 годзе мы спынілі спробу заразіць прылады шкоднай праграмай. Зламыснікі набылі яе ва Украіне за вялікія грошы, але выкарыстаць не паспелі. Яны былі затрыманы з доказамі злачынства. На адным з носьбітаў інфармацыі і быў запісаны вірус. Дарэчы, менавіта ў нашых паўднёвых і ўсходніх суседзяў заражаныя банкаматы — не такая ўжо і экзотыка.

А вось над хатнім камп'ютарам пашчыраваць уладальніку інтэрнэт-банкінгу трэба. Там абавязкова мусіць быць установлены антывірус з актуальным абнаўленнем і самыя апошнія версіі праграм. У тым ліку — і аперацыйнай сістэмы. Калі ж іх выкарыстоўваць гадамі без абнаўлення, то хакеры ўсё роўна знойдуць у іх уразлівасці. Тым больш што цяпер існуе шмат шкоднасных праграм на любы ўзровень дасведчанасці ў IT-сферы.

— Апошнім часам мы сутыкаемся з тым, што зламыснікі аб'ядноўваюцца ў групы і ствараюць спецыялізаванае праграмнае забеспячэнне, скіраванае на крадзеж асабістых даных, — кажа Уладзімір Зайцаў. — Маскіруецца ж яно пад самыя звычайныя кампаненты. Напрыклад, нейкі рэсурс можа прапанаваць абнавіць Flash-плэер. Але апошняя актуальная яго версія змешчана на сайце кампаніі-вытворцы! Калі ж пампаваць яго са старонняга рэсурсу, то, хутчэй за ўсё, вам прапануюць вірус. Ці распазнае яго своечасова антывірус — добрае пытанне, калі яго распрацоўшчыкі новую «заразу» фізічна не паспелі ўнесці ў базу. Гэты крымінальны бізнес пастаўлены на сапраўдны паток. Наша работа ўскладняецца тым, што ўдзельнікі яго могуць быць выхадцамі з розных краін і не ведаць адзін аднаго.

А вось праблема скімераў — прылад, якія ставіліся на банкаматы для таго, каб красці пін-код, таксама ўжо страціла актуальнасць. Гэтаму паспрыяла адразу два фактары — тое, што ўсё болей аперацый здзяйсняецца ў інтэрнэце, і тое, што карткі выключна з магнітнай паласой у абарачэнні ўсё менш і менш. Займаліся гэтым у нас пераважна заезджыя злодзеі. Лавілі іх даволі хутка, ды і адказнасць за такое прадугледжана вельмі жорсткая, асабліва калі на лаву падсудных трапляла арганізаваная група — ажно да 15 гадоў пазбаўлення волі згодна з часткай 4 артыкула 212 Крымінальнага кодэкса. А некалькі год таму мы сутыкнуліся з нетыповым злачынствам. Малады чалавек падключыў да банкамата свой планшэт. Затрымалі яго хутка, прычым з доказамі злачынства, але ён паспеў скрасці больш за 200 тысяч рублёў.

Правіла трох картак

Карт-рахункі беларусаў, здавалася б, не вельмі прыцягальныя. Сумы на іх ляжаць не вельмі значныя — як правіла, гэта ў найлепшым выпадку некалькі тысяч рублёў. Але разавы «ўлоў» зламысніка, які складае недзе каля 100 рублёў, кампенсуецца колькасцю такіх трымальнікаў. Так пакрысе і збіраецца даволі ўнушальная сума. Таму адсюль вынікае так званае правіла трох картак. Для інтэрнэт-разлікаў трэба завадзіць асобную картку, дзе грошы не будуць пастаянна захоўвацца, а залічвацца туды перад здзяйсненнем плацяжу. Для разлікаў унутры краіны і за мяжой лепш таксама займець асобны «пластык», куды будуць пералічвацца грошы з зарплатнай карткі. Але нярэдка сутыкаешся з тым, што чалавек разлічваецца за мяжой менавіта з зарплатнай карткі, захоўваючы на ёй усе грошы. Варта зламысніку перахапіць да яе доступ, скажам, у Тайландзе ці Інданезіі — і рахунак будзе таяць. Прычым цяпер няма ніякай праблемы бясплатна завесці некалькі картак і пры неабходнасці пераводзіць або залічваць сродкі. Так, гэта даставіць крыху нязручнасцяў. Але ступень бяспекі павысіцца шматкроць.

— Тут згадваецца адзін паказальны выпадак, — успамінае Уладзімір Зайцаў. — Адзін з даволі забяспечаных людзей выязджаў у Санкт-Пецярбург і расплаціўся ў адным з гандлёвых цэнтраў сваёй карткай. Здавалася, сітуацыя трывіяльная. Праз некаторы час ён вярнуўся ў Беларусь. І вось стаіць чалавек у чарзе ў касу ўжо ў нашым гандлёвым цэнтры, а яму ў гэты час тэлефануюць з банка, які эмітаваў картку. Супрацоўнікі банка паведамілі, што зараз ён ажыццяўляе плацяжы на вялікія сумы за мяжой. У выніку рахунак быў заблакаваны, але спісанне грошай ужо адбылося.

Летась была затрымана група зламыснікаў, што кралі грошы пры дапамозе спама. Яны пісалі лісты, якія рассылалі пэўным групам людзей. Калі такі ліст адкрываўся на камп'ютары, то з сецівa тут жа пачынаў падгружацца вірус. Ён даваў магчымасць кіраваць камп'ютарам аддаленым спосабам. Вірус запускаўся аўтаматычна, пасля чаго краў і перасылаў персанальныя даныя.

— Банкі таксама не стаяць на месцы і прымаюць шэраг прэвентыўных захадаў, скіраваных на верыфікацыю плацяжа. Напрыклад, банкі ЗША палічаць транзакцыю ашуканскай, калі яна будзе здзейснена ноччу і на нетыповую суму. Напрыклад, звычайна вы разлічваліся сумамі па 50—100 долараў у дзень, і нечакана з вашай карткі хочуць здзейсніць перавод на суму, вышэйшую шматкроць, ды яшчэ і ноччу, хоць вы да таго заўжды плацілі ўдзень. Метад станоўчы, але ратуе не заўжды. Нам вядомы выпадкі, калі зламыснікі нават перахоплівалі СМС-паведамленні, якія прыходзілі на смартфон уладальніка карткі падчас банкаўскіх аперацый. Тут можна парэкамендаваць толькі адно — не стаўце на свой тэлефон неправераныя праграмы. Хто ведае, які таямнічы функцыянал яны захоўваюць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Рэпарцёр

МАЛАДОСЦЬ НЕ ЎСЁ ДАРУЕ

— Падлеткі-правапарушальнікі цяпер прасунутыя. Убачылі міліцыянера — інфармацыя праз месенджары паміж сабой пайшла. Не паспееш абярнуцца, а іх ужо і след прастыў! — кажа старшы ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Першамайскага РУУС Мінска маёр міліцыі Андрэй КАСЦЮЧКОЎ. — Бегаюць так хутка, хоць на Алімпійскія гульні адпраўляй!

Карэспандэнты «Звязды» разам з ахоўнікамі парадку адправіліся ў вячэрні рэйд па аблюбаваных месцах адпачынку сталічнай моладзі.

***

Першы прыпынак — буйны гандлёва-забаўляльны цэнтр на станцыі метро «Усход». Непаўналетніх трэба шукаць у зоне фуд-корта. Менавіта тут яны спрабуюць набыць алкаголь.

— Добры вечар. Вам ёсць па 18 гадоў? — падыходзіць да кампаніі з чатырох хлопцаў Андрэй Ігаравіч. — Вашы пашпарты, калі ласка.

Маладыя людзі, якія за столікам у кутку частуюцца півам і гамбургерамі, працягваюць дакументы. Міліцыянер уважліва глядзіць на дату нараджэння.

— А вы пашпарт дома забыліся? — звяртаецца да юнака з моднай стрыжкай інспектар.

Гэта, тлумачаць суразмоўнікі, адна з самых папулярных адгаворак у падлеткаў, якія не хочуць раскрываць свой сапраўдны ўзрост. А яшчэ прыдумваюць, што здалі пашпарт на візу, не носяць с сабою «важныя паперы», бо баяцца згубіць. Нават спрабуюць даказваць, што ўсе патрэбныя міліцыянерам дакументы толькі што скралі!

— Новая «фішка» ў моладзі — калі пашпарт з сабою не браў, але ёсць яго фота. «Вось, пераканайцеся, мне ўжо 19!» — паказваюць на тэлефоне. А там добра бачна, што над дакументам папрацавалі ў графічным рэдактары, — кажа **старшы ўчастковы інспектар інспекцыі па справах непаўналетніх Першамайскага РУУС Мінска маёр міліцыі Уладзімір ГАРДЗІЕЎСКІ.**

Прафесійнае чуццё калег не падвяло. Яўгену (гэта і іншыя імёны ў тэксце зменены. — **Аўт.**) сямнаццаць гадоў: «Толькі тату не тэлефануйце, — просіць. — Ён мне новы планшэт абяцаў. Баюся, што гэтая мая выхадка ўсё сапсуе».

З бацькамі хлопца інспектары правядуць прафілактычную гутарку. Пакуль ехалі дарослыя, Жэня расказаў, што навучаецца на экскурсавода. Добра валодае нямецкай мовай. Любіць падарожнічаць.

— Мы не ведалі, колькі яму гадоў. Пазнаёміліся ў інтэрнэце — «рэзаліся» ў адну камп'ютарную гульню. Вось першы раз сустрэліся абмеркаваць поспехі, — апраўдваюцца паўналетнія сябры юнака.

Тым часам міліцыянеры знайшлі супрацоўніцу адной з вядомых сетак хуткага харчавання, якая прадала 17-гадоваму піва. Дзяўчына цалкам прызнала сваю віну: «Людзей сёння шмат, зусім закруцілася. Не ўгледзела». За гэта прадаўшчыцы пагражае штраф да 50 базавых велічынь (згодна з часткай 6 артыкула 12.17 КаАП Беларусі).

— Часам вызначыць узрост чалавека вельмі цяжка. Адны выглядаюць старэйшымі за свае гады, іншыя, наадварот, «не дацягваюць» да іх. Таму лепей правяраць усіх «падазроных», — кажуць інспектары.

Міліцыянеры спыталі дакументы яшчэ ў траіх чалавек — усё ў парадку.

***

— Сярод падлеткаў шмат дробных крадзяжоў. Хапаюць цукеркі, жуйкі. Дарэчы, робяць гэта, пабіўшыся аб заклад. Маўляў, я змог. А ты? Нядаўна адна дзяўчына пад уплывам сябровак спрабавала каньяк з крамы вынесці! — расказваюць калегі.

Хатніх падлеткавых вечарынак стала менш, лічаць суразмоўнікі. Незаконных графіці таксама: «Для такой творчасці выдзяляюцца спецыяльныя сцены. Малюй, колькі душы заўгодна». Пік папулярнасці спайсаў, на шчасце, прайшоў. Але трымаецца мода ў падрастаючага пакалення на закінутыя будынкі. Так і цягне іх туды, каб зрабіць экзатычныя сэлфі. На жаль, наколькі гэта небяспечна, многія нават не здагадваюцца. «Раён на раён», па чалавек 100, пагаварыць юнакі зараз не выходзяць. Адносіны высвятляюць анлайн.

Лес побач з вуліцай Лапаціна. Яшчэ адно летняе месца, дзе любіць «тусавацца» моладзь. Накіроўваемся туды.

— Што робіце тут? — сустракаем кампанію з дзвюх дзяўчат і трох хлопцаў.

— Фатаграфуемся.

— А што ў руках? — Уладзімір Віктаравіч заўважае пластыкавую бутэльку памерам 0,5 літра.

— Вада! — адказвае бялявая прыгажуня.

— Тут вадой не пахне. А вось алкаголь адчуваецца добра.

— Можа быць, не ведаю. Я ўзяла бутэльку дома і наліла туды вады, — выкручваецца дзяўчына.

— Паедзем на медыцынскі агляд або адразу скажаце праўду?

— Так, я піла сідр, але раніцай! Адзін глыток! Тое, што заставалася на дне. Гэта напой маёй старэйшай сястры. Яна пакінула яго на стале, — прызнаецца падлетак. — У мяне была істэрыка! Я плакала, думала, што экзамен заваліла па рускай мове.

Сяброў Машы адпускаем. З дзяўчынай накіроўваемся ў аддзяленне міліцыі, туды пад'едуць і яе бацькі. Па дарозе даведваемся, што Маша скончыла 9 клас, збіраецца паступаць на лінгвіста. Абітурыентка плануе вывучаць англійскую і кітайскую мовы.

— Вы павінны мяне зразумець, самі ж маладыя былі! — цісне на жаль Марыя.

— Я да 25 гадоў увогуле не піў алкаголь, прафесійна займаўся спортам, — выдае Андрэй Ігаравіч.

— Яна ў мяне да канца лета пад хатнім арыштам сядзець будзе, ніякіх кішэнных грошай і нават доступ у інтэрнэт абмяжую, — гневаецца расчырванелы бацька Марыі. — Я ёй пакажу, дарослая! Яна сваю памылку ўжо зразумела — бачу па вачах. Урок на ўсё жыццё.

Адказнасць па частцы 1 артыкула 17.3 КаАП «Распіванне алкагольных, слабаалкагольных напояў ці піва ў грамадскім месцы, акрамя месцаў, прызначаных для ўжывання алкагольных, слабаалкагольных напояў ці піва, або з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення, які абражае чалавечую годнасць і грамадскую маральнасць» наступае з 16 гадоў. Таму прэтэнзіі за правіну Машы будуць выстаўлены яе бацькам па артыкуле 9.4 КаАП «Невыкананне абавязкаў па выхаванні дзяцей».

***

Уладзімір Віктаравіч працуе інспектарам па справах непаўналетніх амаль 21 год. Андрэй Ігаравіч у міліцыі — 16.

Цікава, што Уладзімір Віктаравіч па адукацыі — настаўнік хіміі і біялогіі. Веданне дзіцячай псіхалогіі, прызнаецца міліцыянер, дапамагае ў службе.

— Самае складанае ў нашай працы — гэта знайсці агульную мову з падлеткамі. На маім адміністрацыйным участку шэсць школ. Кожны тыдзень я праводжу прафілактычныя гутаркі з вучнямі. Вынікі ёсць. Але ўсё роўна, на жаль, знаходзяцца тыя, у каго на дрэнную справу рукі «свярбяць». Толькі потым плачуць: «Андрэй Ігаравіч, чаму я вас не паслухаўся?!», — расказвае па дарозе на новы «аб'ект» інспектар.

— Канешне, шкада тых, хто па сваім падлеткавым глупстве папаўся, не з той кампаніяй, напрыклад, звязаўся. Але закон адзіны для ўсіх, — кажа Уладзімір Віктаравіч. — Мы ж, у першую чаргу, клапоцімся пра бяспеку саміх дзяцей! Невядома, каго можна сустрэць на вуліцы ноччу і што ў незнаёмца ў галаве?!

Бацькі, што не дзіўна, амаль заўсёды абараняюць сваё дзіця. Кляпатрэбнае ўзроўню, не ўзнікла: «спагадлівых», як растлумачылі прыгажуні, заўсёды можна знайсці.

— Вам, паважаны, за сваю дабрыню трэба будзе расплачвацца. Падобныя дзеянні трактуюцца як уцягванне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны (артыкул 17.4. КаАП), — тлумачыць Уладзімір Віктарвіч. — А гэта — штраф ад 10 да 20 базавых велічынь.

— Гаварылі мне сябры, што са сваім характарам прападу — вось, атрымлівай! — схапіўся за галаву мужчына. — Я ж проста па цыгарэты выйшаў...

— Мне аднойчы з юнаком прыйшлося аб'ехаць пяць крам у пошуках прадаўца, у якога ён купіў алкаголь. У выніку — глуха. Хлопец стаміўся «падарожнічаць» і прызнаўся, што ўсё прыдумаў, каб сябра не падстаўляць, — успамінае выпадак з прафесійнай дзейнасці Андрэй Ігаравіч.

На першы раз сітуацыя для дзяўчат скончыцца, хутчэй за ўсё, папярэджаннем і прафілактычнай гутаркай. Бацькам жа нагадаюць пра дзеянне артыкула 17.13 КаАП «Невыкананне абавязкаў па суправаджэнні ці забеспячэнні суправаджэння непаўналетняга ў начны час па-за межамі жылля».

Падлеткі зараз у асноўным ужываюць слабаалкагольныя напоі: піва, джын-тонік, сідр. Гэтага маладому неакрэпламу арганізму «хапае» з лішкам. Суразмоўнікі кажуць, што ўмудраюцца непаўналетнія «тусіць» нават на могілках — шыфруюцца так!

Статыстыкі, хлопцы ці дзяўчаты часцей за ўсё парушаюць закон, у інспектараў няма. Сярэдні ўзрост — 13—17 гадоў. Больш за ўсё правапарушальнікаў сярод студэнтаў з іншых гарадоў: «Падлеткі з'язджаюць ад бацькоў, адчуваюць свабоду і пачынаюць адпачываць без межаў».

***

— Сучаснае пакаленне — няпростае, але наколькі разумнае! Непаслухмянасць хутка пройдзе — час у іх зараз такі. Успомніце сябе ў падлеткавым узросце і свой юнацкі максімалізм, — на развітанне кажуць міліцыянеры. — Нам жа застаецца быць для моладзі не нейкім караючым органам, а старэйшымі мудрымі сябрамі.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.



Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Мазырскі раён

Беларусы са Знакам якасці

Творчую брыгаду «Звязды» прыняла старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА

— Былая Палеская вобласць — гэта мы. А як заведзена жартаваць напалову ўсур'ёз, палешукі — гэта беларусы са Знакам якасці. З майго пункту гледжання больш самавітыя, паважныя, больш адказныя, больш сабраныя і заўсёды захоўваюць традыцыі сваіх продкаў. Дадам яшчэ, што добрыя, гасцінныя. Лічу, гэта ўсё закладзена на генным узроўні. Іх прадзеды жылі сярод балот, і выжыць паасобку не выйшла б, таму трымаліся грамады. І якія вялікія былі сем'і...

— На зайздрасць. Дарэчы, а як зараз, Алена Фёдараўна?

— У апошнія гады на нараджальнасці, па прыросце колькасці насельніцтва дынаміка станоўчая. У раёне 133 979 жыхароў. І ў параўнанні з мінулым годам натуральны прырост склаў 542 чалавекі. Мы ўсё робім для таго, каб павялічыць працягласць жыцця людзей: рэгулярнымі сталі прафілактычныя агляды, за апошні час набылі 92 адзінкі сучаснага медыцынскага абсталявання, якое дае магчымасць праводзіць абследаванні на апярэджанне. Нашы прадпрыемствы маюць здраўпункты, якія таксама сочаць за здароўем людзей. Так што за кошт павелічэння працягласці жыцця — а ў нас яна складае ўжо 74,5 года — станоўчыя тэндэнцыі адсочваюцца і сёлета. Спадзяюся, па выніках года возьмем рубеж у 75 гадоў. Разнастайныя скрынінгі, што мы праводзім, дазваляюць апераджаць непажаданыя сітуацыі. У раёне 19 дзяржаўных устаноў аховы здароўя, а летась адкрыўся і прыватны медыцынскі цэнтр «Сям'я і здароўе», аснашчаны сучасным медыцынскім абсталяваннем. Магчымасці яго дазваляюць і абследаваць, і лячыць.

Дзейнічаюць электронны рэцэпт і электронныя картачкі, наладжаны запіс на прыём праз інтэрнэт, усё гэта зручна. А пазаўчора на базе гарадской бальніцы адкрыта рэнтгена-эндаваскулярная аперацыйная для правядзення аперацый на каранарных сасудах.

— З прыемнай спецыфікай усё зразумела. Калі вы не супраць, звернемся да традыцыйнага на такіх сустрэчах пытання: як выканкам кіруе рэальным сектарам? Але напачатку, калі ласка, пра паказчыкі леташняй работы.

— Па іх выніках Мазырскі раён занесены і на абласную, і на рэспубліканскую Дошку гонару. Так што гэта калектыўная заслуга кожнага жыхара Мазыршчыны. Бо да ацэнкі нашай работы падыход быў комплексны, улічваліся самыя разнастайныя паказчыкі — і выніковасць вытворчасці, і ўзровень рэалізацыі прадукцыі, і жыццёвы ўзровень насельніцтва, і іншыя. Нават па адной лічбе становіцца зразумела, што адпрацавалі дастойна — летась на 135 % павялічана выручка па ўсіх прадпрыемствах і арганізацыях.

Мазыр увайшоў у пералік гарадоў для далейшага інтэнсіўнага развіцця, паскоранага развіцця, і на гэты год стаіць задача павялічыць аб'ёмы вытворчасці

ў прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, сферы аказання паслуг. І забяспечыць дастойную заработную плату. Мы на сябе ўзялі абавязацельства сёлета выйсці на сярэдні ўзровень зарплаты 1050 рублёў. Па выніках чатырох месяцаў па прамысловасці, а ў нас 22 прамысловыя прадпрыемствы — гэта і флагман МНПЗ, і «Мазырсоль», і «Беларускабель», і «Мазырскія малочныя прадукты», швейная фабрыка «Надэкс» і іншыя, — аб'ёмы вытворчасці склалі 3,1 мільярда рублёў, гэта 110,3 працэнта росту да ўзроўню мінулага года.

Магчыма, гэтыя працэнты стараннему чалавеку мала што скажуць, але калі раней па ўдзельнай вазе ў аб'ёмах прамысловасці вобласці Мазырскі раён займаў 36 працэнтаў, то зараз 42,4 працэнта. Так што кожнае прадпрыемства ўносіць свой уклад. Менавіта такую задачу і вырашае выканаўчая ўлада — каб кожнае прадпрыемства, няхай там працуюць толькі 100 чалавек, сапраўды ўносіла свой уклад. Каб яго прадукцыя была запатрабавана на рынках, а калі партфель заказаў ёсць, то ёсць і магчымасць зрабіць якасную прадукцыю і рэалізаваць яе.

Горад — вялікі, па-свойму цікавы, тут шмат гандлёвых аб'ектаў, таму ёсць дзе грошы патраціць, і патрэбна, каб была дастойная зарплата. Па прамысловасці яна склала 1347 рублёў (108,4 працэнта росту).

Мы гандлюем з 55 краінамі свету, і ў нас за першы квартал экспартныя пастаўкі склалі 925 мільёнаў долараў ЗША, а гэта нафтапрадукты, наша малочная прадукцыя, соль... У цэлым па прамысловасці 76 працэнтаў прадукцыі ідзе на экспарт.

Як будуем сваю работу з рэальным сектарам? Традыцыйнымі сталі выязныя пасяджэнні выканкама на базе прадпрыемстваў разнастайных галін. Адзін раз збіраем кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў на «Мазырсолі», потым на іншым. Наведваем вытворчасць, абмяркоўваем найбольш актуальную для ўсіх праблему. Скажам, інвестыцыйную палітыку, ці ўзаемадзеянне з банкамі, альбо якія новыя віды прадукцыі ўдалося паставіць на паток дзякуючы ўкладзеным сродкам, з якім партфелем заказаў збіраюцца працаваць ужо ў наступным месяцы... Рознабакова, зацікаўлена, шчыра. І гэта той вопыт, які вельмі карысны дырэктарскаму корпусу, бо ён з прывязкай да нашай канкрэтыкі.

Не сакрэт, што ўважліва сочым за эканамічнай сітуацыяй на кожным прадпрыемстве, каб не ўпусціць той момант, калі спатрэбіцца наша дапамога. Люстэрка работы любога прадпрыемства — бухгалтарскі ўлік. Калі своечасова праводзіцца аналіз, то рашэнне праблемы не расцягваецца на цэлы квартал, а тут жа пачынаем працаваць на апераджэнне, па выніках дзесяцідзённак.

Так што сустрэчы на месцах — гэта перш за ўсё аналіз глыбінных працэсаў, якія адбываюцца за прахадной. Падчас такіх сустрэч са справаздачай падымаем кіраўнікоў прадпрыемстваў, што працуюць недастаткова эфектыўна, з меншай рэнтабельнасцю, чым могуць.

А з прадпрыемствамі, якія горш «глядзяцца», чым у цэлым па раёне, мы адпрацоўваем праблему «кропкава». Наведваем калектыў, бываем у цэхах, размаўляем з людзьмі, робім паглыблены эканамічны аналіз. Калі патрэбна, запрашаем эканамічных аналітыкаў з вобласці. Калі ёсць магчымасць, то дапамагаем камплектаваць партфель заказаў, бо ў раёне таксама ідзе спажыванне шырокага спектра прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. І ў ролі патэнцыйнага спажыўца варта бачыць і прадпрыемства-суседа. Бывае, што важна падтрымаць кіраўніка добрым словам, прыдаць настрою, актывізаваць старанні таго, хто пачаў паціху апускаць рукі. Не саромеемся і замяніць кіраўніка, які перастаў бачыць перспектыву.

Не хаваем, не замоўчваем праблемы і на сустрэчах на сельскагаспадарчых прадпрыемствах. Вынікі работы аграрыяў падводзім па 28 паказчыках, вызначаем тры найлепшыя сельскагаспадарчыя арганізацыі, уручаем ім пераходныя кубкі. Па выніках чатырох месяцаў лідзіруе саўгас-камбінат «Зара», гэта наш флагман. А таксама сортавыпрабавальная станцыя і дзяржаўнае прадпрыемства «Козенкі-Агра».

Саўгас-камбінат «Зара» перамагае стабільна. Зараз у яго палова аб'ёмаў вытворчасці — у Нараўлянскім раёне, клопат пра заўтрашні дзень якога «Зара» ўзяла на сябе. І палова іх аб'ёмаў у нас у раёне, тут размешчаны буйныя свінагадоўчы комплекс і птушкафабрыка, перадавое перапрацоўчае прадпрыемства, калі глядзець на колькасць, якасць і асартымент прадукцыі. Невыпадкова працягвае развівацца фірменны гандаль саўгаса-камбіната пад лозунгам «Дары ад «Зары». Вопытны кіраўнік Алег Міхайлавіч Слінько (дарэчы, патомны аграрый, яго бацька Міхаіл Якаўлевіч узначальваў суседнюю гаспадарку), яго намеснік па прафсаюзнай рабоце Іна Міхайлаўна Хамутоўская, а таксама Ніна Лявонцьеўна Мішота, Фёдар Іванавіч Козел, Валянцін Мікалаевіч Кушнярук, ды і ўся адмабілізаваная, цудоўна падрыхтаваная каманда вядуць за сабой не толькі ўласны калектыў, за імі падцягваюцца іншыя нашы гаспадаркі. «Зара» мае закончаны цыкл вытворчасці, цудоўныя фінансавыя вынікі дзейнасці і даўно ператварылася ў рэспубліканскую школу перадавога вопыту, тут праводзяцца заняткі з аграномамі, заатэхнікамі і іншымі спецыялістамі з усёй рэспублікі. Сапраўды адным ёсць што пахваліць, а другім — чаму павучыцца.

Мяне радуе (але не супакойвае), што па прадукцыйнасці малочнага статку Мазырскі раён займае першае месца ў Гомельскай вобласці і пятае ў краіне, сярод 118 раёнаў краіны.

Летась, калі гаварыць чыста па сельскай гаспадарцы, узровень рэнтабельнасці продажу склаў 16,9 працэнта. Дзякуючы таму, што цалкам усё эканамічна пралічана. Дзяржзаказ выканалі, і для сябе кармавая база цудоўная — жывёла круглы год на стойлавым утрыманні.

І зарплата ў сельскай гаспадарцы 940 рублёў.



Шчаслівае дзяцінства маленькіх мазыран. Каля раённай Дошкі гонару.

— Прытым будзем мець на ўвазе, што вось ужо пяць гадоў, як вам перададзена сельская гаспадарка Нараўлянскага раёна.

— Бо да гэтага нараўлянцы былі ў пяцёрцы раёнаў, якія пляліся ў хвасце па ўсіх паказчыках. Аварыя на ЧАЭС наклала свой адбітак, шмат людзей выехала з раёна, змяніўшы месца жыхарства. Што парадзіла свае цяжкасці ў аб'ёмах вытворчасці, у аб'ёмах рэалізацыі, многія іншыя. І ў якасці эксперымента было перададзена ў камунальную ўласнасць Мазырскага райвыканкама амаль 19 тысяч іх сельскагаспадарчых угоддзяў і абодва сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, на той момант стратныя.

— Гэта азначае, вам перадалі ўсе аграрныя гаспадаркі раёна?

— Гэта так. Спачатку ў іх было восем гаспадарак, але паступова за паслячарнобыльскія гады колькасць скарацілася. І мы, узяўшы ў камунальную ўласнасць Нараўлянскі раён, прыярытэты расставілі з улікам тэхнікі, што мелася ў абедзвюх гаспадарках. Для КУП «Уладзіміраўскі-Галоўцы» і КСУП «Братэрства» пакінулі землі, якія яны рэальна могуць апрацаваць, — прыкладна 10 тысяч гектараў, а амаль дзевяць тысяч перадалі ў арэнду сельскагаспадарчым арганізацыям Мазырскага раёна. Саўгасу-камбінату «Зара», эксперыментальнай базе «Крынічная», агародніннай фабрыцы, сортавыпрабавальнай станцыі, ДП «Козенкі-Агра»...

Цяпер у нараўлянскіх аграрыяў з году ў год наглядаецца дынаміка росту, няхай невялікая, на ўзроўні 1,3 раза, але тым не менш. Растуць і вытворчасць прадукцыі, і выручка гэтых прадпрыемстваў. Гаспадаркі працуюць стабільна. Паўтаруся: пакуль без вялікіх прыбыткаў, але і без страт. Маюць 2,5—3,5 працэнта рэнтабельнасці. Важна, што ў людзей ёсць работа, яны могуць сябе рэалізаваць і зарабіць на хлеб.

А калі казаць у цэлым пра Нараўляншчыну зараз, то яна выйшла на другое месца ў вобласці па прадукцыйнасці малочнага статка і на дваццатае — у краіне. Так што пра эфектыўнасць формаў і метадаў кіравання з боку ўлады лепш меркаваць па фактах.

Можна расказваць яшчэ пра работу агітацыйна-прапагандысцкіх груп, пра падтрымку сямейных дынастый, правядзенне свят «Дзень горада» з актыўным удзелам дынастый... І ўсё ж самая ўдалая форма кіраўніцтва — галоснасць, калі ўся інфармацыя даводзіцца да людзей у поўным аб'ёме і своечасова.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

ПРА ШЧАСЦЕ ДЗЯЦЕЙ МАЗЫРСКАГА ДЗІЦЯЧАГА ДОМА

Увосень гэтая ўстанова, дзе жывуць 50 дзяцей, кошка Багіра і сабака Фрэдзі, адзначыць 75-годдзе. Звонку дом патанае ў дрэвах і кветках, амаль па ўсёй тэрыторыі — яблыні, вінаграднік, парэчкі. Знайшлося месца для градак і цяпліцы. Унутры дом зіхаціць чысцінёй і ўражвае ўтульнасцю. Мясцовыя выхаванцы жывуць у сапраўдных кватэрах, у пакоях — па аднаму-двое дзетак. А яшчэ тут створана спецыяльна аздобленая прастора — нешта накшталт этнаграфічнага міні-музея.

Яны ходзяць у звычайныя садкі і школы, часта ездзяць на экскурсіі, займаюцца ў гуртках і секцыях. Вольны час бавяць у доме ў басейне з саўнай, бібліятэцы, забаўляльным клубе. На вуліцы для дзетак — гульнявыя і спартыўныя пляцоўкі, новенькі комплекс трэнажораў...

Тут ёсць нават свая надомная царква, дзе хрысцяць і прычашчаюць дзяцей.

— Трэба, каб у дзяцей хоць якіясьці бацькі з'явіліся. Я па мясцовым тэлебачанні звяртаюся да жыхароў, хто хацеў бы атрымаць хрэсніка, і называю ўзрост дзетак і каго будуць хрысціць, — расказвае **дырэктар Мазырскага дзіцячага дома Ірына ВІШНЕЎСКАЯ.** — Пасля дзеці ў сем'і ездзяць, а хросныя бацькі займаюцца патранатным выхаваннем.

Нягледзячы на тое што большасць дзяцей тут хлопчыкі, бадай што ўсе з ахвотай завіхаюцца па гаспадарцы, мыюць і прасуюць бялізну, робяць выцінанкі, вяжуць, малююць, майструюць дробныя вырабы. Гэтым харастваом упрыгожаны ледзьве не кожны метр дома, на сценах якога ёсць яшчэ і лепка са шпаклёўкі — прыгажосць, зробленая рукамі выхавальнікаў, а таксама маляўнічыя карціны.

Кухням у кватэрах пазайздросціць не адна гаспадыня. Дзеці тут самі могуць падагрэць ежу, калі затрымаліся на занятках, ці нешта прыгатаваць, а на дні нараджэння нават тарты пякуць.

— Усе гэтыя кантакты з бытавой тэхнікай — жывая і непасрэдная падрыхтоўка да дарослага жыцця. Нашы выпускнікі могуць і закаткі закруціць, і аладкі згатаваць, і суп, нават варэнне з кабачкоў, што на градах вырасцілі, вараць, — кажа **Галіна ВАСІЛЕНКА, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце.**

Тым, хто выпускаецца з дзіцячага дома, абавязкова з дапамогай спонсараў збіраюць самае неабходнае для самастойнага жыцця: пасцельнае, посуд, чайнік... А яшчэ для кожнага выхавальніка рыхтуюць «кнігу жыцця». Гэта самаробны альбом з фотаздымкамі і відэадыскам, па якіх можна прасачыць, чым займаўся гадаванец дома, што яго цікавіла, як бавіў час, з кім сябраваў.

— З нашых сцен за столькі гадоў выйшла больш як 2000 выхаванцаў. Ёсць сярод іх і загадчыкі дзіцячых садкоў, і вядомы ў Гомелі дызайнер, са слабым слыхам хлопец, стаў паспяховым ІП, — гаворыць дырэктар. — Наш выпускнік з парушэннем слыху нават адсвяткаваў тут вяселле са сваёй паловай. Мы цэлы рытуал зрабілі для іх, а яны пасадзілі на тэрыторыі яблыню, пасля з першынцам сваім прыходзілі. Хлопец кажа, што колькі будзе жыць, стане прыходзіць сюды. Чатыры пары ў нас так святкавалі, так што гэта ўжо традыцыя.

Таму і не дзіва, што сюды прыходзяць з экскурсіямі, а фразай «аддам цябе ў дзіцячы дом» не напалохаеш, а хутчэй прымусіш пакаваць туды чамадан.

Ірына СІДАРОК.
Фота Андрэя САЗОНАВА.

БУДНІ АЛІМПІЙСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

75 гадоў Мазырскаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту імя І. П. Шамякіна. З гэтай датай калектыў павіншаваў кіраўнік краіны

— Наш універсітэт, заснаваны ў далёкім 1944 годзе, за 75 гадоў стаў буйным навукова-адукацыйным і грамадска-культурным цэнтрам Палесся, — расказвае рэктар універсітэта кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт Валерый НАЎНЫКА. — Цяпер галоўнымі кірункамі навукова-метадычнай дзейнасці выкладчыкаў з'яўляюцца павышэнне якасці адукацыі, забеспячэнне духоўнага, маральнага і фізічнага развіцця студэнтаў, падрыхтоўка іх да паспяховай працоўнай дзейнасці. Распрацоўваюцца вельмі патрэбныя на месцах сучасныя педагагічныя тэхналогіі і методыкі ў дапамогу настаўнікам. Праводзяцца навукова-метадычныя семінары для настаўнікаў і выкладчыкаў школ, ліцэяў і каледжаў.



Рэктар універсітэта Валерый НАЎНЫКА.

Універсітэт па праве з'яўляецца вядучым цэнтрам у Рэспубліцы Беларусь па працоўным навучанні, ажыццяўляючы на базе вучэбна-вытворчых майстэрняў падрыхтоўку выкладчыкаў тэхнічнай і абслуговай працы, — працягвае Валерый Мікалаевіч. — З мэтай аказання дапамогі дзецям з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, якія знаходзяцца ў складаных сацыяльных умовах, праводзяцца навуковыя даследаванні ў галіне інклюзіўнай адукацыі, развіваецца студэнцкі валанцёрскі рух. Ва ўніверсітэце дзейнічае Цэнтр педагагічных тэхналогій, пры якім распрацоўваюцца і апрабоўваюцца новыя педагагічныя тэхналогіі, абагульняецца перадавы вопыт, а вядомыя ў рэгіёне настаўнікі праводзяць майстар-класы.

Вялікая ўвага, як я ўжо казаў, удзяляецца духоўнаму, маральнаму выхаванню моладзі, захаванню і вывучэнню гісторыка-культурнай спадчыны Палескага рэгіёна. У рамках гэтай работы вядуцца сумесныя навуковыя даследаванні з Беларускай праваслаўнай царквою Маскоўскага патрыярхату. Важным вынікам такога супрацоўніцтва стала выданне ўнікальнай кнігі «Салдаты Перамогі», у якой сабраны ўспаміны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і працаўнікоў тылу. У 2018 годзе пры садзейнічанні Тураўскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы ва ўніверсітэце адкрыты першы ў краіне Інавацыйна-метадычны цэнтр духоўнага і маральнага, грамадзянска-патрыятычнага выхавання на аснове праваслаўных традыцый беларускага народа.

І яшчэ. МДПУ імя І. П. Шамякіна заслужана лічыцца алімпійскай ВНУ. Студэнты і выпускнікі ўніверсітэта з'яўляюцца чэмпіёнамі і прызёрамі апошніх чатырох Алімпійскіх гульняў, першынстваў свету па веславанні на байдарках і каноэ, лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту.

Старонкі біяграфіі

Дзейнасць ВНУ на Мазыршчыне пачыналася на базе Рагачоўскага настаўніцкага інстытута. Рашэнне аб яе стварэнні, прынятае яшчэ ў ваенныя гады, сведчыць аб важнасці адукацыйных і выхаваўчых задач, якія яна прызвана была рашаць у разбуранай краіне.

Першы выпуск спецыялістаў адбыўся ў 1946 годзе. У школы Палесся былі накіраваны 190 настаўнікаў гісторыі, мовы і літаратуры, фізікі і матэматыкі, прыродазнаўства і геаграфіі.

За час сваёй дзейнасці ўніверсітэт падрыхтаваў больш за 49 тысяч спецыялістаў.

Жыццё — бурнае, насычанае

Выкладчыцкі склад універсітэта пастаянна папаўняецца найлепшымі яго выпускнікамі. Сёння каля 60 % выкладчыкаў складаюць выпускнікі розных факультэтаў. Сярод іх доктар тэхнічных навук прафесар У. С. Савенка, доктар філалагічных навук прафесар В. В. Шур, доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Г. У. Кулак. Рэктар і больш-шасць кіраўнікоў структурных падраздзяленняў з'яўляюцца выпускнікамі ўніверсітэта.

За апошнія пяць гадоў выкладчыкамі і супрацоўнікамі ўніверсітэта абаронена адна доктарская і больш за 15 кандыдацкіх дысертацый. У ВНУ — пяць камп'ютарных класаў, чатыры лінгафонныя кабінеты, каля 80 спецыялізаваных кабінетаў, лабараторый і майстэрняў, спартыўных і трэнажорных залаў.

Ва ўніверсітэце рэалізуюцца праграмы міжнародных стасункаў. Супрацоўнікі ўніверсітэта актыўна ўдзельнічаюць у рэалізацыі праекта еўрапейскай праграмы мабільнасці «MOST».

Універсітэт паспяхова выконвае дзяржаўны план па экспарце адукацыйных паслуг, рэалізуючы канцэпцыю полікультурнай адукацыі. Зараз тут навучаецца звыш 200 замежных студэнтаў з розных краін свету (Туркменістана, Расійскай Федэрацыі, Азербайджанскай Рэспублікі, Арабскай Рэспублікі Егіпет, КНР і іншых).

Па выніках выдатнай вучобы і актыўнага ўдзелу ў навукова-даследчай рабоце студэнты ўніверсітэта атрымліваюць стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, імя І. П. Шамякіна, імя Францыска Скарыны, імя Якуба Коласа і іншыя.

У інтэрнатах універсітэта забяспечаны належныя ўмовы для пражывання ў адпаведнасці з дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі. Функцыянуе санаторый-прафілакторый. Акрамя таго, студэнты штогод праходзяць аздараўленне ў іншых санаторыях краіны.

Прызёры XXXI Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра, чэмпіёнкі свету і Еўропы па веславанні на байдарках і каноэ, заслужаныя майстры спорту Рэспублікі Беларусь — выпускнікі ўніверсітэта. Злева направа — Маргарыта МАХНЕВА, Надзея ЛЕПЯШКО, Вольга ХУДЗЕНКА і Марына ЛІТВІНЧУК.

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.
Алена ДАЎЖАНОК.
УНП 400083888

Падчас Тураўскіх епархіяльных адукацыйных чытанняў ва ўніверсітэце.

ЗАСЛУЖЫЦЬ ПАВАГУ СПАЖЫЎЦА І... ПАХВАЛУ КАНКУРЭНТА

Касмічна складаныя праекты прыносяць палескаму нафтагіганту прарыўныя тэхналогіі

З творчай брыгадай «Звязды» сустрэўся генеральны дырэктар ААТ «Мазырскі НПЗ» Віталь ПАЎЛАЎ.

— Ці задаволены генеральны дырэктар вынікамі мінулага года і першага квартала гэтага года?

— У дырэктара такая пасада, што ён не можа быць усім цалкам задаволены. Але ж трэба быць і справядлівым. Калектыву даводзіцца працаваць у няпростых умовах, яны не залежаць ад нас і пастаянна змяняюцца. Гэта і цэны на нафту, на нафтапрадукты, і разнастайныя знешнія фактары, што ўплываюць на работу прадпрыемства. І нават розныя штучныя бар'еры, якія часам ствараюцца на нашым шляху. І жорсткае канкурэнтнае асяроддзе... З улікам усяго гэтага магу з пэўнай задаволенасцю гаварыць пра работу калектыву як летась, так і ў першым квартале. Пацвярджэннем пастаянна стабільнай работы ва ўсіх сітуацыях стаў той факт, што завод па выніках 2018 года пяты раз атрымаў прэмію ўрада ў галіне якасці і быў прызнаны найлепшым экспарцёрам у сваёй намінацыі.

Стабільнасць захавалі нават нягледзячы на пастаўку з Расійскай Федэрацыі няякаснай сыравіны з высокім утрыманнем хлорарганікі, што мае павышаную каразійную актыўнасць, факт шырокавядомы. Гэта было нечакана, аднак мы першымі адрэагавалі на сітуацыю, аператыўна выбудавалі тэхналагічны рэжым. Адным словам, забяспечылі работу прадпрыемства ва ўмовах форс-мажору. Цяпер выйшлі на нармальны тэхналагічны рэжым на ўсіх без выключэння сваіх тэхналагічных аб'ектах.

— На выхадзе вы ўсё роўна атрымалі тады прадукцыю годнай якасці?

— Нягледзячы на ўсе складанасці, якія ўзніклі ў рабоце прадпрыемства, перш за ўсё з вядзеннем тэхналагічнага рэжыму, мы забяспечылі высокую якасць прадукцыі ў безумоўным парадку. Не было ніякіх змен у паказчыках якасці, звязаных з няякаснай сыравінай, ні па адным нафтапрадукце. Адладжанасць тэхналагічных працэсаў і высокая кваліфікацыя персаналу дазволілі нам падтрымаць работу завода, нягледзячы на тое што абсталяванне выходзіла са строю. Калі б бачылі, што няма магчымасці выпускаць высакаякасны прадукт, давалося б спыніць работу прадпрыемства. Такім чынам, можам сказаць, што ў прадпрыемства ёсць запас трываласці.

— Вытворчая праграма гэтага года адрозніваецца ад леташняй?

— Асаблівага адрознення паміж гадавымі праграмамі няма. У нас ёсць аб'ёмы перапрацоўкі, якія трэба забяспечыць, выканаць усе даведзеныя да прадпрыемства паказчыкі. А яны не ніжэйшыя за леташнія, скажам так. І гэта з улікам таго, што сёлета трэба забяспечыць правядзенне сур'ёзнага капітальнага рамонту. Для калектыву — няпросты экзамен, але практыка паказвае, што з задачамі справімся.

— Віталь Пятровіч, вы згадалі пра жорсткае канкурэнтнае асяроддзе...

— Нам не бывае проста, са сваёй прадукцыяй мы павінны канкурыраваць на ўсіх рынках без выключэння. Стратэгія рэалізацыі нафтапрадуктаў прадпрыемства такая, што мы імкнёмся рэалізоўваць максімум прадукцыі на рынках геаграфічна блізкіх краін, тады лагістыка найбольш эфектыўная, і гэтыя рынкі для нас найбольш прэміяльныя. Канешне, тут мы не адны, свае нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы ёсць у той жа Расіі, Польшчы і Прыбалтыцы, у іншых краін-суседзяў, якія таксама жадаюць прысутнічаць са сваёй прадукцыяй на гэтых рынках. Таму і даводзіцца займацца развіццём прадпрыемства з пункту погляду атрымання выключна высакаякаснай прадукцыі, каб мы маглі канкурыраваць у гэтым сегменце. Мы не канкурыруем у нейкім іншым сегменце, а выключна ў сегменце высакаякаснай прадукцыі, і абсалютна канкурэнтаздольныя ў ім. Выпускаем усю прадукцыю паліўнага кірунку стандарту Еўра-5, і той факт, што да нас па выніках года няма ніякіх прэтэнзій з боку спажыўцоў як на ўнутраным, так і на знешніх рынках, — гэта сведчыць пра многае. Праз Беларускую нафтавую кампанію мы пастаўляем тавар больш чым у 20 краін свету, і нараканняў няма. Наколькі гэтае асяроддзе канкурэнтнае і наколькі яно жорсткае? І канкурэнтнае, і жорсткае. Тыя ж заводы Польшчы, якія маюць адпаведны тэхнічны ўзровень развіцця, сапернікі яшчэ тыя!

Працуюць Мажэйкяйскі завод у суседняй Літве і расійскія НПЗ — цэлы іх шэраг, яны могуць ствараць сур'ёзнае напружанне на рынках. Тым не менш па сваім узроўні тэхнічнага развіцця мы ўваходзім у лік найлепшых заводаў СНД як па глыбіні перапрацоўкі нафты, па выхадзе светлых нафтапрадуктаў, так і па індэксе Нэльсана — гэта паказчык складанасці развіцця тэхналагічных працэсаў. Так, асяроддзе жорсткае, мы гэта адчуваем, і ў той жа час здольныя не проста выжываць у ім, а рабіць гэта з поспехам.

— Чарговае прысуджэнне Прэміі Урада дае падставу пацікавіцца, ці часта генеральны дырэктар адчувае гонар за прадукцыю свайго калектыву?

— Я сапраўды ганаруся тым, што працую на нашым прадпрыемстве, ганаруся сваім заводам. Зразумела, што калі атрымліваеш прэмію ўрада, то гэта вянец усёй дзейнасці калектыву, і ўзнікае асаблівае адчуванне задаволенасці, бо працавалі як мае быць, і гэта ўбачылі і адзначылі.

Знаёмім з суразмоўнікам

Віталь Пятровіч — мазыранін.

Сваю працоўную біяграфію пачынаў на МНПЗ у сярэдзіне 90-х — аператарам установкі.

Паступова ўздымаўся па службовых прыступках: начальнік змены, начальнік участка, 11 гадоў адпрацаваў начальнікам вытворчага цэха. Затым — намеснік генеральнага дырэктара па забеспячэнні сыравінай і рэалізацыі нафтапрадуктаў.

«Мне складана стаяць на месцы, у тым ліку ва ўласным развіцці, — гаворыць ён. — Таму скончыў яшчэ адну (трэцюю па ліку) ВНУ — Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, факультэт «Вышэйшая школа кіравання бізнесам».

Пасля чатырохгадовай працы намеснікам генеральнага дырэктара МНПЗ запрасілі ў канцэрн «Белнафтахім», два з паловай гады працаваў намеснікам старшыні канцэрна. А калі на заслужаны адпачынак пайшоў Анатоль Аляксандравіч Купрыянаў, Паўлаў, ужо з канцэрнаўскай школай за плячыма, у сакавіку 2017 года быў прызначаны генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод».

Прыемная была і тая адзнака нашых калектыўных старанняў, якую далі ўдзельнікі красавіцкай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі па актуальнай тэме «Развіццё нафтаперапрацоўчых і нафтахімічных вытворчасцяў Рэспублікі Беларусь», якую мы правялі з «Белнафтахімам» і сусветна вядомай кампаніяй Euro Petroleum Consultants у сябе на заводзе. Збіраліся высокія прафесіяналы з 12 краін. І месца правядзення канферэнцыі, і яе ход можна расцаніць як свайго роду лакмусавую паперку адносін да Мазырскага НПЗ у асяроддзі прафесіяналаў. Калі яны знаёміліся з дзейнасцю прадпрыемства па ўсіх кірунках, гэта выклікала ў іх адабрэнне. Асабліва калі прагучала лічба, што за апошнія восем гадоў мы накіравалі 1,3 мільярда долараў ЗША інвестыцый у асноўны капітал і пабудавалі шмат тэхналагічных аб'ектаў, якія дазваляюць выпускаць канкурэнтаздольны прадукт. І калі быў агучаны факт, што кожныя два-тры гады мы ўводзім новы сур'ёзны тэхналагічны аб'ект. Спачатку гэтая інфармацыя выклікала шчырае непаразуменне — маўляў, як так, на іншых прадпрыемствах гэтага няма. Пасля тлумачэнняў калегі не хавалі задаволенасці нашай шырокамаштабнай рэканструкцыяй, нашымі падыходамі да яе.

Цікава, што даволі высокая і шчырая ацэнка прагучала з вуснаў... канкурэнтаў. Такое пачуеш нячаста. Можна зрабіць высновы, што завод рухаецца ў правільным кірунку — як з пункту погляду бягучай дзейнасці, так і свайго развіцця.

— У нейкім сэнсе тых, хто быў здзіўлены, можна зразумець. Парк тэхналагічных установак у вас і так адзін з найлепшых у СНД, і, здавалася б, куды далей імкнуцца? Куды вы імкняцеся, Віталь Пятровіч, калі рэалізуеце праграму развіцця да 2020 года? Што сёння ў гэтай праграме?

— Рэалізуем буйнамаштабны праект, самы маштабны ў гісторыі прадпрыемства: узводзім комплекс гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў H-Oil. Тут таксама патрэбна асвоіць 1,2—1,3 мільярда долараў ЗША. Можаце сабе ўявіць, які там аб'ём работ, нават калі меркаваць па ўкладаннях.

90 працэнтаў грашовых сродкаў мы ўжо асвоілі, па асваенні інвестыцый комплекс уваходзіць у заключную стадыю. Выводзім яго на фінішную прамую. Для чаго ён патрэбен? Ён дазволіць быць канкурэнтаздольнымі і ў перспектыве. Будзе створана тэхналагічная схема, якая дазволіць яшчэ больш павялічыць глыбіню перапрацоўкі нафты. Калі па выніках мінулага года яна склала 78 працэнтаў, то будзе 90. І будзе вырашацца задача зніжэння долі цёмных нафтапрадуктаў. Выхад светлых нафтапрадуктаў павялічыцца да 67 %, узрасце і выпуск дызельнага паліва з утрыманнем серы менш за 10 ppm. Будзе забяспечаны ў поўным аб'ёме выпуск гідраачышчанага вакуумнага газойлю і нізкасярністага топачнага мазуту, які адпавядае еўрапейскім стандартам (з утрыманнем серы не больш за 1 %). Гэта таксама прыкметны прагрэс, які дасць яшчэ лепшыя эканамічныя паказчыкі.

Што далей? Сказаць складана. Усё будзе залежаць ад сусветных працэсаў. Ва ўсялякім разе, мы пастараемся ад іх не адставаць. Думаем пра развіццё свайго прадпрыемства ў залежнасці ад тых кірункаў, якія будуць абазначаны ў перспектыве сусветнай нафтахіміі і нафтаперапрацоўкі. Пакуль трэнд спажывання нафтапрадуктаў да 2050 года станоўчы. Значыць, і мы на месцы стаяць не будзем. Ідэі ёсць ужо сёння, шчыльна працуем з кансалтынгавымі кампаніямі, з ліцэнзіярамі шматабяцальных праектаў, праектнымі інстытутамі. Выбудоўваем праграму далейшага развіцця.

На цяперашнім этапе вельмі важна ў максімальна кароткія тэрміны завяршыць гэты буйнамаштабны праект — H-Oil.

— Раскажыце, калі ласка, пра яго крыху падрабязней.

— Комплекс складаецца з трох тэхналагічных установак — непасрэдна сама ўстаноўка гідракрэкінгу, на якой ажыццяўляецца перапрацоўка цяжкіх парэшткаў (астаткаў), а таксама ўстаноўка па вытворчасці вадароду і ўстаноўка па вытворчасці серы. І спадарожныя аб'екты, якія дазволяць гэтаму комплексу працаваць, — іх больш за два дзясяткі. Блокі зваротнага водазабеспячэння, рэзервуарныя паркі, кандэнсатная станцыя і падстанцыя, якая асобна забяспечыць комплекс электраэнергіяй. Прычым кожны такі аб'ект — сам па сабе буйнамаштабная ўстаноўка.

Усяго для стварэння комплексу гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў H-Oil патрабуецца змацаваць больш за 27 тысяч металаканструкцый, звыш 1,1 тысячы пазіцый нетыповага высокатэхналагічнага абсталявання вядучых кампаній Англіі, Італіі, Францыі, Расіі, Украіны, Славакіі, Чэхіі, Польшчы, ЗША, Японіі, Швецыі і іншых краін. А таксама больш за 5 тысяч кіламетраў кабельнай прадукцыі. Ажыццявіць мантаж каля 650 кіламетраў тэхналагічных трубаправодаў, выканаўшы звыш 400 тысяч зварных стыкаў (у тым ліку больш за 57 тысяч стыкаў высокага ціску са стапрацэнтным неразбураючым кантролем).

Будуецца комплекс гідракрэкінгу цяжкіх нафтавых астаткаў H-Oil.

Вось тая амбіцыёзная задача, якую патрэбна вырашыць. Такіх праектаў нават у свеце адзінкі, а ў СНД мы наогул першапраходцы. Дзеля аб'ектыўнасці скажам, што ў нафтаперапрацоўцы наогул нічога не прыдумана больш эфектыўнага. Ліцэнзіяр праекта — французская кампанія AXENS, яна выступае і нашым кансультантам.

— Ці ўдаецца вам вытрымліваць прынцып паэтапнага развіцця вытворчасці, калі кожны папярэдні этап з'яўляецца фундаментам для новага?

— Так, мы прытрымліваемся выключна гэтага прынцыпу, бо лічым: варта цалкам выкарыстаць тое, што было закладзена на прадпрыемстве раней. Пабудаваўшы гідракрэкінг цяжкіх нафтавых астаткаў, мы разлічваем, што ён дасць неабходны эканамічны эфект для інвеставання ў іншыя тэхналагічныя аб'екты. З майго пункту гледжання гэты прынцып найбольш правільны. Бо нельга хапацца за ўсё, можна нічога не зрабіць. Лепш выканаць пэўны этап, потым упэўнена перайсці да наступнага.

— Віталь Пятровіч, у выніку ўсіх сваіх наватарскіх пошукаў вы атрымалі прарыўныя тэхналогіі?

— На кожным этапе свайго развіцця мы ўводзілі складаныя тэхналагічныя аб'екты і такім чынам укаранялі тэхналогіі, якія на той час былі наватарскія, нават можна сказаць — прарыўныя. Першая камбінаваная ўстаноўка каталітычнага крэкінгу, уведзеная ў эксплуатацыю ў 2004 годзе, стала толькі чацвёртым у свеце такім аб'ектам і з'яўлялася цалкам прарыўной тэхналогіяй. Яна працягвае паспяхова працаваць. Далей. Установка алкілавання нармальных бутанаў была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2008 годзе, і на ёй ужыты тэхнічныя рашэнні, якія на той час з'яўляліся прарыўнымі. Яна працягвае працаваць. Установка гідраачысткі дызельнага паліва, што была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2011 годзе: аб'ём перапрацоўкі — тры мільёны тон штогод. Прычым ужыты такія тэхнічныя рашэнні, якія забяспечваюць яе работу па дзвюх лініях, кожная па паўтара мільёна. І цяпер мы атрымалі магчымасць іх па чарзе рамантаваць.

Такім чынам, які наш аб'ект ні вазьмі, на пэўным этапе гэта быў не толькі касмічна складаны на той час комплекс, але і сапраўды прарыўная тэхналогія, якая дазваляла заводу працаваць дастаткова эфектыўна нават у не самых спрыяльных умовах: вырашала праблему імпартазамяшчэння, уплывала на асартыментную палітыку і працавала на якасць. Пералічыць усё цяжка, і такую мэту перад сабой я сёння не стаўлю.

А апошні праект — як я ўжо сказаў, нічога больш складанага ў нафтаперапрацоўцы дагэтуль не прыдумана. І кожны раз мы з'яўляемся першапраходцамі ў асваенні тэхналагічных працэсаў.

Тут варта патлумачыць. Што датычыцца тэхналогіі перапрацоўкі, то сам працэс — ён зразумелы. Але калі выкарыстоўваюцца новыя, абсалютна наватарскія тэхнічныя і тэхналагічныя рашэнні, то іх трэба яшчэ асвоіць. Кожны раз гэта няпростая задача для калектыву. Пасля яе вырашэння да нас прыязджаюць з аднатыпных прадпрыемстваў, каб пераняць вопыт. Невыпадкова крылатай фразай сталі словы аднаго з замежных топменеджараў пра тое, што раней трэба было ездзіць вучыцца перапрацоўцы нафты ў Еўропу, а цяпер ёсць сэнс ехаць на Мазырскі НПЗ. Было б проста — ніхто не ездзіў бы.

— Калі ласка, пагаворым пра новыя віды прадукцыі. Што новага акрамя бензіну Аі-100?

— Гэта наш пастаянны клопат — абнаўленне асартыменту. Быў у нас нядаўна сярод навінак 98-ы бензін, ён быў дастаткова паспяховым. Апошняй па часе мы выпусцілі першую партыю і пачалі рэалізацыю бензіну з актанавым лікам 100. Украіна цікавіцца гэтым прадуктам, Казахстан. Спадзяёмся, што ён знойдзе сваю нішу і на ўнутраным рынку: хоць бы таму, што Аі-100-К5-Еўра павышае ККД рухавіка, а гэта прыводзіць да паляпшэння хуткасных характарыстык. Словам, рухавік працуе надзейна і эканамічна.

Калі далей расказваць пра бензіны, то не ўсе ведаюць, што наш 92-і выпускаецца чатырох відаў з рознымі якаснымі характарыстыкамі ў залежнасці ад патрабаванняў розных рынкаў. Некаму патрэбнае паліва з аксігенатамі, некаму без аксігенатаў. Адным з цяжкім насычаных пароў да 60 паскаляў, іншым — з вышэйшым за 60. Вось мы і працуем над разнастайным асартыментам пад адной гандлёвай маркай. Працягваем выпуск алкілату, гэта высокарэнтабельны прадукт. І метыл-трэт-бутылавага эфіру. Раней яны ішлі як кампаненты высокаактанавага бензіну, цяпер у ходзе аптымізацыі вытворчасці, якой мы займаемся пастаянна, наладжана іх самастойная рэалізацыя. Выпусцілі і сыравіну для вытворчасці тэхнічнага вугляроду, гэта паўпрадукт каталітычнага крэкінгу, паспяхова рэалізуем яго на рынку Расійскай Федэрацыі. Пайшлі першыя партыі прапанпрапіленавай фракцыі. Так што сочым за тэндэнцыямі і пад іх імкнёмся аптымізаваць свой вытворчы працэс.

— Але вы самі казалі, што патрэбны не толькі новыя тэхналогіі, але і сучасныя метады кіравання імі.

— Узровень тэхналагічнасці вытворчасці патрабуе прыняцця адэкватных рашэнняў. З цягам часу многае мяняецца, у тым ліку і падыходы да кіравання вытворчым арганізмам. Узровень кваліфікацыі персаналу сёння зусім іншы. Аператар чацвёртага ці пятага разрада ўчора і аператар з такім жа разрадам цяпер — абсалютна розныя спецыялісты з розным узроўнем ведаў і вопыту. Аператары найвышэйшых разрадаў часцей за ўсё маюць вышэйшую адукацыю, яны дэталёва разбіраюцца ў хімізме працэсаў. Папытайце ў яго пра яго працэс, і ён раскладзе ўсё па малекулах.

Так і кіраўнікі вытворчасці сярэдняга і вышэйшага звяна — патрабаванні да іх узраслі шматразова, яны павінны дасканала валодаць тымі сучаснымі сістэмамі кіравання, што ўкаранёны і выбудаваны ў адзіны ланцужок. Паглыбленая падрыхтаванасць персаналу — наш галоўны вытворчы сакрэт, які дазваляе выходзіць з любой сітуацыі.

Тут важна тое, наколькі чалавек жадае развівацца. Мяркую па сабе: мне патрэбна пастаянна рухацца, развівацца. Стараюся гэта зразумець, калі прызначаю людзей на інжынерныя пасады. У нас на вытворчасці настолькі ўсё сур'ёзна, што людзі павінны быць з вачыма, якія гараць. Чым бы ён ні кіраваў — брыгадай, секцыяй, установкай, але гэта павінен быць лідар. Ён павінен жадаць працаваць на сваёй пазіцыі. І гэта будуць адчуваць тыя, хто побач, і ўсё атрымаецца.

Ідуць глабальная аўтаматызацыя вытворчасці, камп'ютарызацыя, лічбавізацыя, і патрэбна сучаснае праграмнае забеспячэнне, якое дазваляе бачыць, што адбываецца з тэхналогіяй, а таксама з фінансавымі патокамі і гэтак далей. Зусім іншы ўзровень кіравання і прыняцця рашэнняў, ад чаго і будзе залежаць эканамічная эфектыўнасць работы калектыву. Нашы кадры да гэтага гатовы, калектыў мае высокі ўзровень кваліфікацыі. Сярэдні ўзрост 39 гадоў, створаны сплаў вопыту і маладосці. Пераймальнасць пакаленняў дазваляе заводу забяспечваць бягучую эксплуатацыю і развіццё вытворчасці.

Зразумела, што працэс гэты непарыўны, і мы людзей пастаянна навучаем. У нас дзве базавыя вышэйшыя навучальныя ўстановы — Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі тэхналагічны ўніверсітэт. Адтуль да нас прыходзяць выпускнікі. Цесная сувязь установлена таксама з Мазырскім каледжам, які вядзе падрыхтоўку кадраў для нас на дзеючыя і новыя тэхналагічныя аб'екты.

І яшчэ. З майго пункту гледжання, нельга адрываць вытворчае жыццё калектыву ад сацыяльнага. Развітая сацыяльная сфера завода абараняе чалавека працы і надае ўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Як, напрыклад, можна ўявіць жыццё нашага калектыву без Палаца культуры? Тым больш што ён ператварыўся ў цэнтр культуры Мазырскага раёна. Там (працытую песню) «прападаюць пропадам» і дзеці, і дарослыя — а гэта нашы работнікі, там і пенсіянеры. Не было б яго — куды пойдуць дзеці, на вуліцу? А яны павінны выхоўвацца ў пэўным асяроддзі і праз 10—15 гадоў прыйсці працаваць да нас. Мы пра гэта павінны думаць. Калі іх правільна выхоўваюць, яны прыйдуць амаль падрыхтаванымі членамі калектыву, застанецца толькі навучыць прафесіі. Такім жа чынам мы зацікаўлены ў станоўчых эмоцыях для дарослых. Ім на змене кожны раз патрэбна неверагодная канцэнтрацыя, і важна недзе зняць нагрузку. Чалавек павінен быць у нармальным псіхалагічным стане. У гэтым сэнсе Палац культуры проста незаменны. Як і санаторый «Сосны». Як і спартыўна-тэхнічны клуб «Старт», і дзіцяча-юнацкая спартыўная школа алімпійскага рэзерву «Жамчужына Палесся», у якіх гартуецца каля 1200 маладых мазыран, у тым ліку дзеці работнікаў завода. Усе гэтыя ўстановы прызваны забяспечыць сацыяльную актыўнасць членаў калектыву, што яны і робяць. Мы пра тое вельмі клапоцімся.

«ВЫСОКАЯ ЯКАСЦЬ ПАЛІВА — ВІЗІТНАЯ КАРТКА ЗАВОДА»

— За нашу прадукцыю спажывец галасуе рублём, — зазначае **начальнік таварнай лабараторыі Мазырскага НПЗ Андрэй ЗАЯЦ.** — Аўтарытэт, высокі імідж самі не прыходзяць, для гэтага даводзіцца папрацаваць. Вось адна з прыкмет таго, што прадукт у нас якасны: на Украіне, дзе прысутнічаюць пастаўшчыкі нафтапрадуктаў з розных краін, ужо на працягу многіх гадоў асаблівай папулярнасцю карыстаюцца запраўкі з мазырскім палівам.

Пра лабараторыі на прадпрыемстве кажуць, што яны «вочы і вушы» тэхналагічнага персаналу, мы пра вытворчыя працэсы ведаем амаль усё. На сённяшні дзень цэнтральная заводская лабараторыя (ЦЗЛ) — сучасны цэх, аснашчаны складанейшым высокатэхналагічным абсталяваннем. У яго саставе — таварная, кантрольная і даследчая лабараторыі. У кожнай з іх свае вытворчыя задачы, але ўсіх аб'ядноўвае адна мэта — высокая якасць выпускаемай прадукцыі.

На якім абсталяванні працуем? І на айчынным, і на імпартным. Ёсць асобныя метады выпрабаванняў, пад якія абсталяванне пакуль не выпускаецца на тэрыторыі СНД. Таму закупляем нямецкае, амерыканскае, ёсць асобныя экзэмпляры з Нідэрландаў. Кіраўніцтва зыходзіць з таго, што лабараторыя павінна быць узброена дасканала, з улікам выклікаў часу, каб фіксаваць рэальны стан рэчаў з якасцю.

Лабарант Вольга ВАРОНІНА.

Начальнік таварнай лабараторыі Андрэй ЗАЯЦ.

Калі пайшла няякасная расійская нафта, першымі гэта заўважылі супрацоўнікі ЦЗЛ, сярод іх функцыянальных абавязкаў — уваходны кантроль сыравінных патокаў. І адразу былі прыведзены, можна сказаць, у баявую гатоўнасць усе тэхналагічныя аб'екты. Наша лабараторыя таксама падключылася, пачала праводзіць яшчэ больш пільны кантроль якасці бензінаў, дызельнага паліва, астаткавых нафтапрадуктаў. Правяралі паўсюдна і ўсё. А так у паўсядзённым жыцці мы кантралюем прамежкавыя кампаненты таварнай прадукцыі, робім канечную пашпартызацыю прызначанай да рэалізацыі таварнай прадукцыі.

Пра тое, што пытанням якасці на прадпрыемстве надаецца найпершая ўвага, сведчаць і шматлікія прэміі Урада РБ, і шырокая геаграфія продажу нашых нафтапрадуктаў.

АПРАЎДАНАЯ МЕРКАНТЫЛЬНАСЦЬ КАЛЕКТЫВУ

Яшчэ адзін наш суразмоўнік — намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце, персанале і сацыяльным развіцці Генадзь ЦЕЦЯРУК

— І СНУЕ вельмі простая і трывалая залежнасць: калі чалавек сумленна працуе на такім вытворчым гіганце, як наш, то ён дапамагае краіне мацаваць эканамічную бяспеку, дапамагае заводу і адначасова вырашае праблему сацыяльнай абароненасці — сваёй сям'і і ўласную, — падкрэслівае Генадзь Віктаравіч. — Сацыяльная абарона членаў працоўнага калектыву грунтуецца на калектыўным дагаворы. Гэта вельмі сур'ёзны дакумент, з якога можна зразумець, што сацыяльная палітыка таварыства накіравана на стварэнне ўсіх неабходных сацыяльна-бытавых умоў для работнікаў завода. З мэтай дасягнення імі высокіх вынікаў працы. Па якіх галоўных кірунках сацыяльнай палітыкі мы працуем, можна зразумець ужо з назваў праграм: «Жыллё», «Здароўе», «Вольны час», «Моладзь», «Сацыяльная дапамога работнікам завода і членам іх сем'яў», «Добраўпарадкаванне».

— Пракаментуйце, калі ласка, эфектыўнасць першай праграмы.

— Асноўная яе задача — забяспечыць жыллём тых работнікаў прадпрыемства, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Вырашэнню задачы спрыяе інтэрнат для тых, хто пакуль не стварыў сям'ю, на 137 месцаў. Усе ахвотныя з гэтай катэгорыі забяспечаны жыллём. Таксама ёсць два інтэрнаты для пражывання сем'яў, там 244 кватэры. У чарзе на атрыманне маласямейкі — 24 сям'і завадчан.

— А чаму рэалізацыю праграмы «Здароўе» вы пачынаеце з арганізацыі рабочага харчавання?

— Зыходзячы ўсё з той жа здаровай меркантыльнасці, — жартуе Генадзь Віктаравіч. — Галодны чалавек — дрэнны работнік. Пра тое, каб нафтаперапрацоўшчык не быў галодны на змене, клапоцяцца адразу сем нашых сталовых больш чым на 500 пасадачных месцаў, магазін кулінарыі, аддзел кулінарыі і спецыяльнае падраздзяленне па вытворчасці кандытарскіх вырабаў. У вячэрні час работнікаў корміць наша сталоўка № 29, яна працуе ў дзве змены. А па заяўках работнікаў тэхналагічных установак з бесперапынным цыклам комплексныя абеды дастаўляюцца ў тэрмабоксах на рабочыя месцы, дзе абсталяваны пакоі прыёму ежы.

Наступны важны кірунак — клопат пра здароўе, у прыватнасці дыягностыка захворванняў. Яна праводзіцца на штогадовым медыцынскім аглядзе на базе пункта аховы здароўя ў адпаведнасці з дагаворам, заключаным з гарадской паліклінікай. А ўжо лячыць

нашых людзей дапамагаюць медыцынскія ўстановы не толькі Мазыра, але і Беларусі — з аплатай пацыентам медыцынскіх паслуг згодна з дагаворам па добраахвотным страхаванні.

Пярэдні край абароны — медпункт, дзе маецца і фізіятэрапеўтычнае лячэнне, і ёсць каму палячыць зубы. Летась зарэгістравана больш за 3300 наведванняў кабінета зубалячэння.

Кожны квартал камісія па аздараўленні з удзелам цэхавых урачоў, прафсаюзных актывістаў, прадстаўнікоў аддзела сацыяльнага развіцця падрабязна аналізуе стан захворвальнасці на заводзе і выяўляе канкрэтных, каму належыць прайсці лячэнне. Гэты спіс рассылаецца ў цэхі, складаецца графік аздараўлення ў заводскім санаторыі «Сосны».

— Пра лячэнне і аздараўленне ў санаторыі «Сосны» ў нас запланаваны асобны аповед, таму пяройдзем, калі ласка, да аздараўлення дзяцей.

— Па рашэнні тэндарнай камісіі для іх летняга адпачынку былі выбраны месцы аздараўлення ў Славацкай Рэспубліцы — у раёне горада Стара Любаўня, гэта перадгор'е Карпат. Ужо не першы год, дарэчы, і нашым дзецям там падабаецца. А таксама мы адпраўляем дзяцей у дзіцячы рэспубліканскі аздараўленчы цэнтр «Сядзельнікі» і нацыянальны дзіцячы цэнтр «Зубраня».

— Вы згадалі прафсаюзы...

— Лічу, што мы змаглі наладзіць сістэму ўзаемадзеяння і сумеснай работы з грамадскімі арганізацыямі і фарміраваннямі. Самымі шматлікімі з'яўляюцца прафсаюзныя арганізацыі: пярвічная арганізацыя Белхімпрафсаюза ААТ «Мазырскі НПЗ» і пярвічная арганізацыя Беларускага Незалежнага прафсаюза нашага таварыства. Акрамя таго, дзейнічаюць пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання «Белая Русь», пярвічная арганізацыя грамадскага аб'яднання ветэранаў, БРСМ, савет маладых работнікаў. Мы імкнёмся разам вырашаць тыя задачы, якія стаяць перад калектывам.

— У вас традыцыя клапаціцца пра будучую змену задоўга да таго, як маладыя людзі пераступяць прахадную завода...

— Каб паспяхова працаваць у нафтаперапрацоўцы, трэба быць у ладах з хіміяй. І з ініцыятывы прадпрыемства ў школах Мазыра адкрыты спецыялізаваныя класы па паглыбленым вывучэнні гэтага прадмета. А пры арганізацыйнай і матэрыяльнай падтрымцы завода ў Мазырскім дзяржаўным політэхнічным каледжы адкрыта група па падрыхтоўцы тэхнікаў-тэхнолагаў з прысваеннем рабочай прафесіі «аператар тэхналагічных установак». За гады навучання хлопцы і дзяўчаты з каледжа наведваюць аб'екты прадпрыемства, знаёмяцца з работай тэхналагічных аб'ектаў.

Важна, што наш аддзел па падрыхтоўцы кадраў пастаянна займаецца арганізацыяй вытворчай практыкі для навучэнцаў тэхнікумаў і студэнтаў ВНУ. З мэтай удасканалення работы па замацаванні маладых спецыялістаў на вытворчасці аддзел кадраў праводзіць свой аналіз студэнтаў і навучэнцаў, што праходзілі практыку ў аб'яднанні па прафілюючых спецыяльнасцях. Кандыдатуры тых, хто добра сябе зарэкамендаваў, уносяцца ў заяўку на размеркаванне маладых спецыялістаў.

З мэтай адаптацыі і набыцця неабходных практычных і арганізацыйных навыкаў работы маладыя спецыялісты праходзяць стажыроўку.

Апафеозам усёй гэтай работы можна назваць прысвячэнне ў нафтаперапрацоўшчыкі маладых работнікаў. Яно праводзіцца штогод падчас прафесійнага свята.

— Наколькі мы памятаем, у вас вельмі шматгранная праграма «Моладзь» і работа з ветэранамі.

— Мне падабаецца, што вы аб'ядналі гэтыя дзве найважнейшыя сацыяльныя групы, звялі іх у адно пытанне. У калектыве шмат працавітых і добрасумленных людзей: тых, хто аддаў вытворчасці доўгія гады свайго жыцця, і тых, чыя працоўная біяграфія толькі пачынаецца. Самарэалізацыя маладога чалавека праходзіць не толькі падчас яго непасрэднага ўдзелу ў вырашэнні вытворчых задач, у грамадскім жыцці, якое віруе. Ёсць яшчэ такія паняцці, як патрыятычнае і маральнае выхаванне, і тут малады чалавек будзе пачуваць больш упэўнена, калі побач плячо старэйшага калегі, які не адно дзесяцігоддзе аддаў свайму калектыву, прайшоў вялікую прафесійную і жыццёвую школу. Мы імкнёмся зводзіць іх разам часцей, і не толькі на святы. Ветэранаў запрашаем на прысвячэнні ў прафесію, а маладых работнікаў — на провады на пенсію, урачыстыя ўшанаванні ветэранаў «НПЗ — гэта наш з табою лёс, гэта наша з табой біяграфія».

Нярэдка агульнымі святамі становяцца конкурсы прафесійнага майстэрства, агляды-конкурсы па рацыяналізацыі, іншыя конкурсы, якіх у нас шмат. Удзел у прэстыжным конкурсе разам са шматвопытнымі калегамі з'яўляецца сур'ёзным стымулам да далейшага павышэння прафесійнага ўзроўню. Асабліва калі яны падмацаваны падзякамі і ганаровымі граматамі кіраўніцтва ААТ «Мазырскі НПЗ», канцэрна «Белнафтахім», абласнога і раённага Саветаў дэпутатаў, выканаўчых камітэтаў.

— Ваш калектыў даўно стаў «спартыўнай дзяржавай» у дзяржаве.

— У гэтым вялікая заслуга КФК — калектыву фізічнай культуры. Пад яго кіраўніцтвам працуюць дзесяць спартыўных секцый. Менавіта КФК праводзіць круглагадовую міжцэхавую спартакіяду па 15 відах спорту, сярод якіх шахматы, армрэстлінг, гіравы спорт, стрытбол, мініфутбол, кулявая стральба, більярд, дартс... У ёй штогод бяруць удзел да 1500 работнікаў. Летась у заводскай спартакіядзе ўдзельнічала 18 цэхаў і структурных падраздзяленняў.

У нашым Палацы культуры адбываецца ўрачыстае падвядзенне вынікаў спартакіяды. Вызначаюцца найлепшыя спартсмены завода. За перыяд з 2004 года 26 чалавек удастоены ганаровага звання «Заслужаны спартсмен ААТ «Мазырскі НПЗ».

Зборныя каманды завода па разнастайных спартыўных дысцыплінах пастаянна прымаюць удзел у гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх спаборніцтвах. На працягу апошніх шаснаццаці гадоў зборная каманда завода займае першае агульнакаманднае месца ў раённай круглагадовай спартакіядзе па 20 відах спорту.

Летась правялі агульназаводскі Дзень здароўя і пяць цэхавых дзён здароўя.

І яшчэ. У мінулы год нашы супрацоўнікі ўпершыню здавалі нарматывы Дзяржаўнага фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Сабралася 85 ахвотных. 17 чалавек здалі спартыўныя нормы на высокі ўзровень, і ім прысвоена званне «Фізкультурнік Беларусі».

Зусім заканамерна сустрэць нашых атлетаў на міжнародных спаборніцтвах, дзе яны паказваюць цудоўныя вынікі. Аператар Сяргей Дарошка — чэмпіён свету, пераможца міжнародных спаборніцтваў гіравікоў, яго імя занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Аператар Сяргей Лазурэнка — чэмпіён свету і Еўропы па шматразовым жыме штангі, рэкардсмен Рэспублікі Беларусь. Высокія вынікі на спартыўных арэнах, у тым ліку міжнародных, паказваюць Сяргей Фіндзюкевіч, Вольга Рэзкая, Леанід Лаўранчук, Валерый Сысянкоў, Уладзімір Беляй, Вячаслаў Харашавін, Арцём Точка, Ігар Балін, Наталля Салдаценкава.

Чым яшчэ мы ганарымся? Зборная каманда завода па футболе летась стала чэмпіёнам Гомельскай вобласці, заваявала кубак. Жаночая зборная па валейболе заняла першыя месцы на галіновых абласных і рэспубліканскіх спартакіядах. А нашы гіравікі ў 2018 годзе занялі ганаровае другое месца сярод спартыўных калектываў краіны. З такімі асілкамі пад сілу любыя задачы.

Канцэрт ансамбля народнай песні «Жывіца» на роднай сцэне.

ЛЮБОЎ БЫВАЕ ЎЗАЕМНАЙ

Хочаце скласці ўяўленне пра работу той ці іншай установы культуры — пагартайце яе афішы, і неабавязкова толькі свежыя. Афішы Палаца культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода выклікаюць зайздрасць нават сталічнага жыхара.

Дырэктар Палаца культуры Аляксандр БУРЫ.

ДЗЯКУЮЧЫ ўвішнасці мясцовых менеджараў ад культуры месцічаў знаёмілі з высокім мастацтвам — крыху раней ці крыху пазней — Уладзімір Вінакур і яго тэатр пародый з праграмай «70 гадоў жартуючы», Беларускі Дзяржаўны акадэмічны ансамбль «Харошкі» з бенефісам Васіля Прыходзькі, Любоў Казарноўская, Стас П'еха і калектывы Палаца культуры: заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Сваякі», заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца «Алексіс» з шоу-праграмай «20 гадоў. Гармонія пачуццяў», заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь «Жывіца» з канцэртнай праграмай «Песня салаўіная», маладзёжны тэатр «Легіён» са спектаклем «Майстар і Маргарыта»... Каб не склалася ўражанне нейкай аднастайнасці мерапрыемстваў, скажам, што мадэльнае агенцтва ARTMODA адчыніла свае дзверы для тых, хто жадае навучыцца мадэльнаму майстэрству, — запрасіла прайсці курс навучання, а таксама ўзяць удзел у прафесійных фотасесіях і паказах мод.

Крута, праўда? **Дырэктару Палаца Аляксандру БУРАМУ** прыемна расказваць пра сапраўды шматгранную дзейнасць сваёй установы, бо расказаць ёсць што.

— Загінайце пальцы: сёння ў Палацы культуры працуюць 15 аматарскіх калектываў, у якіх з вялікай ахвотай займаецца больш за 800 чалавек. Сярод іх адразу тры заслужаныя калектывы, шэсць народных аматарскіх калектываў — ансамбль народнай музыкі і песні «Стрэчанне», ансамбль народнай песні «Залаты ўзрост», вакальны ансамбль «Чараўніцы», хор ветэранаў завода «Святло душы» і вакальная група «Авацыя». Як вы ўжо бачыце, мы сур'ёзна ставімся да пошукаў народных талентаў і стварэння магчымасці для іх развіцця.

А яшчэ — адразу два ўзорныя дзіцячыя калектывы: ансамбль танца «Фантазія» і вакальная студыя «Зорная краіна». Вы рана перасталі запісваць, бо ёсць у нас яшчэ маладзёжны вакальна-інструментальны ансамбль «Храм XXI», вакальная студыя народных спеваў, дзіцячая тэатральная студыя і новы дзіцячы праект «Тэрыторыя дзяцінства». І ўсё гэта працуе, жыццё вакол нашых народных талентаў віруе, сумаваць нікому не даем.

Важна, што фундамент творчых калектываў Палаца складаюць работнікі завода і члены іх сем'яў, ветэраны вытворчасці, а таксама творчая моладзь і жыхары мікрараёна.

Чатыры разы калектывам прысуджалася прэмія фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Падчас гала-канцэрту.

Без пэўнай статыстыкі не абысціся і далей: летась творчыя калектывы Палаца прынялі ўдзел адразу ў 23 рэспубліканскіх конкурсах і фестывалях і атрымалі 10 дыпломаў за першыя месцы, восем дыпломаў за другія месцы, дзевяць — за 3-я і 2 Гран-пры.

— Не таму, што вельмі люблю лічбы, — працягвае Аляксандр Міхайлавіч, — проста яны кажуць самі за сябе: за той жа час работнікі Палаца культуры падрыхтавалі і правялі больш за 500 мерапрыемстваў, якія наведала звыш 75 тысяч гараджан. Бачыце, якой арміі мы не далі сумаваць? Гараджане з задавальненнем прысутнічалі на ўшанаванні тых завадчан, хто сабраўся на заслужаны адпачынак, у святочных мерапрыемствах да прафесійнага свята, у фестывалі-конкурсе «Асенні акорд», святочнай гульні ў заводскім клубе інтэлек-туалаў «Што? Дзе? Калі?», фінале галіновага конкурсу «Новыя імёны Беларусі». Як вы разумееце, я магу расказваць не проста доўга, а вельмі доўга і — пераканаўча.

Палац культуры досыць часта лідзіруе па гадавых выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця Мазыршчыны, але справа нават не ў нашых перамогах. Галоўная перамога для нас — гарачыя авацыі нафтаперапрацоўшчыкаў і іншых мазыран. Мы адчуваем, што яны нас любяць. І адказваем ім сваім стараннем.

ЛЕЧАЦЬ ПА МЕТОДЫКАХ «ЗОРНАГА ГАРАДКА»

ЦІХІ куток беларускага Палесся. 25 кіламетраў ад прамысловага Мазыра. Велічны і гаючы сасновы бор падступае да маляўнічага берага паўнаводнай Прыпяці. Тут размясціўся санаторый «Сосны» Мазырскага нафтаперапрацоўчага гіганта. Завадчане і іх сем'і штогод на льготных умовах праходзяць у ім аздараўленне. Пуцёўкі ў санаторый выкупляюць і іншыя арганізацыі для аздараўлення сваіх работнікаў, і прыватныя асобы — жыхары нашай краіны, а таксама блізкага і далёкага замежжа: Расіі, Украіны, Малдовы, Ізраіля, Германіі, нават ЗША.

— Санаторый наш разлічаны на 136 месцаў, — расказвае яго **начальнік Вадзім МАРЦІНОВІЧ.** — Адпачывальнікам на выбар прапануюцца аднапакаёвыя аднамесныя і аднапакаёвыя двухмесныя нумары, двухпакаёвыя двухмесныя нумары катэгорый «люкс», «паўлюкс». У двары ў разліку на аматараў сямейнага адпачынку абсталяваная дзіцячая пляцоўка, а таксама ўніверсальная спартыўная пляцоўка са штучным пакрыццём для заняткаў тэнісам, валейболам, міні-футболам. І аўтастаянка — як жа без яе. Зручная лесвіца вядзе да ракі, дзе ўсталявана глядзельная пляцоўка. Непасрэдна да Прыпяці вядуць бакавыя спускі. Добраўпарадкаваны пляж, уладкаваныя мангальныя зоны са сталамі і навесамі ў лесапаркавай паласе таксама прыстасаваны для спакойнага адпачынку.

Лячэбны і два жылыя карпусы аб'яднаны паміж сабой пераходамі, што вельмі зручна ў халодную пару года: не трэба выходзіць на вуліцу, каб трапіць з жылых карпусоў у лячэбны для праходжання працэдур.

У санаторыі могуць паправіць сваё здароўе адпачывальнікі з захворваннямі органаў стрававання, апорна-рухальнага апарата, сардэчна-сасудзістай сістэмы, органаў дыхання, перыферычнай нервовай сістэмы, гінекалагічнымі захворваннямі. Прыём вядуць урачы першай катэгорыі — тэрапеўт, неўролаг, гінеколаг, фізіятэрапеўт. Працуе стаматалагічны кабінет з самым сучасным абсталяваннем і матэрыяламі.

Агульны від санаторыя «Сосны».

Асаблівы гонар санаторыя — свая прыродная мінеральная вада з дзвюх свідравін: хларыдна-натрыевая для ваннаў, паказаных пры шматлікіх захворваннях, і гідракарбанатна-хларыдна-натрыевая малой мінералізацыі з утрыманнем гумінавых кіслот, якія з'яўляюцца прыроднымі антыаксідантамі, яна ўжываецца для лячэння большай часткі захворванняў органаў стрававання. Вынікі даследавання спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пацвердзілі бальнеалагічную карысць і лячэбныя ўласцівасці нашай вады.

Фізіятэрапеўтычнае лячэнне прадстаўлена шырокім спектрам працэдур, у тым ліку гразелячэннем з выкарыстаннем гleістых сульфідных грязяў возера Сакі (Крым).

Пра новыя метады лячэння, што з'явіліся апошнім часам, мы папрасілі расказаць **начмеда Галіну ЯХІМОВІЧ.**

— З новаўвядзенняў санаторый прапануе сваім адпачывальнікам такі метад водалячэння, як пантавыя ванны. Перавагі ваннаў з пантаў алтайскага марала вядомыя ўжо на працягу некалькіх тысяч гадоў і актыўна выкарыстоўваюцца з мэтай амаладжэння ўсіх сістэм арганізма, павышэння ахоўных сіл, запаволення працэсаў старэння скуры, рэгуляцыі абмену рэчываў. Цяпер у санаторыі можна прайсці і агульную тэрапію магнітным полем на ўстаноўцы «Магнітатурбатрон». Доўгі час гэтыя апараты выкарыстоўваліся для трэніроўкі касманаўтаў і былі засакрэчаныя, серыйная іх вытворчасць пачалася параўнаўча нядаўна. Гэты метад дапамагае пры хваробах нервовай, дыхальнай, сардэчна-сасудзістай сістэм, апорна-рухальнага апарата.

У санаторыі можна прайсці і курс высокатонавай тэрапіі, якая ўяўляе сабой інавацыйны кірунак у развіцці электратэрапіі. Выкарыстанне зменнага электрычнага току высокай частаты выклікае агульнае аздараўленне і аднаўленне розных функцый органаў і сістэм арганізма.

Гаючая мінеральная вадзіца з уласнай крыніцы.

Пацыентам з пятачнымі шпорамі, плантавым фасцытам, локцевым эпікандзілітам у санаторыі могуць прапанаваць такую працэдуру, як ударна-хвалевая тэрапія. Таксама тут робяцца сухія вуглякіслыя ванны, транскраніяльная электрастымуляцыя, пнеўмакампрэсійная тэрапія, КВЧ-тэрапія, ручны і апаратны масаж, «кедравая бочка», СПА-працэдуры і многае-многае іншае.

Пяціразовае харчаванне адпачывальнікаў на падставе двухтыднёвага заказнога меню арганізавана ў сталоўцы. У санаторыі таксама знаходзяцца бар, бібліятэка, більярд, басейн, трэнажорная і танцавальна-канцэртная залы. Ёсць магчымасць займацца ёгай з інструктарам, да паслуг — бясплатны доступ у інтэрнэт, настольныя гульні.

Усіх ахвотных пазнаёміцца з санаторыем запрашаем 27—28 чэрвеня ў фан-зону ў раёне «Мінск-Арэны». Будзе магчымасць у рамках выстаўкі-прэзентацыі «Беларусь турыстычная» задаць пытанні нашаму прадстаўніку і пакаштаваць унікальную мінеральную ваду.

Публікацыю з ААТ «Мазырскі НПЗ» падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Андрэя САЗОНОВА і з архіва прадпрыемства.

УНП 400091131

Лаўрэаты прэміі ўрада

Гібкая рынкавая стратэгія

Аператар вытворча-харчовай прадукцыі Леанід САЧУК.

Прадстаўляем суразмоўцу. Артур Галімаў нарадзіўся ў Рызе. З бацькамі пераехаў у Беларусь. Школу закончыў у Гомелі, вышэйшую адукацыю атрымаў у Гомельскім гандлёва-эканамічным універсітэце. Па размеркаванні быў накіраваны ў Мінск і працяглы час працаваў спачатку ў спажывецкай кааперацыі, затым у прыватным бізнесе. У 2014 годзе прыйшоў у харчовую прамысловасць. Быў намеснікам дырэктара на Мінскім заводзе ігрыстых він, а ў снежні 2018 года ў рамках канцэрна «Белхарчпрам» вылучаны на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Мазырсоль».

Генеральны дырэктар Артур ГАЛІМАЎ.

У размове з журналістамі «Звязды» **генеральны дырэктар ААТ «Мазырсоль» Артур ГАЛІМАЎ** зазначыў:

— Наша прадпрыемства — складаны шматфункцыянальны комплекс, які забяспечвае краіну і блізкае замежжа высакаякаснай выварачнай соллю «Экстра». Прадпрыемства працуе са стапрацэнтнай загрузкай, і пакуль асаблівых рэзерваў для колькаснага росту ў нас няма. Праводзім мадэрнізацыю з мэтай павелічэння вытворчых магутнасцяў для асобных груп прадукцыі, удасканальваем саму вытворчасць. Робім змены ўнутры яе па асартыментных групах — пераходзім да прадукцыі, цана на якую на знешніх рынках вышэйшая: да больш высокамаржынальнай — ад якой больш высокая маржа, прыбытак. Пры гэтым інтарэсы насельніцтва застаюцца на першым плане, яго патрэбы ўнутры краіны мы задавальняем цалкам. Зараз прапрацоўваем варыянты новай, больш зручнай упакоўкі. Традыцыйная наша ўпакоўка — мяшэчак-падушка — вядомая ўсім. Сёння шукаем іншыя дызайнерскія рашэнні, бо ты яе адкрыў — а паставіць складана. Так што, магчыма, хутка навучым сваю падушку стаяць. Набылі новае фасавачнае абсталяванне.

Намеснік галоўнага інжынера — начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Пётр ГАПІЕНКА і апаратчык выпарвання Міхаіл ІОЎЧЫК у цэху № 2.

Вытворчыя паказчыкі нам даводзяцца з улікам сітуацыі, якая складваецца на знешніх рынках, бо сваю прадукцыю мы ў асноўным пастаўляем на экспарт, перш за ўсё ў Расійскую Федэрацыю. Таму, дарэчы, моцна залежым ад хістанняў расійскага рубля ў адносінах да долара.

— Тыя залежы карысных выкапняў, з якімі вы працуеце, яны пад Мазыром?

— Кіламетры за тры знаходзіцца разведанае радовішча, яго балансавыя запасы перавышаюць 400 мільёнаў тон, а магчымасці завода па штогадовай здабычы і перапрацоўцы — 480 тысяч тон. Летась мы вырабілі і прадалі 515 тысяч тон прадукцыі. Так што хопіць надоўга. Плюс у ваколіцах, як мы разумеем, ёсць неразведаныя запасы. Так што праблем з забеспячэннем краіны і бліжэйшых суседзяў высакаякаснай выварачнай соллю не будзе. Тым больш што і «Беларуськалій» здабывае соль, але каменную.

— Канкурэнцыю з яго боку адчуваеце?

— Не, гэта ўсё ж іншая соль. Пры выкарыстанні ў хатняй гаспадарцы вялікай розніцы няма. Іншая рэч — вытворчасць. Павараная соль адрозніваецца ад каменнай сваёй чысцінёй, і прамысловыя прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць соль у сваіх вытворчых працэсах — у прыватнасці, для гатавання ежы, — часцей аддаюць перавагу паваранай. Так што канкурэнцыі мы не адчуваем, у кожнага, можна сказаць, свае задачы.

Крыху ўплывае тое, што насельніцтва пачало менш займацца нарыхтоўкай харчовых запасаў дома — закаткамі і падобным. Усё больш у хаду паўфабрыкаты, наведванне кавярняў ці нават рэстаранаў — гатовай кухні. Больш актыўна выкарыстоўваюцца прадукты, дзе соль ужо прысутнічае.

Але расце спажыванне солі прамысловымі прадпрыемствамі, асабліва ў хімічнай прамысловасці. А калі расце попыт, то расце і прапанова — пачынаюць будавацца заводы ў Расійскай Федэрацыі, у тым ліку ў суседняй Калінінградскай вобласці, Новамаскоўскі завод у Тульскай вобласці. Вось чаму нам неабходна развіваць сваю вытворчасць. Калі раней было дастаткова выраблять соль і затарваць у біг-бэгі і мяхі, то цяпер толькі гэтым рынак не ўтрымаць.

Усе паказчыкі, якія нам даводзяцца, не простыя, кожны па-свойму складаны. Экспарт не ва ўсім залежыць ад нас, і гэта вымушае быць больш гібкімі. Тут нельга прыбраць руку з пульсу ні на секунду, бо тады паказчык, даведзены ў доларах ЗША, можам не пацягнуць. Як і паказчык фінансавай эфектыўнасці — яго таксама трэба пастаянна кантраляваць, асабліва цяпер, з улікам росту кошту энерга-рэсурсаў. Працэс вытворчасці выварачнай солі сам па сабе энергаёмісты, а мы нядаўна перайшлі з мазуту на газ, і затраты на энергетыку ўзраслі яшчэ больш.

На 2019 год запланаваны вялікі аб'ём арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў па ўдасканаленні вытворчасці, на гэтыя мэты накіроўваюцца значныя капіталаўкладанні. Прыкладаў такога ўдасканалення вытворчасці за апошні час шмат. Пабудавалі новую расолаздабывальную свідравіну. Праводзім мадэрнізацыю сушыльнага аддзялення. На гэты год запланавана ўстаноўка дадатковай градзірні для ахалоджвання вады. Дзве новыя ўжо паставілі.

Яшчэ адзін перадавы праект ажыццяўляем сумесна з РУП «БЕЛТЭІ» (цеплаэнергетычным інстытутам). Праект унікальны, з арыенціровачным коштам каля пяці мільёнаў долараў. Пасля ўвядзення ў строй дзеючых па году прынясе па 880 тысяч долараў эканоміі.Так што тэхналогія працягвае ўдасканальвацца, як і асартыментная палітыка.

Прынялі рашэнне на працягу бліжэйшых двух гадоў яшчэ больш павялічыць вытворчасць таблеціраванай солі для ўмякчэння вады ў сістэмах яе ачысткі — да 200 тысяч тон штогод. Попыт расце, наша таблетка мае рэпутацыю прадукту высокай якасці. Набываем новыя прэсы для таблеціравання, часткова ўжо ўстанавілі. Іх магутнасць вышэйшая, чым у дзеючага абсталявання, амаль у дзесяць разоў.

— Суадносіны экспартнага паказчыка і паказчыка ўнутранага рынка засталіся ранейшымі?

— Яны змяніліся. Цяпер 85 працэнтаў прадукцыі пастаўляецца на знешнія рынкі, а 15 — на ўнутраны. Асноўным нашым партнёрам на знешніх рынках з'яўляецца, як я ўжо казаў, Расійская Федэрацыя. На другім месцы Украіна. Моцныя ў нас пазіцыі ў Прыбалтыцы, хоць у іх парты лёгка даходзіць еўрапейская соль — дацкая. А яшчэ — у Казахстане, Кыргызстане, Польшчы. Завяваны радыус экспартных паставак мы стараемся па магчымасці пашыраць.

— Калі ласка, вернемся да размовы пра асартымент. Пастаяннай праверкі патрабуе якасць прадукцыі?

— Канешне. Мы ўвесь час працуем з вытворчым персаналам, таму што абслугоўванне тэхналагічнага абсталявання павінна быць гарантавана граматнае і правільнае. Я пастаянна бываю ў кожным структурным падраздзяленні, уважліва слухаю людзей і даводжу пазіцыю кіраўніцтва, нашу рынкавую стратэгію і нават тактыку. Людзі павінны разумець любыя нашы крокі, адчуваць сябе адной камандай. У калектыве кожны трэці мае вышэйшую адукацыю, астатнія — прафесійна-тэхнічную ці спецыяльную, таму мы размаўляем на адной мове. Адчуванне пляча калектыву дазволіла ўкараніць так званы рызыкаарыентаваны падыход, гібкую рынкавую стратэгію.

Мы эканамічна, фінансава моцнае прадпрыемства, працаваць з намі хочуць усе. З'яўляемся надзейным партнёрам для любога дзелавога партнёра — як пастаўшчыка, так і спажыўца.

«МОЙ КАЛЕКТЫЎ — МАЯ КРЭПАСЦЬ»

Сваё інтэрв'ю **Анжэла КРЫСЦЯ, намеснік дырэктара па ідэалогіі і сацыяльным развіцці**, дала ў музейным пакоі, цудоўна аформленым і вельмі багата абстаўленым.

— Музей ствараўся да 25-годдзя прадпрыемства, і ідэя заключалася ў тым, каб захаваць той след, які кожны работнік прадпрыемства пакінуў ці пакіне пасля сябе ў біяграфіі калектыву. Адзін стаў пераможцам конкурсу прафесійнага майстэрства, другі занесены ў Кнігу працоўнай славы і гэтак далей.

Экспазіцыя пачыналася з чорна-белых здымкаў, стэнд назвалі «Яны былі першымі». Тут прадстаўлены пачынальнікі новай для Мазыршчыны прафесіі, некаторыя з якіх да гэтага часу працягваюць працаваць на прадпрыемстве. Музей з'яўляецца сапраўдным пакоем працоўнай славы, мы прыводзім сюды новых работнікаў, каб яны разумелі, у якую сям'ю ўліваюцца.

Мы сапраўды адчуваем сябе адзіным цэлым, а свой калектыў лічым сваёй крэпасцю. У нас вельмі моцныя карпаратыўныя традыцыі, асабліва ў сэнсе пераймальнасці і работы з моладдзю. Працуе савет маладых работнікаў, які курыруе і дзейнасць валанцёрскага атрада, мастацкую самадзейнасць, і працуе плячо ў плячо з пярвічкай БРСМ, жаночым саветам, воінамі-інтэрнацыяналістамі. Сем нашых хлопцаў прайшлі Афганістан, адзін адразу пасля вяртання трапіў з агню ды ў полымя — на ліквідацыю аварыі на ЧАЭС. Гэта мантажнік рамонтна-механічнага цэха Васіль Кажадуб. Прозвішча ў яго адпаведнае, і справы багатырскія. Ён прадстаўнік адной з 53 працоўных дынастый — іх колькасць гаворыць сама за сябе. Ёсць дынастыі, у якіх агульны працоўны стаж больш за 290 гадоў. І гэта з улікам таго, што нам усяго трыццаць сем.

Як бачыце, у экспазіцыі шмат каляровых здымкаў з жыцця калектыву мастацкай самадзейнасці, які налічвае 59 чалавек пастаяннага саставу. І нікога не трэба заганяць на сцэну сілком. Спрыяе тое, што дзве гадзіны на тыдзень чалавек можа займацца грамадскай работай і яму захоўваецца сярэдні заробак. Таму выезды на канцэрты ў нашы партнёрскія калектывы не звязаны з нейкімі складанасцямі. Папулярнасцю карыстаюцца нашы вакальна-інструментальны ансамбль «ХардСол» і вакальная група «Аквамарын», танцавальны калектыў «FUSION», група барабаншчыкаў «Спаркс» — іх прыгожыя здымкі таксама ў экспазіцыі.

У нас проста цудоўныя спартыўныя традыцыі — звярніце ўвагу на гэтую вялікую шафу са шматлікімі кубкамі і прызамі. Мы выходзілі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу на пастаноўку фізкультурна-масавай і аздараўленчай работы і лідзіравалі сярод калектываў, у якіх працуе больш за тысячу работнікаў. Нашы валейбалісты абыгралі нават каманду МНПЗ.

Моладзь у нас ініцыятыўная, крэатыўная, і любыя яе пачынанні падтрымліваюцца кіраўніцтвам. Аказваецца ўсялякае садзейнічанне, каб яны маглі рэалізаваць свае задумы і выявіць сябе, сваю індывідуальнасць. Валанцёрскі атрад «Салявік» на працягу 14 гадоў адчувальна дапамагае цэнтру карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў, і гэта не проста разавыя акцыі.

Праводзяцца разнастайныя конкурсы — «Рыцар года», «Мая сям'я — мая крэпасць», «Саляная каралева» (вось яна на фота, сапраўдная прыгажуня, начальнік аддзела продажу), «Мы — адзінае цэлае». Такія конкурсы вельмі зближаюць, — падкрэслівае Анжэла Анатолеўна. — І ёсць традыцыя — перад пачаткам навучальнага года выязджаем аўтобусамі на сямейны турыстычны злёт. Прыкладна 450 чалавек разам з дзецьмі, сем'ямі — палова калектыву. А яшчэ маладзёжныя велапрабегі. Адным словам, кожны выхадны нечым займаемся. Разам нам цікава. Сродкі, якія збіраем на сваіх спартыўных святах, перадаём цэнтру карэкцыйнага развіцця дзяцей-інвалідаў.

У ліку нашых сацыяльных аб'ектаў — медпункт, які дазваляе не хадзіць у раённую паліклініку, бо ўсе віды фізіятэрапеўтычных паслуг і іншыя працэдуры аказваюцца тут. Мы ўсіх застрахавалі, і ў рамках дагавора страхавання нашы людзі атрымалі магчымасць праходжання «вузкіх» спецыялістаў і абследаванняў без чаргі. У заводскай сталоўцы кормяць як у рэстаране, а ў магазіне-кулінарыі можна купіць не толькі самы смачны ў Мазыры хлеб і разнастайныя кандытарскія вырабы — іх выпякае наш кандытар, — але і заўсёды свежую малочную, мясную і рыбную прадукцыю.

Маем адзін з найлепшых у Мазыры спартыўных комплексаў, у якім займаюцца нашы работнікі і члены іх сем'яў. Аплата наведвання секцый — сімвалічная. Ёсць дванацаціпавярховы інтэрнат з асобнымі камфортнымі блокамі для сямейных пар і месцамі для халасцякоў. У выніку жыллём забяспечаны ўсе, у чарзе на блок — толькі адна сям'я.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают: – заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка; – копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица; – доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица
При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов
Условия проведения аукциона в части продажи права заключения договоров аренды земельный участков
Существует возможность подключения к городским сетям с условиями. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка. Заключить с Лидским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня подписания протокола аукциона, государственную регистрацию прав ограничений (обременений) прав на земельный участок. Получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет. Приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта. Завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. За нарушение сроков строительства взимается пеня в размере из расчета – ставки рефинансирования Национального банка (годовых) от стоимости строительства за каждый день просрочки
К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: – заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; – юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; – копии учредительных документов – индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; – юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе). При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: – представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; – физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; – представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНАЯ ГІПЕРТАНІЯ?

Мы прызвычаіліся лічыць, што гіпертанія — праблема людзей пажылога ўзросту. Але гэта не так: хвароба імкліва маладзее. Мы мала рухаемся, ужываем тлустую ежу, наша жыццё напоўнена стрэсамі і хваляваннямі. Пабочны эфект сучаснага ладу жыцця — праблемы з сэрцам і сасудамі. Яны проста не спраўляюцца з тым грузам, які мы штодзень на іх ускладаем. Чым небяспечны высокі ціск і чаму ён павышаецца, калі варта пачынаць яго кантраляваць і як з ім «ужыцца», расказала загадчык аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі Мінска) Арына БАСАВА.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Арына Аляксандраўна, з якога ўзросту варта пачынаць кантраляваць свой артэрыяльны ціск?

— Адзінкавыя вымярэнні павінны быць з дзяцінства. А вось ужо з 16 гадоў варта ўдзяліць гэтаму больш сур'ёзную ўвагу, бо лічыцца што сардэчна-сасудзістая сістэма ў гэтым узросце практычна не адрозніваецца па функцыянаванні ад дарослай. Калі лічбы артэрыяльнага ціску ў норме, то дастаткова раз на тры-пяць гадоў іх кантраляваць. Калі лічбы павышаныя, то згодна з апошнімі еўрапейскімі рэкамендацыямі, абавязкова варта сачыць за імі, у тым ліку ў хатніх умовах. Зразумела, пры штогадовым праходжанні дыспансерызацыі ў паліклініцы кожны доктар — і ўчастковы тэрапеўт, і доктар вузкай спецыялізацыі — павінен змерыць пацыенту ціск. І калі раней лічбы былі ў норме, а спецыяліст раптам выявіў іх павышэнне, такі пацыент адразу накіроўваецца на кансультацыю да ўчастковага тэрапеўта для верыфікацыі (пацвярджэння ці абвяржэння. — **Аўт.**) дыягназу і далейшай дыягностыкі.

— З 40 гадоў узровень ціску трэба вымяраць кожны дзень?

— Усё залежыць ад таго, якія лічбы мы маем, і тут не важна, 17 вам гадоў ці 60. Лічбы нормы артэрыяльнага ціску для ўсіх аднолькавыя. У канцы 2018 года былі распаўсюджаны новыя еўрапейскія рэкамендацыі, згодна з якімі сісталічны ціск павінен быць менш за 140, дыясталічны — менш за 90, і набліжацца да 120/80, калі пацыент гэта добра пераносіць.

Што датычыцца ўзросту, то не зусім правільна казаць, што пасля 40 гадоў варта кантраляваць ціск штодзень. Сёння артэрыяльная гіпертэнзія маладзее, таму насцярожанасць трэба праяўляць у любым узросце. Больш лаяльныя адносіны да лічбаў у сталых людзей, якім за 80 гадоў. Калі такія пацыенты здавальняюча адчуваюць сябе з ціскам 150—155/90, мы стараемся істотна яго не паніжаць. Бо карэкцыя ў такім узросце павышае рызыку захворванняў галаўнога мозга, да таго ж зніжаецца функцыя нырак. Пацыенты, як правіла, пачынаюць дрэнна сябе адчуваць, бо ў іх хутчэй за ўсё ўжо маецца атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга, а гіпатэнзіўныя лекавыя прэпараты прывядуць да пагаршэння кровазабеспячэння галаўнога мозга і нырак. Але ціск не павінен зашкальваць — быць вышэй за 150—155/90.

— Чаму павышаецца артэрыяльны ціск?

— Прычын гэтаму шмат. Часцей за ўсё — спадчынны фактар. Ёсць і другасныя артэрыяльныя гіпертэнзіі, якія развіваюцца ў выніку захворванняў іншых органаў — эндакрыннай паталогіі, хвароб галаўнога мозга, нырак. Артэрыяльная гіпертэнзія можа развівацца на фоне прыёму гарманальных прэпаратаў, вялікіх доз нестэроідных супрацьзапаленчых сродкаў. Уплывае і наш лад жыцця. І тое, што мы ўпускаем момант пачатку лячэння. Даследаванне Steps выявіла, што лад жыцця ў вялікай частцы беларусаў далёкі ад ідэальнага. Шырока распаўсюджана курэнне, ужыванне алкаголю. Мы вельмі мала ядзім гародніны і фруктаў. Шмат людзей — каля 25 % — пакутуе на атлусценне, у 60 % нашага насельніцтва лішняя маса цела. Павышаны артэрыяльны ціск мае 44—45 % беларусаў. Людзі жывуць з гэтымі фактарамі рызыкі шмат гадоў. І прыходзяць да ўрача з багажом шкодных звычак і шматгадовым стажам павышанага артэрыяльнага ціску — нават 10-гадовым. У такім выпадку вярнуць ранейшы стан сардэчна-сасудзістай сістэмы ўжо немагчыма. І задача кардыёлага ці тэрапеўта — не даць прагрэсіраваць хваробе, замарудзіць развіццё ўскладненняў і дзесьці нават павярнуць час назад — правесці прафілактыку паражэнняў органаў-мішэняў. Задача няпростая, паколькі пацыент мае шматгадовы стаж павышанага ціску.

— У чым небяспека высокага ціску?

— Небяспека не ў самім высокім ціску, а ва ўскладненнях. Найперш гэта павелічэнне рызыкі вострых сардэчна-сасудзістых катастроф — інфарктаў, інсультаў. Як ні сумна, але захваральнасць і смяротнасць ад хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы ў нашай краіне знаходзіцца на першым месцы. Трэба апасацца і паражэння органаў-мішэняў. Гэта тыя органы і сістэмы, якія маюць шырокую капілярную сетку — галаўны мозг, сятчатка вока, сэрца, каранарныя сасуды, перыферычнае кровазабеспячэнне канечнасцяў і ныркі. Яны першымі трымаюць удар, што праяўляецца ў выглядзе інсультаў, інфарктаў, кровазліцця ў сятчатку вока, прагрэсіравання хранічнай ныркавай недастаткоўсасці, аблітэрыруючага атэрасклерозу сасудаў ніжніх канечнасцяў. Гэта самыя грозныя ўскладненні.

— Прэпараты ад артэрыяльнай гіпертэнзіі трэба прымаць усё жыццё?

— Існуе ўсяго пяць груп прэпаратаў ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, іншая справа, што назваў, варыяцый у іх прыёме, схем лячэння вельмі шмат. Але ёсць адзін вельмі важны прынцып у тэрапіі артэрыяльнай гіпертэнзіі — пастаянны прыём. Канешне, пацыент, асабліва калі яму ўсяго 40 гадоў, гэта адразу ўспрымае з насцярожанасцю. Але па-іншаму ніяк — прэпарат, доза, калі трэба — камбінацыя заўсёды падбіраюцца індывідуальна, прымаюцца доўга, пад пастаянным кантролем урача.

— А калі ціск нармалізаваўся, можна перастаць піць лекі?

— Не. Мы ўсё роўна прымаем свой прэпарат у той жа дазіроўцы. Трэба разумець, што менавіта на фоне прыёму лекаў мы дасягнулі мэтавых лічбаў ціску. І толькі пры ўмове рэгулярнага прыёму мы замаруджваем рызыку ўскладненняў і паражэнне органаў-мішэняў. Няправільна прымаць гіпатэнзіўныя прэпараты сітуацыйна, ад выпадку да выпадку, часта мяняць іх без прызначэння па парадзе знаёмых. Кожны лекавы сродак мае свае супрацьпаказанні, лячэбныя дазіроўкі і падбіраецца індывідуальна. Калі пацыент прымае прэпарат сітуацыйна, у яго нестабільныя лічбы артэрыяльнага ціску на працягу дня, могуць здарацца эпізоды гіпертанічных крызаў. У такіх хворых пачашчаецца колькасць шпіталізацый, выклікаў хуткай дапамогі. І зразумела, мэта, да якой мы ідзём, не будзе дасягнута: не адбываецца лячэння тых органаў, на якія ўплывае артэрыяльная гіпертэнзія. Сітуацыйны прыём не падыходзіць ні ў якім разе.

— Часта даводзіцца чуць, што прэпарат перастаў дзейнічаць. Такое сапраўды бывае?

— Так званае «выслізгванне доз» бывае не часта. У такога пацыента варта сабраць падрабязны анамнез: як ён прымае прэпарат, наколькі рэгулярна, ці ў той дозе, якой прызначана. Калі прэпарат сапраўды не дае патрэбнага эфекту, спрабуем павялічыць дозу да максімальна дазволенай, калі і гэта не дапамагае, тады замяняем на іншы. Зараз часта прызначаюцца камбінаваныя лекі — 2-3 прэпараты ў адной таблетцы. Гэта павялічвае эфектыўнасць лячэння, пацыенту больш зручна замест 2-3 таблетак прымаць адну адзін раз на дзень.

— Як хутка пасля пачатку лячэння ціск павінен нармалізавацца?

— Не трэба імкнуцца дасягнуць мэтавых лічбаў з першай таблеткі. Ціск зніжаецца паступова — на працягу дзесьці трох месяцаў. Некаторым патрабуецца крыху менш часу, некаторым — крыху больш, у цэлым за гэты перыяд звычайна ўдаецца падабраць эфектыўную індывідуальную тэрапію. Варта памятаць, што пры лячэнні артэрыяльнай гіпертэнзіі першыя сустрэчы з доктарам будуць частымі, сам урач вызначае, калі пацыент наступны раз павінен прыйсці для кантролю.

— Анамальная спякота для людзей з гіпертаніяй небяспечная ці, наадварот, гэта для іх спрыяльнае надвор'е?

— Спякоту гіпертонікі пераносяць цяжка. У часткі пацыентаў на фоне такога надвор'я паніжаецца ціск. Ім нават даводзіцца памяншаць дозу гіпатэнзіўных прэпаратаў, бо яны дрэнна сябе адчуваюць з паніжанымі лічбамі. У спякоту гіпертонікам абавязкова трэба насіць галаўны ўбор, заўсёды мець з сабой бутэлечку вады, бо ўзмацняецца потааддзяленне, а таксама прэпараты для купіравання гіпертанічных крызаў. І старацца не выходзіць на вуліцу ў самую спёку.

Асцярожна, лета!

Як абараніць дзяцей ад траўмаў пры катанні на веласіпедах і самакатах

Летам вывіхі, расцяжэнні і пераломы здараюцца ў дзяцей ледзь не часцей, чым у зімовы галалёд. Адбываецца гэта таму, што летам дзеці больш актыўныя і свабодныя. А яшчэ таму, што цёплая пара — час роваравў, электрасамакатаў, гіраскутараў і іншых сродкаў перамяшчэння.

— У час летніх канікул практычна штодзень у нашу паліклініку звяртаюцца з траўмамі, атрыманымі падчас катання на такіх сродках, — кажа **загадчык хірургічнага аддзялення дзіцячай паліклінікі № 2 Гродна Валерый ПЫЖ**. — Тым больш што цяпер гэта ўсё можна ўзяць напракат. Дзеці не выконваюць тэхніку бяспекі, катаюцца без адпаведнай экіпіроўкі: шлемаў, накаленнікаў і налакотнікаў.

Паводле слоў спецыяліста, у выніку падзенняў дзеці часцей за ўсё атрымліваюць закрытыя чэрапна-мазгавыя траўмы (страсенні мазгоў), удараныя раны, ранкі твару. Нярэдкія і траўмы канечнасцяў — пераломы рук, вялікія скальпаваныя раны каленных і локцевых суставаў, якія дрэнна загойваюцца і могуць прыводзіць да ўтварэння рубцоў.

— Першая дапамога бацькоў ці дарослых у такіх выпадках — вызваліць рану ад пабочных прадметаў, прамыць праточнай вадой, можна з мылам, накласці чыстую павязку і звярнуцца да доктара, — нагадвае Валерый Пыж.

Ёсць і спецыфічныя траўмы, якія дзеці атрымліваюць з-за бесклапотнасці саміх дарослых. Нярэдка 3—6-гадовых малых садзяць на багажнік веласіпеда. Падчас руху нага трапляе ў кола — і дзіця атрымлівае пералом шчыкалаткі, глыбокія скальпаваныя раны, якія марудна паддаюцца лячэнню і пакідаюць рубцы.

— Дарослым трэба памятаць аб мерах бяспекі: маленькіх дзяцей лепш не перавозіць на багажніку. У адваротным выпадку ровар павінен быць абсталяваны ахоўным кажухом, павінна быць велакрэсла для перавозкі дзяцей, — папярэджвае спецыяліст.

Дарэчы, на базе дзіцячай паліклінікі № 2 Гродна працуе падрыхтоўчы цэнтр для бацькоў па навучанні правілам бяспекі. На лекцыях, якія суправаджаюцца відэаматэрыяламі, спецыялісты расказваюць і паказваюць, як арганізаваць прастору ў кватэры, каб яна была цалкам бяспечнай для самых маленькіх, як зберагчы ад траўмаў больш дарослых дзяцей і інш. Трапіць на заняткі можна, папярэдне запісаўшыся па гарадскім тэлефоне 52-14-10.

Спытайце пра радзіннае

Чаму нельга раскідаць валасы?

«Нядаўна прыехалі да бабулі ў вёску, дачка стала расчэсвацца, а валасы з расчоскі выкінула ў смецца. Бабуля, бачачы гэта, пачала на яе сварыцца: нельга так рабіць, а то галава балець будзе. Мы толькі пасмяяліся: маўляў, прымхі ўсё гэта. А потым я падумала: але ж аднекуль гэта забарона ўзялася. Можа, вы падкажаце, з чым яна звязана?» — піша Тамара Пятроўна П. з Мінска.

Валасы сталі аб'ектам пільнай увагі ў абрадавай практыцы беларусаў і іншых славянскіх народаў, а таксама апынуліся тым рытуальным атрыбутам, вакол якога сфарміравалася мноства разнастайных забаронаў і прадпісанняў. Відавочна, што нават у сітуацыях, далёкіх ад абрадава акцэнтаваных, у стаўленні да валасоў захоўвалася пэўная сакральнасць. Напрыклад, традыцыя забараняла расчэсваць валасы на Дабравешчанне (прыгадайце: «На Дабравешчанне птушка гнязда не ўе, дзеўка касы не пляце»), але поле яе ўздзеяння распасціраецца і на штодзённасць: калі ў расчосцы засталіся валасы, выкідваць іх куды папала строга забаранялася. Яны маглі патрапіць у рукі нядобрасумленных людзей, і тыя маглі лёгка аказаць уздзеянне на іх гаспадара. Каб пасварыць маладых, досыць узяць некалькі валасінак і выканаць з імі некаторыя магічныя дзеянні. Таму неабходна сачыць за тым, каб валасы не трапілі ў чужыя рукі.

Да таго ж, дрэнную службу маглі саслужыць былому гаспадару валасоў птушкі. Увесну яны збіраюць прыродны матэрыял для ўмацавання гнёздаў. Адным з найлепшых канструкцыйных матэрыялаў маглі быць доўгія валасы. Уся бяда ў тым, што птушкі ўюць свае гнёзды, як правіла, на дрэвах, якія размешчаны ў геапатагенных зонах са знакам мінус. Праз уздзеянне сіл прыроды на асобны волас здзяйсняецца адпаведны ўплыў і на яго гаспадара. Таму ў асяроддзі беларусаў асабліва асцерагаліся раскідаць валасы дзе папала, каб не справакаваць з'яўленне каўтуна — даволі цяжкага захворвання, якое характарызуецца скручваннем і збіваннем валасоў «на валёнак» (вельмі падобны на лямец), расчасаць якія немагчыма, акрамя таго змена структуры валасоў суправаджаецца галаўнымі болямі. У ранейшыя часы, калі ў кожнай хаце былі печкі, валасы спальвалі, а там, дзе былі рэкі, пускалі на ваду, «каб валасы раслі хутка і густа». Калісьці сярод беларусаў існавала традыцыя састрыжаныя валасы збіраць і захоўваць на працягу жыцця, каб «узяць» іх на «той» свет і «адчытацца за кожную валасінку»: пасля смерці іх укладвалі ў падушку і клалі пад галаву нябожчыка.

У традыцыйнай культуры ўсходніх славян валасы заўсёды сімвалізавалі мноства, а таму багацце і шчасце. Так, на Каляды гаспадару жадалі гэтулькі цялят, авечак у статку, вазоў жыта і да т. п. колькі валасоў на галаве. У славянскіх народаў у адносінах да валасоў сфарміраваўся шэраг іншых рэгламентацый, напрыклад, каб валасы хутка адрасталі, раілі стрыгчыся, калі Месяц прыбывае, так і валасы будуць «расці-прыбываць». Калі валасы пастаянна стрыгчы на ўбываючым Месяцы або калі яго няма ўвогуле (Межы), яны перастануць расці зусім.

Дзіцяці да года забаранялася стрыгчы валасы (каб не «адрэзаць мову», г. зн. не спыніць яго разумовае развіццё і здольнасць размаўляць). Першае рытуальнае астрыганне — застрыжкі — выконвалі роўна ў год. Гэтым абрадавым дзеяннем імкнуліся падкрэсліць завяршэнне першага пераходнага перыяду ў жыцці чалавека.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Каб помнілі

«ІВАНУ ТАДЫ ШОЎ ДВАЦЦАТЫ...»

У нашай сям'і заўжды любілі слухаць успаміны: прабабкі Вольгі — пра жыццё ў пана Вайніловіча, бабулі Таццяны — пра вайну з немцамі...
Нешта з пачутага мая мама запісвала, так што мне засталося толькі надрукаваць і даслаць у «Звязду», якую ў нас чытаюць многія.

...Першыя дні вайны жыхарам вёскі Браткава запомніліся паветраным боем: фашысцкія сцярвятнікі з чорнымі крыжамі на крылах дагналі тады невялікі савецкі самалёт з эмблемай чырвонага крыжа і збілі. Палаючы, ён «увайшоў» у зямлю на ўскрайку вёскі. Людзі кінуліся туды, але зрабіць нічога не маглі... Хіба потым — сабраць астанкі тых, хто загінуў, і пахаваць. Каго — так і невядома.

Фронт між тым адыходзіў на ўсход, і ледзь не кожны дзень прыносіў кепскія навіны. Калгасных жывёл разабралі жыхары, а 28 чэрвеня ў вёсцы ўжо былі немцы. Яны сагналі людзей на сярэдзіну вуліцы і аб'явілі, што сяляне вызвалены ад улады камуністаў і цяпер павінны дапамагаць вялікай Германіі, што ў вёсцы назначаецца староста, што ягонае слова — закон, за невыкананне якога — расстрэл і не іначай.

Але ж браткаўцы не скарыліся немцам — у службу да іх ніхто не пайшоў. У лесе за вёскай Заракаўцы сталі збірацца камуністы, кіраўнікі мясцовых арганізацый, якія хаваліся ад фашысцкай расправы, тыя, хто не хацеў мірыцца з «новым парадкам». Там жа апынуўся Іван — старэйшы сын майго прадзеда Івана Мікітавіча Місевіча, які ў сваёй хаце стаў пячы партызанам хлеб.

...Жнівень 41-га. У вёску на падводах прыехалі паліцаі. Людзі, пазамыкаўшы хаты, кінуліся хавацца. У сваю хованку — лаз у зямлі, зверху закрыты дошкамі і дзёрнам, з якога нават рос куст — кінулася і сям'я прадзеда.

Немцы з паліцаямі пайшлі па хатах. Яны збівалі замкі, усё, што хацелі, складвалі ў мяхі, грузілі на падводы, і ўрэшце з'ехалі. Вяскоўцы, вярнуўшыся дамоў, гаравалі аб стратах. Не было іх хіба ў сям'і Місевічаў (нават хлеб партызанскі ў печы застаўся). А ўсё таму, што ўцякаючы, дамачадцы не паспелі зачыніць вокны. «А калі расчыненыя, то ў хаце браць нама чаго», — падумалі, відаць, паліцаі і, на шчасце, туды не зайшлі.

А вось нямецкая мотапяхотная часць у канцы верасня ў вёсцы спынялася. Афіцэры размеркавалі салдат на начлег, выставілі ахову. Пры гэтым мясцовыя падлеткі зглядзелі, што зброю ваякі злажылі ў адной з камор. Там было невялічкае акенца. Праз яго самы шчуплы з кампаніі хлапчукоў залез у памяшканне і стаў выкідваць аўтаматы.

Узялі іх столькі, колькі маглі панесці, схавалі ў былым калгасным гумне, каб пазней перадаць партызанам.

Раніцай афіцэры пастроілі салдат, каб рухацца далей, у бок фронту і, вядома ж, заўважылі, што адно з падраздзяленняў... абязброена. Шукаць вінаватых, на шчасце, не было калі: немцы вельмі спяшаліся. А малодшы сын прадзеда — Сеня Місевіч у той вечар прыйшоў дадому цішком і позна. На ўсе папрокі маці адказваў, што брату ды іншым партызанам не хапае зброі.

І гэта была не адна яго вылазка.

Жыхары вёсак збіралі для партызан хто што мог. Прыпасы хавалі ў лясным тайніку. А вось хлеб...

Каб мець муку, Іван Місевіч зрабіў жорны (з пачаткам вайны калгасны млын не працаваў). Яго жонка са старэйшай дачкой мясілі цеста. Гэта можна было рабіць цішком, неўпрыкмет для вёскі, а вось пячы...

Пах хлеба, які ішоў праз комін і вокны, утаіць было немагчыма. Суседзі ўсё чулі, усё разумелі, але, дзякуй богу, маўчалі.

...Яшчэ адзін дзень. Раніцай другога кастрычніка па полі, дзе вяскоўцы дакопвалі бульбу, пранёсся коннік — папярэдзіў, што ідуць карнікі. Місевічы пабеглі ў сваю схованку. Туды ж забралі суседскую дзяўчынку Маню, якая на падворку гуляла з іх малодшай Таняй. Усе разам нейкі час прасядзелі, потым Іван Мікітавіч адсунуў накрыўку, каб паглядзець, што дзе робіцца. Ён толькі падняў галаву і ўбачыў, што на іх падворку стаіць немец і... махае яму рукой: маўляў, ідзі сюды.

Дзядуля асеў у яму і дрыжачым голасам паведаміў сваім, што фашыст яго заўважыў і што яму трэба ісці здавацца... Аднаму. Ён стаў з усімі адвітацца, бо разумеў, што яго, як бацьку партызана, ніхто не пашкадуе.

Дзеці, вядома ж, пачалі плакаць. Бабуля казала, што лепей пойдзе яна, бо мужчына цяпер патрэбен болей... Дзядуля яе не пусціў. Напружанне было невыноснае, бо абое думалі, як ратаваць дзяцей...

Яны ўжо развіталіся і з жыццём, і адно з адным, калі гаспадар зноў выглянуў на вуліцу, дзе... немцаў ужо не было: не знайшоўшы нікога і нічога, яны пакінулі вёску. А перад гэтым проста махалі адзін аднаму, клічучы на збор...

У тую ж ноч дамоў прабраўся Іван. Ён нічога не расказваў аб жыцці ў партызанах, але ўсе і так усё разумелі: хлопец быў худы, нямыты-нястрыжаны, у папрэлым, вышывым адзенні...

Праз два дні ён вярнуўся ў атрад разам з меншым братам Сямёнам, які ў свае 16 быў вельмі дужы і смелы.

Аднойчы, расказвалі, ён даведаўся, што немцы ў Дзягцяняя павязуць пошту, што будуць праязджаць па дарозе паміж вёскамі Савічы і Заракаўцы, месцамі — цераз лес ды кусты, дзе ён і затаіўся. А потым пачуў, што заляскалі колы падводы, убачыў, што на вазку — два немцы. Адзін з іх кіраваў канём (аўтамат ляжаў на каленях), другі — драмаў ззаду. Сеня выскачыў з кустоў, схапіў аўтамат і кінуўся ў лес. Другі немец пачаў страляць, але ніводная куля хлопца не дагнала, бо ён... не ўцякаў: крыху адбегся і сеў на зямлю за тоўстае дрэва.

Немцы следам за ім ісці пабаяліся — паехалі далей. А Сямёна з радасцю сустрэлі ў атрадзе: два браты Місевічы сталі ваяваць поплеч.

...Пазней іх маці, а мая прабабка Вольга Пятроўна, успамінала, што старэйшы з сыноў часам з недаверам казаў: «Няўжо вы, мама, будзеце такая шчаслівая, што ў гэткай страшнай вайне нікога з сям'і не страціце? Калі што — будзьце мужнай... Усялякае можа стацца...»

Ён, на жаль, не памыліўся. У адной з сутычак з немцамі паблізу ад Сямёна ўзарвалася асколачная граната. Ён упаў, асколкі трапілі ў спіну, трохі ніжэй лапаткі. Хірурга ў атрадзе не было, раны на маладым целе хутка зацягнуліся... А вось у сталым узросце Сямёну Іванавічу яны шмат крыві папсавалі.

...Зіма 1943-га была суровая, у вёсцы заставаліся лічаныя каровы і коні.

З надыходам вясны тыя, у каго былі хоць нейкія сілы і магчымасці, садзілі бульбу.

Партызаны летам 1944-га ліквідавалі некалькі гарнізонаў (у Цімкавічах быў адноўлены), групы амаль штодзённа выходзілі на заданні, працавала разведка...

Не дажылі да вызвалення камісар атрада І. К. Жыжык (загінуў у няроўным баі) і Іван Місевіч. Перад выхадам на чарговае заданне ён узяў са скрынкі гранату, у якой, за нешта зачапіўшыся, саскочыла кальцо.

Кінуць яе не было куды — навокал людзі... Тады ён прытуліў гранату да сябе і пабег за бліжэйшыя дрэвы.

Прагучаў выбух, сябры кінуліся да Івана. Ён яшчэ паспеў папрасіць, каб яго перавязалі...

Пахавалі хлопца (Івану тады ішоў 20-ы) там жа, на базе ў Вялешынскім лесе, 2 мая 1944 года. Да вызвалення Беларусі не заставалася, можна сказаць, нічога.

Праз тры месяцы бацька зрабіў дамавіну і перавёз астанкі сына на брацкія могілкі ў вёску Савічы — пахаваў як належыць, па хрысціянскіх законах. Таму прозвішча Івана Місевіча на чорным абеліску зусім не выпадковае. Сямён жа працягваў змагацца ў атрадзе імя Шчорса.

...Прыйшло вызваленне, адбылася Перамога, адрадзілася і жыве знявечаная немцамі Капыльшчына! Вось толькі страты вярнуць немагчыма.

Вольга РАДКЕВІЧ, загадчыца філіяла Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі.

З нізкім паклонам

Ён не памёр! Ён недзе тут...

Вялікі Беларус, Грамадзянін, Васіль Вялікі...

Гэтыя словы ў адносінах да Васіля Быкава нават пры жыцці яго не здаваліся гучнымі, а смерць толькі падкрэсліла маштаб асобы. 22 чэрвеня 2003 года пісьменніка не стала, і гэта было расстанне з цэлай эпохай, бо яго творы вучылі нас праўдзівасці і спагадзе, бо яго досвед — жыццёвы і творчы — быў духоўным арыенцірам.

Варта адзначыць, што шлях у зорную вечнасць пачаўся для Быкава ў нашым найпрыгажэйшым, найбеларускім Гродне. Прыехаў ён сюды ў 1947-м пасля дэмабілізацыі, працаваў у рэдакцыі «Гродзенскай праўды». Менавіта тут адбыўся яго літаратурны дэбют: выйшлі першыя апавяданні «У той дзень» і «У першым баі». Тут ён ажаніўся, стаў бацькам. Мала хто, мусіць, ведае, што ў Гродне сям'я пісьменніка змяніла тры кватэры, мела тры адрасы: вуліца Вялікая Траецкая, вуліца Свярдлова і вуліца Парыжскай Камуны, дзе ствараліся вядомыя на ўвесь свет аповесці «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Трэцяя ракета», «Мёртвым не баліць»... А таму ўсе гродзенцы лічаць Васіля Быкава сваім, кажуць, што гэта наш горад з яго ўнікальнай гісторыяй, архітэктурай, культурай і непаўторным шармам стварыў Майстра такога маштабу.

Я лічу, самая істотная заслуга Быкава ў тым, што ў сваіх творах ён здолеў праўдзіва напісаць пра асобна ўзятага чалавека, пра ягоны боль, сумненні і перажыванні, пра вострую неабходнасць выбару, які гэтаму чалавеку трэба зрабіць — самому. А таму ўздзеянне яго твораў на свядомасць чытача можна параўнаць з электрашокавай тэрапіяй — чымсьці вельмі балючым, але карысным і патрэбным.

...Вельмі прыемна, што ў нашым горадзе і сёння жывуць тыя, хто блізка ведаў вялікага пісьменніка, хто сябраваў з ім, тыя, хто дыхаў з ім адным паветрам, еў адзін хлеб, чытаў, чытае і будзе чытаць «нашага Васіля». І таму ён не памёр! Ён недзе тут — у паветры, у душах.

Валянціна ЯТКОЎСКАЯ, *настаўніца СШ № 22, г. Гродна.*

След на зямлі

СПЫНІЦЦА, КАБ АЗІРНУЦЦА...

Надзеі Піліпаўне Шабацьцы з вёскі Выганашчы 95!
Баявая ды працавітая ў маладосці, да падарункаў і кветак жанчына так і не прывыкла. Але ж відаць было — рада, што не забыліся пра яе свята ні родныя, ні ўлада, ні працоўны калектыў, адкуль пайшла на пенсію. А тут яшчэ і госці з гарманістам прыехалі, заспявалі «Як была я маладой» — і на вуліцу павысыпалі ўсе.

Віншавалі юбілярку яе родныя: сын Мікалай і дачка Валянціна, ад якіх сям'я прырасла сямю ўнукамі і шаснаццаццю праўнукамі, старшыня і кіраўнік справ Целяханскага сельвыканкама Трафім Дзямянчык і Алена Кайль, намеснік старшыні па ідэалагічнай рабоце ААТ «Целяханы-агра» Таццяна Іванова, старшыня Савета ветэранаў сельвыканкама Святлана Крэк.

Фота Алены КАЙЛЬ.

Юбілярка з гарманістам Паўлам МЯЛІКАМ.

Працоўная дзейнасць юбіляркі звязана з калгасам «Радзіма», які быў далучаны да «Расіі» (цяпер ААТ «Целяханы-агра»). Працавала Надзея Піліпаўна кладаўшчыцай, для дзяцей была і татам, і мамай: сама гадавала, сама будавала дом, які і сёння выглядае досыць дыхтоўна.

Жыве юбілярка разам з сям'ёй сына. І ён, Мікалай, і нявестка Наталля, іх дзеці-ўнукі ставяцца да матулі-бабулі з любоўю і клопатам, што, відаць, і стала падмуркам даўгалецця... Як і аптымізм, як прага да жыцця.

Валянціна БОБРЫК.

Чулі?

6 МІЛЬЯРДАЎ ПРУСАКОЎ

вырошчваюць у Кітаі кожны год

Вы хутчэй за ўсё пра гэта не ведалі, але ў Кітаі вырошчваюць прусакоў у прамысловых маштабах. Кожная ферма гэтых насякомых мае памеры аж у два футбольныя палі. Але каму і навошта патрэбныя гэтыя, з пункту гледжання еўрапейцаў, паскуднікі, асабліва ў такой колькасці?

Фота billionnews.ru.

Многія лічаць прусакоў агіднымі насякомымі, але для кітайскай фармацэўтычнай індустрыі яны аказаліся добрым бізнесам, бо ў краіне шырока распаўсюджана перакананне, што яны карысныя для здароўя. Смажаных прусакоў у Кітаі і іншых краінах Азіі ўжываюць у ежу стагоддзямі, але цяпер гэтых насякомых разводзяць на спецыяльных гіганцкіх фермах. У горадзе Січан на паўднёвым захадзе краіны адна з фармацэўтычных кампаній вырошчвае шэсць мільярдаў прусакоў штогод.

Прусакоў разводзяць у будынку, плошча якога складае два футбольныя палі, піша South China Morning Post. Унутры — рады паліц, на якіх ляжаць кюветы з ежай і вадой. У будынку цёпла, вільготна і цёмна. Унутры прусакі карыстаюцца поўнай свабодай і могуць бегаць, размнажацца. Але сам будынак амаль герметычны, а доступ у яго для людзей строга абмежаваны. Прусакі гэтай фермы ніколі не ўбачаць дзённага святла. Тут устаноўлена сістэма штучнага інтэлекту, якая бесперапынна замярае паказчыкі па больш чым 80 параметрах — ад тэмпературы і вільготнасці да наяўнасці генетычных мутацый у саміх прусакоў і таго, як гэтыя мутацыі адбіваюцца на росце і развіцці канкрэтных асобін. Мэта гэтых вымярэнняў — дамагчыся таго, каб прусакі размнажаліся як мага хутчэй.

Калі прусакі дасягаюць «сталага ўзросту», іх адлоўліваюць, перамолваюць, перапрацоўваюць і ствараюць настойку, якую ўжываюць у традыцыйнай кітайскай медыцыне. Настойка папахвае рыбай, яна салодкая і называецца «канфусінь». Яна нібыта дапамагае пры лячэнні гастраэнтэрыту, язвы страўніка і лёгачных захворванняў. «Насельніцтва Кітая старэе, — кажа прафесар Лю. — Мы спрабуем распрацаваць новыя лекі для пажылых, якія былі б таннейшыя за заходнія».

Хоць урад Кітая падтрымлівае саму ідэю стварэння прусаковых фермаў і тое, што ў бальніцах часта выкарыстоўваюцца настойкі з прусакоў, не ўсе лічаць гэта правільным. «Гэта не цудадзейныя лекі, яны не могуць магічна вылечваць людзей», — сцвярджае даследчык Кітайскай медыцынскай акадэміі ў Пекіне, які пажадаў застацца ананімным. Іншыя спецыялісты папярэджваюць, што канцэнтрацыя такой вялікай колькасці насякомых у адным месцы папросту небяспечная. «Будзе катастрофай, калі мільярды прусакоў раптам апынуцца на волі, — гэта будзе па памылцы каго-небудзь з супрацоўнікаў ці ў выніку землятрусу», — папярэджвае прафесар Чжу Чаадун з Акадэміі навук Кітая.

Космас

ПАДАРОЖЖЫ ПРЫВЯДУЦЬ ДА ПРАБЛЕМ З СУСТАВАМІ

Доўгае знаходжанне ва ўмовах бязважкасці цягне за сабой праблемы са здароўем — гэта факт.

Фота modscheats.ru.

Напрыклад, людзям ужо вядома, што пры палёце на Марс астранаўты змогуць набыць шырокі спектр медыцынскіх праблем, у ліку якіх ёсць атрафія цягліц, недахоп кальцыю, пагаршэнне работы сардэчна-лёгачнай сістэмы, пашкоджаны зрок і нават паслабленне імунітэту. Даследчыкі з Мічыганскай бальніцы Генры Форда дапоўнілі гэты спіс яшчэ адной праблемай: было даказана, што бязважкасць разбурае суставы, якія не аднаўляюцца нават пасля вяртання на Зямлю.

Даследаванне ўзначальваў кіраўнік аддзела шкілетна-мышачнай генетыкі Джэймі Фіцджэральд. У распараджэнні каманды навукоўцаў апынуліся даныя, сабраныя пры адпраўцы ўнутры расійскага беспілотнага спадарожніка BION-M1 шасці самцоў мышэй на арбіту Зямлі. На момант узлёту гэтым грызунам было ад 19 да 20 тыдняў, а на Зямлі знаходзіліся такія ж мышы, але яны трымаліся ва ўмовах нармальнай гравітацыі.

Аналіз тканак і храсткоў паказаў, што адсутнасць гравітацыі ўжо праз 30 дзён выклікала ў мышэй прыкметы астэаартрыту. Даследчыкі растлумачылі, што нават калі мышы трэніруюцца і здзяйсняюць актыўныя рухі, іх арганізму не хапае той нагрузкі, якая ёсць у зямных умовах. Паводле слоў Фіцджэральда, ва ўмовах гравітацыі неабходную для падтрымання здароўя суставаў нагрузку можна атрымаць нават пры звычайнай хадзе.

Самае страшнае, што пасля вяртання на Зямлю храсткі будуць аднаўляцца з вельмі вялікімі цяжкасцямі — хутчэй за ўсё, астранаўтам і касмічным турыстам давядзецца адчуваць праблемы са здароўем вельмі доўгі час.

Будучыня

Катлета з прабіркі

У амерыканскіх фаст-фудах Burger King зараз можна знайсці версію флагманскага вопера «без мяса»: з катлетай на раслінной аснове, якая на выгляд і на смак ідэнтычная сапраўднай ялавічыне.

З красавіка Impossible Whopper можна было знайсці ў 59 месцах, аднак The New York Times адзначае, што сетка плануе пачаць продажы гэтага гамбургера ва ўсіх сваіх закусачных — а гэта 7200 месцаў у ЗША. Калі яго прымуць, вядома. Хто ведае, можа, аднойчы гэты прадукт з «мясам з прабіркі» з'явіцца і ў нашых установах.

Нягледзячы на той факт што «немагчымы вопер» змяшчае на 15 % менш тлушчу і на 90 % менш халестэрыну, чым звычайны, у аддзеле маркетынгу Burger King заявілі, што ні кліенты, ні супрацоўнікі не заўважаць розніцы. Гамбургер без мяса будзе каштаваць прыкладна на долар даражэй версіі з ялавічынай. Аднак ён усё яшчэ будзе суправаджацца соусам на аснове маянэзу, таму вегетарыянцам наўрад ці падыдзе.

Катлета без мяса, якая выкарыстоўваецца ў гэтым бургеры вырабляецца Impossible Foods. Для яго падрыхтоўкі выкарыстоўваецца звычайны рэцэпт, які ўжываецца для стварэння іншых гамбургераў: раслінная аснова задзейнічае інгрэдыенты, атрыманыя з каранёў сої, толькі катлеце надаецца форма, характэрная для катлет.

Кампанія Impossible Foods стварыла сваю катлету «з прабіркі» ў спробе паменшыць залежнасць свету ад жывёлагадоўлі і знізіць колькасць ахвяр у пагалоўі буйной рагатай жывёлы. Таксама «немагчымы вопер» дапамагае пазбегнуць праблем са здароўем і этыкай, звязаных з ужываннем мяса, скарачаючы таксама выкіды парніковых газаў.

Тэхналогіі

«Самалёт-гітара» можа перавярнуць авіябудаванне

Авіяцыя — гэта адна з галін машынабудавання, якія найбольш дынамічна развіваюцца. Згаданая галіна стабільна трымае высокія тэмпы эвалюцыі, пачынаючы з другой паловы XX стагоддзя.

Не так даўно замежныя канструктары прадставілі яшчэ адзін вельмі цікавы праект. Многія эксперты і профільныя журналісты кажуць пра тое, што калі новая машына Flying-V пераўзыве стадыю прататыпа, то яна зможа літаральна перавярнуць усю авіяцыю.

Галандская авіякампанія KLM паказала прататып найноўшага самалёта, які прыцягвае да сябе ўвагу ў першую чаргу дзякуючы свайму незвычайнаму дызайну. Справа ў тым, што фюзеляж машыны мае V-падобную форму. У самалёта два пасажырскія салоны, якія размешчаны ў яго крылах. У іх жа знаходзяцца паліўныя бакі, а таксама грузавыя аддзяленні для багажу. Цікава, што самалёт атрымаў сваю назву дзякуючы папулярнай электрагітары Gibson Flying-V, якая актыўна выкарыстоўвалася знакамітымі гітарыстамі Кітам Рычардсам і Джымі Хендрыксам.

Вядома, што V-падобны самалёт быў распрацаваны на базе лабараторыі TU Delft, а ідэя яго стварэння прыйшла ў галаву Юстусу Бенаду, які на момант праектавання быў студэнтам Берлінскага тэхнічнага ўніверсітэта. Эксперты мяркуюць, што інавацыйная машына можа перавярнуць усю сучасную авіяцыю з ног на галаву. Усё таму, што ў навінкі ёсць некалькі важных вартасцяў у параўнанні з любым іншым пасажырскім самалётам, які выкарыстоўваецца сёння.

Дакладна вядома, што Flying-V зможа ўзяць на борт 314 пасажыраў або 524 квадратныя метры грузу ў грузавой мадыфікацыі. Канструкцыя машыны будзе рассоўвацца літарай «V» падчас узлёту. Такое незвычайнае канструктарскае рашэнне дазволіла значна палепшыць аэрадынаміку самалёта, а значыць, і яго паліўную эфектыўнасць. Паводле падлікаў спецыялістаў, самалёт будзе спажываць на 20—25 % менш паліва, чым, напрыклад, сучасны Airbus A350-900.

На сённяшні дзень інавацыйным праектам кіруе інжынер кампаніі Рулаф Вос. Падчас сустрэчы з журналістамі ён падкрэсліў, што падобныя ініцыятывы ў авіяцыі маюць велізарную важнасць, бо яны накіраваныя (у тым ліку) на скарачэнне ўзроўню выкідаў вуглякіслага газу. Нягледзячы на нязвыклую форму, самалёт зможа выкарыстоўваць існуючую на сённяшні дзень інфраструктуру міжнародных аэрапортаў розных краін і зможа ўвайсці ў любы ангар. Увод машыны ў эксплуатацыю плануецца на 2040 год.

Цяпер на долю сусветнай авіяцыі прыпадае каля 2,5 % усіх шкодных выкідаў на Зямлі.

Фота fastcompany.com.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

У цяпліцах не варта адначасова вырошчваць партэнакарпічныя і непартэнакарпічныя (гэта значыць тыя, якія патрабуюць апылення) сарты агуркоў. У адваротным выпадку першыя страцяць свае форму і смак, будуць нашмат горш расці і пладаносіць.

Змагаемся з пустацветам агуркоў

На закладку большай колькасці песцікаў (гэта значыць «дзяўчынак») уплываюць такія фактары, як кароткі дзень, нізкія начныя тэмпературы, высокая сонечная актыўнасць, павышаны ўзровень азоту ў глебе, празмернасць чаднага або вуглякіслага газу. Калі мокра, суха або цесна, то пачынаецца магутны рост сцёблаў і ўтварэнне мужчынскіх кветак, якія ў народзе і называюць пустацвет. Некаторыя агароднікі абрываюць іх. Гэтага ні ў якім разе рабіць нельга, бо «мужчыны» патрэбны для апылення: без іх завязванне пладоў проста немагчыма.

Доўгі светлавы дзень, высокая дзённая і начная тэмпературы, паніжаная вільготнасць паветра і глебы, лішак калію ссоўваюць пол кветкі ў мужчынскі бок — развіваюцца толькі тычынкі.

Першымі ў ніжніх вузлах галоўнага сцябла ўтвараюцца толькі мужчынскія кветкі, затым ідзе чаргаванне мужчынскіх, жаночых і змешаных кветак. Колькасць жаночых паступова павялічваецца да вяршыні галоўнага сцябла і на бакавых парастках. Суадносіны мужчынскіх і жаночых кветак таксама залежаць ад асаблівасцяў сорту, якасці насення і ўмоў вырошчвання.

ДАРОГУ «СТАРЫМ»

Для пасеву лепш браць старое (2—4-гадовага тэрміну захоўвання) насенне. Расліны з іх атрымліваюцца больш ураджайныя, бо раней фарміруюць большую колькасць жаночых кветак і, такім чынам, будучых пладоў. А вось леташняе насенне дадуць толькі расліны, абсыпаныя пустацветам.

Каб максімальна знізіць колькасць пустых завязяў, насенне трэба прагрэць. Навошта? Аказваецца, у агурочных зярнятках змяшчаецца шмат бялку. Калі пасеяць свежае насенне, то яго лішак дазволіць парасткам жыраваць і хутка расці, але ніяк не пладаносіць. Лістоў будзе шмат, а завязяў — мала. Пры працягламу жа прараванні бялкі, якія змяшчаюцца ў насенні, «старэюць», і расліны зацвітаюць раней, даюць больш жаночых кветак. Значыць, і ўраджай будзе лепшы.

ПРЫШЧЫПНІЦЕ ЯГО

Немалаважная ўмова і асветленасць градкі. Дрэннае ветранне — дрэннае апыленне. Загушчанасць пасадак вядзе толькі да павелічэння колькасці пустацветаў.

Пры з'яўленні мноства мужчынскіх кветак прышчыпніце верхавіну галоўнага сцябла. Гэта паскорыць развіццё бакавых плецяў, на якіх і ўтвараецца больш за ўсё жаночых кветак. У хуткаспелых сартоў прышчыпваюць галоўнае сцябло пасля дзясятага, а ў познаспелых — пасля восьмага ліста.

Напэўна, гэтую працэдуру расліна ўспрымае як своеасаблівую катастрофу, якая пагражае «роду».

ПАЛІЎ

Адна з асноўных прычын затрымкі з'яўлення жаночых кветак — паліў халоднай вадой. Таму паліваць трэба заўсёды толькі цёплай (не ніжэй за плюс 23—25 градусаў).

Калі пустацветаў вельмі шмат, паліў на час спыніце, прымусьце агуркі пахвалявацца. І вы ўбачыце: завязяў стане больш.

І так падвядзём вынік.

Прычынамі вялікай колькасці пустацветаў могуць стаць:

— пасеў свежага насення (першага года захоўвання);

— непрагрэтае перад пасевам насенне;

— высокая тэмпература паветра;

— пасеў у зацененых месцах;

— моцная загушчанасць;

— парушэнне балансу харчавання (унясенне вялікіх доз азотных угнаенняў);

— моцнае пераўвільгатненне глебы.

❍ Агурок патрабавальны да вільгаці, асабліва ў час цвіцення і плоданашэння. Аднак у пачатку цвіцення палівы лепш скараціць, а затым зноў узмацніць. Гэта спрыяе больш хуткаму ўтварэнню пладоў.

❍ Пры гарачым надвор'і разам з багатымі палівамі агуркоў спалучаюць іх частыя апырскванні.

❍ Пылок агурка гіне пры тэмпературы, большай за 30 °С. Таму ў гэты час у цяпліцы трэба расставіць ёмістасці з вадой.

❍ Нізкія тэмпературы і рэзкія перапады дзённых і начных тэмператур з'яўляюцца прычынамі пагаршэння смакавых якасцяў агурка. Таксама агуркі зусім не церпяць скразнякоў.

Даты | Падзеі | Людзі

26 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1849 год — нарадзіўся Уладзімір Аляксеевіч Плюшчэўскі-Плюшчык, беларускі энтамолаг. Вучыўся ў Пецярбургскім земляробчым інстытуце. У 1890—1918 гадах служыў падатковым інспектарам у Віцебску, у 1919—1925 гадах — выкладаў і загадваў прыродна-гістарычным музеем у Віцебскім сельскагаспадарчым тэхнікуме і ветэрынарным інстытуце. Сабраў вялікую калекцыю жукоў і матылёў (52 580 экзэмпляраў прадстаўнікоў 14 667 відаў), якую перадаў Віцебскаму ветэрынарнаму інстытуту, дзе заснаваў першы ў Беларусі энтамалагічны музей. Памёр у 1926 годзе.

1934 год — нарадзіўся Юрый Міхайлавіч Градаў, заслужаны архітэктар Беларусі. У 1960—1993 гадах працаваў у інстытуце «Мінскпраект». Сярод яго работ — рэканструкцыя цэнтра Мінска, праекты рэканструкцыі і добраўпарадкавання Траецкага прадмесця, павільён Рэспубліканскага выставачнага цэнтра, будынак Міністэрства ўнутраных спраў. Аўтар работ у галіне манументальнага мастацтва: архітэктурна-скульптурныя мемарыяльныя комплексы «Хатынь», «Прарыў», «Кацюша».

1939 год — нарадзіўся Валерый Паўлавіч Рыбараў, кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. З 1959 года на кінастудыі «Беларусьфільм». Зняў фільмы: мастацкія «Чужая бацькаўшчына», «Сведка», «Мяне завуць Арлекіна», дакументальныя «Тонежскія бабы», «Нямая скрыпка», кароткаметражны «Жывы зрэз». Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1990).

1984 год — нарадзілася Таццяна Васілеўна Ананька, беларуская спартсменка (мастацкая гімнастыка, групавыя практыкаванні), заслужаны майстар спорту Беларусі. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў (2000). Неаднаразовы прызёр і пераможца міжнародных і еўрапейскіх спаборніцтваў.

У свеце

1824 год — нарадзіўся Уільям Томсан (барон Кельвін), англійскі фізік, адзін з заснавальнікаў тэрмадынамікі. Выдатны навуковец з 1851 года быў членам Лонданскага каралеўскага таварыства, а ў 1890—1895 гадах — яго прэзідэнтам. У 1848 годзе ён увёў паняцце абсалютнай тэмпературы і абсалютную шкалу тэмпературы, названую ў яго гонар шкалой Кельвіна. Томсан не пагаджаўся з эвалюцыйнай тэорыяй Дарвіна, застаючыся «на баку анёлаў». Памёр у 1907 годзе. Пасля смерці быў пахаваны ў Вестмінстэрскім абацтве.



1879 год — нарадзілася Агрыпіна Якаўлеўна Ваганава, руская артыстка балета, педагог, народная артыстка РСФСР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памерла ў 1951 годзе.

1884 год — выйшаў указ расійскага імператара Аляксандра III аб заснаванні царкоўна-прыходскіх школ.

1944 год — нарадзіўся Генадзь Андрэевіч Зюганаў, расійскі палітычны дзеяч. Вырас у сям'і патомных настаўнікаў, сам многія гады выкладаў матэматыку і філасофію. Кар'ера як палітычнага дзеяча пачалася пасля арганізацыі Камуністычнай партыі РСФСР у 1990 годзе, адным з ініцыятараў стварэння якой ён быў. У 1995 годзе стаў доктарам філасофскіх навук. Тройчы балатаваўся на пасаду Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, кожны раз займаючы другое месца.

1959 год — у Мантро (Швейцарыя) заснавана Еўрапейская канферэнцыя ўпраўленняў поштаў і электрасувязі.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 25 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.39	21.46	17.07
Віцебск	4.20	21.44	17.24
Магілёў	4.29	21.36	17.07
Гомель	4.35	21.23	16.48
Гродна	4.56	21.59	17.03
Брэст	5.06	21.50	16.44

Імяніны

Пр. *Акуліны, Антаніны, Ганны, Пелагеі, Дзмітрыя, Івана, Савы.*
К. *Дануты, Магдалены, Паўліны, Паўла, Рудольфа, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Дарагі, праўда ж мне здорава дапамагае агурковая маска?

— Вядома, дарагая. Я ўвогуле не разумею, навошта ты яе здымаеш.

Калі камусьці вельмі хочацца развесціся, перадаю параду маёй бабулі:
«Цярпіце і любіце адно аднаго. Дзве пенсіі лепш, чым адна!»

У медыцынскіх колах набірае папулярнасць тэорыя, что праблемы з алкаголем — гэта калі ты не любіш выпіць.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1997.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 чэрвеня 2019 года.